# РОДНАЯ ПРЫРОДА

1972 6



СССР — 50 ГОД



# АМАТАРЫ ПРЫРОДЫ — ДА СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ

Натхнёныя гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, аматары прыроды роднага краю — члены Беларускага таварыства аховы прыроды актыўна ўключыліся ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР.

Паспяхова выконваюць свае сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя СССР рэчыцкія аматары прыроды, пачынальнікі гэтага спаборніцтва. За першае паўгоддзе колькасць членаў Таварыства павялічылася на 4,2 тысячы чалавек. У раёне для насельніцтва прачытана 520 лекцый і дакладаў, праведзена 768 гутарак на тэму аховы прыроды, афармлена 14 стэндаў нагляднай агітацыі. Праведзена аблясенне пяскоў на плошчы 244 гектары. Азелянёна 1500 сядзіб, школ, калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў. Абсаджана дрэвамі 15 кіламетраў вуліц і дарог. Пасаджана больш як 7 тысяч дэкаратыўных і пладовых дрэў, больш за 100 тысяч кустоў і каля 100 тысяч кветак.

Наладжан грамадскі кантроль за будаўніцтвам і эксплуатацыяй ачышчальных збудаванняў, за выкарыстаннем вады на тэхналагічныя патрэбы на нафтаздабываючых і іншых прамысловых прадпрыемствах.

Заслугоўвае адабрэння работа па ахове прыроды калектыву завода «Гомсельмаш».

Дырэкцыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі ўдзяляюць шмат увагі наладжванню прыродаахоўнай работы на прадпрыемстве. Пярвічная арганізацыя БТАП завода «Гомсельмаш» аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах 5500 чалавек.

Савет прыроды (старшыня Рыўкін Лазар Міхайлавіч) распрацаваў план мерапрыемстваў па ахове прыроды на пяцігодку і арганізоўвае іх выкананне.

Планам работы партыйнага камітэта завода прадугледжаны «дні аховы прыроды». У гэтыя дні чытаюцца лекцыі і даклады, праводзяцца гутаркі на прыродаахоўныя тэмы, дэманструюцца кінафільмы аб прыродзе і яе ахове. Так, з лекцыямі выступілі супрацоўнікі БелНДІЛГа і выкладчыкі дзяржуніверсітэта — кандыдаты біялагічных навук А. Крушаў, П. Грыгор'еў, кандыдаты сельскагаспадарчых навук У. Пабедаў, А. Саўчанка і іншыя. На тэрыторыі завода афармлены стэнды нагляднай агітацыі па ахове прыроды.

Вядзецца вялікая работа па азеляненню і добраўпарадкаванню тэрыторыі завода і жылога пасёлка гомсельмашаўцаў. Толькі вясной гэтага года пасаджана 816 дэкаратыўных і 240 пладовых дрэў і звыш 15 тысяч кустоў, каля 68 тысяч кветак.

Пры савеце аховы прыроды створана грамадская інспектура і пасты, якія кантралююць работу ачышчальных збудаванняў, сочаць за чысцінёй паветра, ахоўваюць зялёныя насаджэнні і г. д.

Паспяхова выконваюць свае сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР пярвічныя арганізацыі Аршанскага ордэна Леніна льнокамбіната, тэкстыльнага камбіната і швейнай фабрыкі г. Баранавічы, Брэсцкага аўтарамонтнага завода, Чэрніцкай школы-інтэрната Лёзненскага раёна, калгаса імя Жданава Мазырскага раёна, калгаса «Савецкая Беларусь» Ваўкавыскага раёна, саўгаса «Перамога» Ашмянскага раёна і іншыя.

Значных паказчыкаў у выкананні сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя ўтварэння СССР дасягнулі Баранавіцкае, Бярозаўскае, Кобрынскае, Полацкае, Дубровенскае, Гомельскае, Магілёўскае, Астравецкае, Салігорскае, Стаўбцоўскае раённыя і гарадскія, Цэнтральнае аддзяленне г. Мінска і многія іншыя аддзяленні Таварыства.

Толькі за першае паўгоддзе створана 403 пярвічныя арганізацыі і 47 юнацкіх груп, прынята ў члены Таварыства 104,6 тысячы чалавек, у тым ліку дарослых 68 тысяч чалавек. Усяго ў Беларускім таварыстве аховы прыроды налічваецца 2092 тысячы чалавек.

Для працоўных нашай рэспублікі прачытана звыш 17 тысяч лекцый і дакладаў, праведзена 50 тысяч гутарак, звыш 10 тысяч кінасеансаў аб прыродзе і яе ахове. У гэтым годзе закладзена 117 паркаў, 378 сквераў, пасаджана звыш аднаго мільёна пладовых і дэкаратыўных дрэў, каля 2 мільёнаў кустоў, звыш 4,5 мільёна кветак.

Юныя аматары прыроды для аховы зялёных насаджэнняў і вадаёмаў арганізавалі 5745 «зялёных» і «блакітных» патрулёў. У школах рэспублікі дзейнічаюць 365 школьных лясніцтваў, якія ахоўваюць і дагледжваюць лясы на плошчы звыш 100 тысяч гектараў.

Юнацкімі секцыямі аховы прыроды падрыхтавана звыш 73 тысяч штучных гнёздаў і каля 28 тысяч кармушак. Збіраецца корм для падкормкі птушак і дзікіх звяроў.

Пярвічныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў — актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў па барацьбе з эрозіяй глебы. Толькі ў час вясновых работ замацавана 560 яроў. Пад наглядам грамадскасці здзяйсняюцца своечасовая рэкультывацыя і перадача землекарыстальнікам выпрацаваных кар'ераў і нярудных выкапняў і тарфянікаў.

Згодна з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 28 кастрычніка 1971 года «Пра выкананне *Закона аб* ахове прыроды ў Беларускай ССР» на сесіях абласных, гарадскіх, раённых і сельскіх саветаў у канцы 1971 года і ў першым паўгоддзі 1972 года пры самым актыўным удзеле мясцовых арганізацый таварыства абмяркоўвалася пытанне аб стане і мерах па паляпшэнню прыродаахоўнай работы. Пастановы сесій мясцовых Саветаў, у якіх распрацаваны канкрэтныя меры па паляпшэнню работы па ахове прыроды,— гэта праграма дзейнасці для пярвічных арганізацый, мясцовых аддзяленняў таварыства аховы прыроды.

Аднак далёка не ўсё яшчэ робіцца для аховы прыроды і захавання яе багаццяў. Можна прывесці нямала прыкладаў, калі знішчаюцца зялёныя насаджэнні, забруджваецца вада і паветра, няправільна выкарыстоўваюцца землі.

Не вядзецца належная барацьба з браканьерствам, якое прыводзіць да знішчэння дзікіх звяроў, птушак і рыбных запасаў.

Як правіла, гэта — вынік нізкага ўзроўню работы многіх пярвічных арганізацый, раённых і гарадскіх аддзяленняў Таварыства. Дрэнна пастаўлена прыродаахоўная работа ў Іванаўскім, Лунінецкім, Берастовіцкім, Свіслацкім, Ельскім і ў некаторых іншых раённых аддзяленнях.

Пярвічныя арганізацыі ў гэтых раёнах нешматлікія, недастаткова праводзяць агітацыйную работу сярод насельніцтва, дрэнна арганізавалі выкананне сацыялістычных абавязацельстваў па ахове прыроды, не вядуць належнай барацьбы з парушальнікамі Закона «Аб ахове прыроды ў Беларускай ССР».

Неабходна, падводзячы вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР, не толькі адзначыць поспехі, але і выявіць недахопы, высветліць прычыны гэтых недахопаў і прыняць меры па іх выпраўленню.

Трэба дабіцца, каб масавае членства ператваралася ў якасна новую ступень — масавы ўдзел насельніцтва ва ўсіх мерапрыемствах па ахове прыроды. Таму неабходна ўзмацніць арганізацыйную работу сярод членаў Таварыства, павысіць узровень агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод насельніцтва. Павялічыць колькасць народных універсітэтаў і клубаў аматараў прыроды. Да больш актыўнай прыродаахоўнай работы трэба прыцягваць камсамольцаў і моладзь.

Пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх органаў Беларускае таварыства аховы прыроды даб'ецца *паспяховага ажыццяўлення* задач, пастаўленых XXIV з'ездам КПСС у галіне аховы прыроды.

П. ВІЛІТКЕВІЧ,
намеснік старшыні прэзідыума Рэспубліканскага савета Беларускага таварыства аховы прыроды.

# АХОВА ПРЫРОДЫ. ЯК ЯЕ РАЗУМЕЦЬ?

Праблема аховы прыроды становіцца адной з надзённейшых праблем чалавецтва. У апошнія гады яна набыла першаступеннае значэнне для многіх краін свету. Таму, каб адказаць на пастаўленае пытанне, трэба зыходзіць не толькі з агульначалавечых пазіцый, але і з пазіцый светапогляду, бо глабальнасць праблемы яшчэ не прадвызначае глабальных метадаў яе вырашэння. Гэтыя метады залежаць ад магчымасцей краін, іх сацыяльна-эканамічнага ладу, развіцця навукі, тэхнікі і культуры, а нярэдка і ад нацыянальных традыцый народаў. Таму пры вырашэнні пытанняў аховы прыроды вельмі важна быць на прынцыпова дакладных пазіцыях, разумець сутнасць стратэгіі і тактыкі праблемы.

Вось як тлумачаць сутнасць праблемы буржуазныя ідэолагі. Зямляне, маўляў, у працэсе свайго развіцця і ўдасканалення падпарадкавалі сабе ўсе вядомыя ім якасці прыроды, і ахова яе рэсурсаў — гэта толькі рэакцыя бумеранга на недахоп гэтых якасцей, у якіх людзі маюць патрэбу і з цягам часу будуць мець яшчэ большую. Чаму? Ды таму, што людзей становіцца ўсё больш. Калі ў 1830 годзе чалавецтва аб'ядноўвала толькі 1 мільярд людзей, у 1950 — 2,5 мільярда, дык ужо ў 1960 — 3 мільярды. У наступныя пятнаццаць гадоў, згодна з дадзенымі ААН, чалавецтва дасягне 4 мільярдаў. Відавочна, што дзейнасць такой колькасці людзей, якія задавальняюць свае патрэбы за кошт прыроды, не можа не адбіцца на прадукцыйнасці планеты. Значыць, усё гэта ўрэшце прывядзе да разбурэння асяроддзя, у якім жыве чалавек, бо тэхнічны прагрэс спыніць нельга.

Лагічна і пераканаўча? Нібыта і так, хоць тут абыдзен маўчаннем тэзіс аб невычэрпнасці рэсурсаў прыроды і зведзен на нішто другі тэзіс — аб велізарных патэнцыяльных магчымасцях да самаўзнаўлення яе арганічнай часткі (жывёл і раслін).

Такое антынавуковае ўяўленне аб вядучай ролі геаграфічнага асяроддзя ў развіцці грамадства непазбежна прыводзіць да сцвярджэння пагрозы перанаселенасці планеты і неабходнасці ў сувязі з гэтым самарэгуляцыі чалавецтва. Метады гэтай самарэгуляцыі могуць быць розныя, пачынаючы ад адмовы барацьбы з эпідэміямі і голадам і канчаючы пошукамі «жыццёвай прасторы» аднымі краінамі за кошт іншых. Няма патрэбы падкрэсліваць абсурднасць такога выйсця з супярэчнасцей паміж грамадствам і прыродай.

Чалавек — сын прыроды і разам з тым вяршыня яе. Найвялікшая яго перавага перад жывёлай — наяўнасць свядомасці. Яна дае яму невычэрпныя магчымасці прыстасоўвацца да зменлівых умоў асяроддзя, самому змяняць гэтыя ўмовы ў адпаведнасці са сваімі патрэбамі, спазнаваць супярэчнасці ў свеце і ў самім сабе і бясконца ўдасканальвацца. Гэтыя палажэнні, якія вынікаюць з ленінскай тэорыі адлюстравання, гавораць аб тым, што формы і метады ўзаемаадносін чалавека і прыроды таксама могуць удасканальвацца, таму што гісторыя прыроды і гісторыя чалавецтва ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Геаграфічнае асяроддзе можа ўплываць на працэсы грамадскага развіцця, але яно не з'яўляецца іх вырашальным фактарам. Таму супярэчнасці, якія ўзнікаюць паміж прыродай і чалавекам, могуць адлюстроўваць адносіны людзей да прыроды толькі ўнутры канкрэтнага, дадзенага грамадства і па-рознаму выражацца ў краінах з рознымі сацыяльнымі сістэмамі. Сутнасць, значыць, не ў насельніцтве нашай планеты і яго павелічэнні, а ў прызнанні заўсёднага ўдасканальвання людзей ва ўсіх галінах жыцця, у тым ліку ў грамадскай.

Значыць, ахову прыроды трэба разумець, зыходзячы з канцэпцыі няспыннага і гістарычнага ўдасканальвання чалавека і грамадства ўвогуле. Менавіта на такой канцэпцыі грунтуецца дзейнасць нашых партыйных і дзяржаўных органаў па выкарыстанню і ахове прыродных рэсурсаў як унутры краіны, так і ў міжнародным плане.

Тактычныя аспекты вырашэння праблемы аховы прыроды здаюцца не менш простымі, паколькі яны закранаюць па сутнасці ўсе сферы дзейнасці чалавека. Яшчэ і зараз частка людзей лічыць, што прыроду трэба альбо толькі ахоўваць, альбо толькі выкарыстоўваць, таму што, маўляў, «чыстая» ахова перашкаджае тэхнічнаму прагрэсу. Але тэхнічны прагрэс арганічна не звязаны з разбурэннем прыроды, ён толькі абумоўлены няспынным яе развіццём. Значыць, выкарыстанне прыроды сумяшчальна з яе аховай, і прыродныя рэсурсы трэба выкарыстоўваць, адначасова ахоўваючы іх. Пры гэтым выкарыстанне рэсурсаў, якія не ўзнаўляюцца (вугаль, нафта, газ і інш.), павінна быць максімальна ашчаднае, а рэсурсаў, якія ўзнаўляюцца (раслінны і жывёльны свет), у межах норм, якія вызначаюцца аптымальнасцю выкарыстання пры аптымальным узроўні ўзнаўлення. Дасягнуць гэтага дапамагае ўсё той жа навукова-тэхнічны прагрэс грамадства, які дазваляе ў працэсе выкарыстання рэсурсаў прыроды ўлічваць сацыяльныя, гаспадарчыя, палітычныя, культурныя, духоўныя і этычныя аспекты жыцця людзей.

Аднак мы глыбока памыляліся б, калі б лічылі, што, дасягнуўшы небывалага росквіту навукі і тэхнікі і здзейсніўшы надзвычай шмат па пераўтварэнню прыроды, ужо не залежым ад яе. Перамога наша над прыродай была б даволі адносная. Правамерна будзе сказаць, што будаўніцтва камуністычнага грамадства, матэрыяльную базу якога мы ўсе разам ствараем, будзе залежаць ад таго, наколькі мы навучымся шанаваць дом, у якім жывём. Шанаваць не дэкларацыйна, а практычна, выкарыстоўваючы ўвесь арсенал ведаў аб прыродзе, разнастайныя метады сацыялістычнай формы гаспадарання і багаты вопыт нашага народа.

Напрыклад, вопыт меліярацыі і сельскагаспадарчага выкарыстання палескіх балот у мінулым сведчыць аб велізарнай эфектыўнасці праведзеных мерапрыемстваў. З усёй асушанай плошчы атрымана прыбытку: у 1963 годзе — 31,7 мільёна рублёў, у 1964 годзе — 51,5 мільёна і г. д. Гэты прыбытак быў бы яшчэ большы, калі б былі акультураны сенажаці.

Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС вызначаны велізарныя маштабы далейшай меліярацыі Беларускага Палесся. Да 562 тысяч гектараў ужо асушаных і асвоеных балот за гады пяцігодкі далучыцца яшчэ больш 2 мільёнаў гектараў. Воляю савецкіх людзей Палессе пераўтворыцца ў край багацця і дастатку. Падлічана, што капіталаўкладанні на меліярацыю і асваенне балот цалкам акупяцца праз пяць гадоў. Штогадовы прыбытак складзе: ад сельскай гаспадаркі — 428,8 мільёна рублёў, лясной — 2,2 мільёна і ад рыбнай гаспадаркі—20,6 мільёна рублёў.

Як жа сустрэне спрадвечная прыродная сістэма такое небывалае ўмяшанне чалавека ў яе рытміку? Канечне, ажыццяўленне гэтых грандыёзных мерапрыемстваў выкліча істотныя змены ў абліччы і характары прыроды Палесся. Таму асабліва хочацца падкрэсліць, што эфектыўнасць эксперымента і вотум даверу да яго з боку грамадскасці будуць яшчэ большыя, калі ў агульнанацыянальнай стратэгіі яго правядзення будзе ўлічана таксама тактыка збалансаванага кіраўніцтва ўсімі, вялікімі і малымі, рэсурсамі Палесся, калі будзе ўлічана культура ўздзеяння на прыроду, традыцыі народа і яго духоўная культура. Пры гэтым павінны быць выкананы тры важнейшыя тэзісы прыродакарыстання: наяўнасць навуковых абгрунтаванняў кожнага мерапрыемства, комплекснасць вырашэння праблемы ў інтарэсах усяго народа і персанальная адказнасць на кожным участку работ за тыя ці іншыя дзеянні. Усё гэта неабходна ўлічваць, бо пры карэннай перабудове сталых, спрадвечных біяцэнозаў, нягледзячы нават на іх велізарную ўзнаўленчую сілу, заўсёды будуць супярэчнасці, будуць страты — вялікія і малыя, на якія чуйна рэагуюць людзі. Гэтыя супярэчнасці, як лёгка заўважыць, выяўляюцца ў тых парадоксах жыцця, якія непажаданы. Таму што людзі, радуючыся асфальту, засмучаюцца ад таго, што знік лес; захапляюцца багатым ураджаем на тарфяніках і моршчацца, калі дзе ўгледзяць пясчаныя «лысіны»; любяць пасядзець на беразе вадасховішча і крыўдзяцца, што паменела рыбы. Значыць, людзям да ўсяго ёсць справа, значыць, да ўсяго павінны дайсці рукі. І працаваць нам трэба для таго, каб не было ў жыцці такіх парадоксаў, каб паставіць прыродаахоўную справу на небывалую вышыню, каб смачна есці, прыгожа апранацца, слухаць спеў птушак і дыхаць свежым паветрам,— карацей кажучы, каб жыць натхнёна, мэтанакіравана, як і належыць савецкім людзям.

М. ДОЛБІК,
доктар біялагічных навук,
старшы навуковы супрацоўнік
аддзела заалогіі АН БССР.







# УСЯ КВЕЦЕНЬ СВЕТУ

Мінчане і госці беларускай сталіцы, якім дагэтуль не давялося зазірнуць за арачную каланаду ля парку імя Чалюскінцаў, наўрад ці падазраюць, што сцяжынка ў ценістай ліпавай алеі вядзе проста ў субтропікі. Тут можна ўбачыць, як растуць бананы і грэйпфруты, цвітуць мексіканскія кактусы і згінаюцца пад цяжарам пладоў вечназялёныя пальмы

Уся гэтая экзотыка знаходзіцца ў некалькіх кроках ад Ленінскага праспекта — у Цэнтральным батанічным садзе Акадэміі навук БССР. Тут, на гэтым кавалачку беларускай зямлі, сабрана амаль уся зеляніна свету, прадстаўленая больш як васьмю тысячамі разнавіднасцей зямной флоры.

Для таго, каб зрабіць падарожжа ў гэтае зялёнае царства, створанае працавітымі чалавечымі рукамі, дастаткова зрабіць толькі некалькі дзесяткаў крокаў у бок ад асфальтаванай стужкі праспекта. Праўда, перш чым ступіць на галоўную алею самага вялікага зялёнага музея рэспублікі, давайце зазірнем у яго гісторыю. Гэта неабходна для таго, каб лепш зразумець і ацаніць усё ўбачанае.

1932 год. На гарадской ускраіне, дзе шумеў густы сасновы бор і куды мінчане хадзілі збіраць ягады і грыбы, пачаліся работы па закладцы Батанічнага саду. Значная частка яго размясцілася на тэрыторыі былой Беларускай сельскагаспадарчай выстаўкі. Актыўны ўдзел у стварэнні і далейшай рэканструкцыі саду прымалі спецыялісты Батанічнага інстытута Акадэміі навук СССР Л. І. Рубцоў, С. Г. Саакаў, А. І. Ізосімаў, Н. В. Шыпчынскі і іншыя. Яго заснавальнікам і першым дырэктарам быў вядомы савецкі батанік С. П. Мельнік.

У 1941 годзе ў геаграфічных сектарах ужо расло каля 50 тысяч дрэў і кустоў, якія належалі да 1318 відаў і форм (для параўнання трэба прыгадаць, што ў натуральных умовах на тэрыторыі Беларусі расце толькі 60 відаў і форм драўніннай расліннасці). Вайна знішчыла ўсё: аранжарэю і найбагацейшы гербарый, навукова-даследчыя лабараторыі, праектныя матэрыялы па будаўніцтву саду, навуковую дакументацыю. Але ўжо ў 1945 годзе пачынаюцца работы па аднаўленню Батанічнага саду. Каб убачыць, якім ён стаў, давайце пройдзем па алеях гэтага зялёнага царства.

З першых жа крокаў вы, вядома, звернеце ўвагу на незнаёмыя расліны, радзіма якіх знаходзіцца далёка, за тысячы кіламетраў ад Беларусі. Маньчжурскі арэх, амерыканская туя, пенсільванскі ясень, амурскі вінаград — няхай вас не здзіўляюць такія надпісы на шыльдачках. Усе гэтыя госці з далёкіх краін цудоўна акліматызаваліся на беларускай зямлі і ў Мінску адчуваюць сябе, як дома.

Сярод шматлікіх зялёных гасцей, якія набылі ў Беларусі сваю другую радзіму, мы сустрэнем вельмі рэдкае дрэва — гінкга. Гэтая расліна акружана легендамі і нездарма: гінкга — адзін з нямногіх прадстаўнікоў драўніннай расліннасці далёкіх геалагічных эпох, распаўсюджанай яшчэ ў мезазойскую эру. Узрост асобных экземпляраў гінкга дасягае 2000 гадоў. Такія дрэвы зараз часцей за ўсё можна сустрэць каля будыйскіх храмаў у Кітаі і Японіі, дзе яны лічацца свяшчэннымі. У Беларусі некалькі экземпляраў гінкга ёсць яшчэ ў гомельскім парку імя А. В. Луначарскага.

Азеляненне і кветаводства — другі напрамак у навуковай рабоце калектыву Батанічнага саду. Лепшыя гатункі раслін, якія прыжыліся на доследных участках саду, рэкамендуюцца вучонымі для рассялення па ўсёй рэспубліцы. У ліку такіх «перасяленцаў» і дэкаратыўныя, і кармавыя, і лекавыя культуры. Батанічны сад штогод адпускае лясгасам насенне, сеянцы і саджанцы розных парод дрэў і кустоў, якіх няма ў лясах рэспублікі.

Многія гатункі раслін беларускай селекцыі заслужылі высокую ацэнку на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. Але, бадай, найбольшую колькасць медалёў ВДНГ заваявалі кветкі, вырашчаныя ў Батанічным садзе. Непаўторны букет бэзу, які складаецца з 16 новых гатункаў беларускай селекцыі, прынёс заслужаны поспех таленавітай даследчыцы В. Ф. Бібікавай. Гэта яна пад навуковым кіраўніцтвам дырэктара Батанічнага саду, члена-карэспандэнта АН БССР М. В. Смольскага вывела новыя гатункі кветак.

У лабараторыях і на доследных участках выведзена таксама нямала новых гатункаў гладыёлусаў, вяргінь і іншых экзатычных прадстаўнікоў дэкаратыўнай флоры. А гладыёлусы, якія атрымалі назвы «Мінск», «Нарач», «Нёман», «Свіцязь», «Зубронак», паспяхова прайшлі апрабацыю на ВДНГ і рэкамендаваны для вырошчвання ў сярэдняй кліматычнай паласе краіны.

Вымашчаная каменнымі пліткамі дарожка вядзе нас ад цэнтральнай алеі да дэкаратыўнага басейна, вакол якога раскінуліся кветкавыя плантацыі. У гэтым кутку саду звычайна больш за ўсё наведвальнікаў. Палітра самага патрабавальнага мастака не ведае такіх адценняў, якімі адарыла прырода свае самыя пяшчотныя стварэнні. Асабліва багаты ружоўнік Батанічнага саду: яго калекцыя налічвае больш як 700 гатункаў. У выніку іх шматгадовага вывучэння выдзелена каля двухсот гатункаў руж, найбольш перспектыўных для вырошчвання ў кліматычных умовах Беларусі.

Дзве алеі — блакітнага клёна і бярозавая — прывядуць нас да прыземістага збудавання, якое складаецца з некалькіх карпусоў. Шкляны дах падкажа прызначэнне гэтага будынка. Тут размешчана аранжарэя. Пад цёплымі праменнямі штучных «сонцаў» спеюць лімоны, грэйпфруты, бананы, квітнеюць алеандры і экзатычныя мексіканскія кактусы. Пялёсткі некаторых з іх — напрыклад, «царыцы ночы» — можна ўбачыць раз у дзесяцігоддзі. І калі вялізная белая кветка распускаецца проста ў вас на вачах, каб пражыць толькі адну ноч і звянуць з надыходам раніцы,— такую карціну нельга назіраць без хвалявання...

«Мінск, Цэнтральны батанічны сад Акадэміі навук БССР». Гэты надпіс на пасылках і бандэролях паўтараецца на многіх мовах. Супрацоўнікі саду падтрымліваюць сувязі больш чым з двумастамі батанічнымі ўстановамі свету. Насенне рэдкіх японскіх кветах — куфеі, антыдэсмы, ілекса — прыбылі ў Мінск з «краіны ўзыходзячага сонца». Прыходзяць сюды бандэролі з Аўстраліі, Аргенціны, Галандыі, Італіі, Канады, Францыі... А з Мінска ідуць у гэтыя і многія іншыя краіны пасылкі з насеннем беларускіх раслін.

...Ценістая яловая алея выводзіць нас да берагоў «Лебядзінага возера». Па люстранай воднай роўнядзі бясшумна слізгаюць гордыя птушкі, пра якіх складзена столькі паэтычных легенд. У строгай адпаведнасці з фабулай вядомага балета тут ёсць і белыя, і чорныя лебедзі.

І ў нядзельныя, і ў будзённыя дні ўлетку на берагах возера паўнютка народу. Людзі палюбілі гэты некалі закінуты куток батанічнага саду, які параўнаўча нядаўна змяніў сваё аблічча. Дзеці кормяць лебедзяў, а ганарлівыя птушкі не заўсёды паспяваюць схапіць прынадны кавалачак: іх апярэджваюць рыбы, якія раз-пораз заяўляюць аб сваёй прысутнасці шумнымі ўсплёскамі. Гэты ідылічны малюнак «мірнага суіснавання» чалавека і прыроды выхоўвае людзей лепш, чым дзесяткі заклікаў аб беражлівым стаўленні да прыроды. Менавіта гэтак — не толькі словам, але і справай — ажыццяўляе калектыў Батанічнага саду трэці кірунак у сваёй навуковай рабоце — прапаганду аховы прыроды.

Аб тым, што гэтая работа мае велізарнае навуковае і дзяржаўнае значэнне, сведчыць пастанова прэзідыума Акадэміі навук СССР аб прысваенні Батанічнаму саду АН БССР статуса навукова-даследчага інстытута. Цяпер тут ёсць свая аспірантура. У апошнія гады ў калектыве Батанічнага саду вырасла пляяда маладых навуковых супрацоўнікаў, чые работы ўнеслі каштоўны ўклад у развіццё біялагічнай навукі. Гэта таленавітыя даследчыкі В. С. Вакула, А. А. Чахоўскі, Е. З. Бабарэка, В. М. Кудраўцава, Е. А. Сідаровіч і многія іншыя.

Вы не стаміліся? Тады давайце пройдзем яшчэ па рабінавай, туевай, ясеневай, чаромхавай алеях, наведаем сад няспыннага цвіцення, дзе сабрана столькі экзатычных прадстаўнікоў зялёнага насельніцтва зямлі, пройдзем па доўгіх калідорах новага лабараторнага корпуса, пабудаванага да пяцідзесяцігадовага юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Ну, а цяпер, здаецца, усё. Прыходзьце, сябры, часцей у гэты цудоўны музей прыроды, які існуе ўжо чатыры дзесяцігоддзі, і вы адчуеце, наколькі багацейшымі і чысцейшымі робіць нас далучэнне да зялёнага хараства зямлі.

А. КАРЭЛІН.

Фота М. МІНКОВІЧА.

# ЛЁС КАЛГАСНАГА ЛЕСУ

Корань гэтай праблемы вядзе ў перыяд калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Менавіта тады калгасам у выглядзе эканамічнай дапамогі былі перададзены лясы мясцовага значэння і частка лясоў дзяржаўных. Гэта была часовая мера, але абставіны склаліся так, што... воз і цяпер там.

У 1956 годзе ва ўласнасці калгасаў было 1 мільён 811,8 тысячы гектараў лясоў. У 1966 годзе — 1,6 мільёна гектараў, ці 19 працэнтаў усёй лясной плошчы рэспублікі!

У свой час адвод лясоў калгасам праводзіўся без належнага абгрунтавання, часта фармальна: стаіць побач бор — мерай.

Агульнавядома: каб культурна весці лясную гаспадарку, трэба ўпарадкаваць лясныя масівы, зрабіць адпаведныя праекты, стварыць лясную службу і г. д. На жаль, толькі дзе-нідзе ў калгасах была арганізавана лясная ахова і то без спецыяльнай падрыхтоўкі кадраў.

З тае пары мінула 30 гадоў, і сёння мы можам (праўда, са спазненнем) зрабіць вывады. Яны, скажам прама, не радуюць.

Спачатку зробім адну істотную агаворку. Супраць высечак калгаснага лесу на грамадскія індывідуальныя збудаванні нічога не скажаш. Дзеля гэтага і адбыўся падзел. Поўнасцю адмаўляць яго неабходнасць было б гістарычнай блізарукасцю.

Але як высякаліся гэтыя лясы? Пра гэта варта сказаць. Першнаперш назавем тыя асноўныя палажэнні, якія звычайна строга выконваюцца ўсімі лесапрамыслоўцамі: лес (абавязкова спелы) высякаецца суцэльнымі лесасекамі; памеры лесасек павінны быць пэўнай велічыні; колькасць драўніны, якую збіраюцца вывезці, разлічваецца так, каб лес мог узнаўляцца і г. д. Усе гэтыя і іншыя элементарныя правілы, на жаль, былі забыты. Высечка вялася па ўсім лесе, дзе каму хацелася, піла кранала толькі лепшыя дрэвы.

За кошт лесу, хоць яго і не было лішку, калі ўлічваць патрэбы не толькі бягучага года, калгасы паляпшалі свае фінансавае становішча. Больш таго, асобныя з іх нават праяўлялі «творчасць». Так, калгасы Глускага і Старадарожскага раёнаў арганізавалі арцелі па нарыхтоўцы стружкі з асіны, а на Гомельшчыне калгасы адпраўлялі вагоны з лесам на Украіну. Падобных прыкладаў можна прывесці нямала.

Агульнае становішча калгасных лясоў зараз такое: амаль зусім адсутнічае іх добраўпарадкаванне і праектаванне, ахова арганізавана слабая, часта сустракаюцца самавольныя высечкі, спецыялістаў яўна не хапае, лесагаспадарчыя, лесаўзнаўленчыя і супрацьпажарныя работы выконваюцца дрэнна. І апошняе: калгасныя лясы засмечаныя, яны рэдкія, на вялікіх аголеных палянах ніякія пасадкі не вядуцца.

Бачачы, што становішча склалася незайздроснае, у абласцях і раёнах пачалі перадаваць калгасныя лясы дзяржлесфонду. Піянерам у гэтай добрай справе была Гродзенская вобласць. Толькі ў 1967—1968 гг. тут перададзена дзяржаве каля 200 тысяч гектараў калгаснага лесу.

# ПОЯС ЗДАРОЎЯ ВАКОЛ МІНСКА

Сучасныя буйныя гарады, насычаныя прамысловасцю і транспартам, з'яўляюцца, як вядома, крыніцамі забруджвання атмасферы. У паветра беспарапынна выкідваецца вялікая колькасць газаў і пылу, ствараецца неспрыяльны таксічна-радыяцыйны рэжым, які шкодна ўздзейнічае на ўсё жывое. Акрамя гэтага, у выніку ўзмоцненага тэмпу працы і жыцця ўзніклі новыя, дарэчы, яшчэ не да канца вывучаныя раздражняльнікі нервовай сістэмы: пастаянны шум і г. д.

У такіх умовах уключэнне ў структуру горада натуральнага прыроднага ландшафту — рэч абавязковая.

Не дзіўна, што тэрыторыям, якія прылягаюць да горада, надаецца столькі ўвагі. У іх «абавязкі» ўваходзіць: аздараўленне паветранага басейна, паляпшэнне мікраклімату і агульнага жыццёвага асяроддзя, а таксама стварэнне добрых умоў для масавага адпачынку працоўных.

У сувязі з гэтым спецыяльнымі ўрадавымі пастановамі вакол буйных гарадоў ствараюцца зялёныя зоны — паясы здароўя.

У 1970 годзе былі зацверджаны «Асноўныя палажэнні па арганізацыі і вядзенню лясной гаспадаркі ў зялёных зонах гарадоў». Палажэнні распрацаваны з улікам фізіялагічнай ролі лясоў — «лёгкіх горада».

Праз год пасля гэтага быў закончаны комплексны праект прыгараднай зоны Мінска. Трэба сказаць, што межы гэтай зоны былі ўстаноўлены яшчэ ў 1945 годзе і з таго часу ні разу не мяняліся. На сённяшні дзень Мінск мае лясоў першай групы менш нормы. Такая зона (радыус 30 кіламетраў) ужо не можа задаволіць сталічны горад, насельніцтва якога за апошнія 26 гадоў вырасла больш чым у шэсць разоў!

На ўсёй тэрыторыі прыгараднай зоны Мінска, а таксама ў перспектыўных месцах адпачынку яшчэ вядзецца прамысловая высечка. Толькі ў мінулым годзе было нарыхтавана звыш 100 тысяч кубаметраў драўніны, высечана 1260 гектараў самага каштоўнага спелага лесу (палавіна — у Лагойскім лясгасе, дзе поўна прадстаўлены прыродныя ландшафты Беларусі).

Лясы ў межах праектуемай зялёнай зоны Мінска на 80 працэнтаў складаюцца з сасновых маладнякоў і дрэў сярэдняга ўзросту. Колькасць прыспяваючых і спелых насаджэнняў нязначная. Ва ўмовах усё ўзрастаючай патрэбы ў драўніне тут шырока прымяняецца падсочка сасны, пачынаючы з дрэў сярэдняга ўзросту. Штогод колькасць высечанай драўніны перавышае разлік у 1,4—1,5 раза. Такі напрамак у вядзенні лясной гаспадаркі вядзе да скарачэння спелых насаджэнняў, якія найбольш поўна задавальняюць патрэбы ў адпачынку і валодаюць высокімі кіслародапрадукцыйнымі якасцямі. Максімальнае выдзяленне кіслароду (180—200 кг/га) залежыць ад «зялёнай масы» і ажыццяўляецца хвойнымі пародамі ва ўзросце 100—120 гадоў, а лісцевымі — 60—80 гадоў.

Адным словам, межы зялёнай зоны Мінска трэба тэрмінова перагледзець. Вядома, у бок яе павелічэння. Перагледзець згодна нарматываў, якія прыняты для іншых буйных гарадоў.

Праектам прапануецца павялічыць «пояс здароўя» ў пэўных напрамках да 60—80 кіламетраў ад Мінска. На ўсёй гэтай тэрыторыі неабходна адрэгуляваць лесакарыстанне, перавесці лясы з другой групы ў першую, дзе рэжым лясной гаспадаркі павінен быць накіраваны на вырошчванне прыгожага і доўгавечнага лесу. Мэтазгодна перавесці ў вышэйшы разрад каля 180 тысяч гектараў лесу, а таксама перадаць у Дзяржаўны лясны фонд усе лясныя ўгоддзі, якія знаходзяцца цяпер у карыстанні калгасаў і саўгасаў.

Улічваючы, што фарміраванне лясных ландшафтаў працягваецца дзесяцігоддзямі, мерапрыемствы, якія мы ўпаміналі, павінны быць праведзены ў жыццё неадкладна.

Кранаючы зялёны пояс вакол Мінска, нельга абысці такое пытанне, як адпачынак працоўных.

Павелічэнне вольнага часу і паляпшэнне матэрыяльнага становішча — усё гэта падштурхоўвае гараджан да пошукаў мала асвоенай прыроды.

У верасні 1969 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню арганізацыі адпачынку працоўных г. Мінска».

У ваколіцах Мінска ў сучасны момант вядзецца асваенне трох зон масавага адпачынку. У 1970 годзе створана вадасховішча на рацэ Вяча, дзе ёсць сістэма штучных пясчаных пляжаў. На Заслаўскім вадасховішчы вядзецца будаўніцтва пля-

Былыя калгасныя лясы, а ў многіх выпадках плошчы з-пад лясоў, прыносяць лесаводам рэспублікі нямала клопату. Іх трэба ўпарадкаваць, ачышчаць ад ламачча, праводзіць лесаўзнаўленчыя работы, урэшце — павышаць прадукцыйнасць лясных масіваў і дабівацца іх рацыянальнага выкарыстання.

Яшчэ некалькі лічбаў. На першае жніўня 1972 года калгасных лясоў лічыцца: па Брэсцкай вобласці — 288,8, Віцебскай — 226,2, Гомельскай — 196,6, Гродзенскай — 107, Мінскай — 193,4 і Магілёўскай — 134,1 тысячы гектараў, усяго — 1 мільён 146,1 тысячы гектараў. Ці трэба гаварыць, што гэта вялікія плошчы? Калі не ўсе, то ў асноўным яны павінны быць перададзены дзяржаве.

5 красавіка 1918 года У. І. Ленін падпісаў зварот Савета Народных Камісараў да «Усіх Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў працоўных» па пытанню аб лясах і захаванню кадраў лясной гаспадаркі, у якім гаварылася, што вайна пакінула велізарныя плошчы агаленых месц, якія неабходна ў інтарэсах народа тэрмінова засадзіць і засеяць лясамі; што ўсе лясы трэба абнародаваць, апісаць, арганізаваць у іх гаспадаркі; што лясы не складаюць уласнасці ні сёл, ні губерняў, ні абласцей, а ўяўляюць сабою агульнанародны фонд і ні ў якім разе не могуць падвяргацца ніякаму падзелу і размеркаванню ні паміж грамадзянамі, ні паміж гаспадаркамі...

Гэты ленінскі запавет мы павінны ўзяць за аснову і пры вырашэнні далейшага лёсу калгаснага лесу. Пакуль што ён, як дзіця ў сямі нянек.

На сённяшні дзень, калі эканоміка калгасаў значна ўзрасла, ці можна трываць такое становішча далей? Ёсць лес адзіны — дзяржаўны. Настаў час паскорыць перадачу калгасных лясоў дзяржлесфонду.

А. СТАТКЕВІЧ,
начальнік аддзела дагляду
за лесам і лесакарыстання
Міністэрства лясной гаспадаркі БССР.

жаў, інжынернае добраўпарадкаванне берагавой паласы, расчышчаецца рэчышча і ліквідуюцца мелкаводдзі і балотцы. Упарадкоўваецца таксама і зона адпачынку на Пцічы.

Аднак, нягледзячы на дасягнутыя поспехі, ёсць і сур'ёзныя недахопы.

Пакуль што ўсе мерапрыемствы зводзяцца ў асноўным да будаўніцтва вадасховішчаў і пляжаў, упарадкоўваюцца палосы шырынёй 50—100 метраў, а ўся астатняя тэрыторыя застаецца ў першапачатковым выглядзе. Мінск, у адрозненне ад іншых буйных гарадоў краіны, не мае ніводнай добраўпарадкаванай зоны адпачынку, ніводнага лесапарку, лугапарку і г. д. Такім чынам, ствараецца канфліктная сітуацыя паміж чалавекам і прыродай. Вадасховішчы — моцныя прыцягальныя фактары, таму адпачываючых тут у 4—6 разоў больш нормы. У першую чаргу пад пагрозай аказваюцца прыбярэжныя лясы. Тут моцна вытаптана травяное покрыва, знішчаецца падлесак, лясы марнеюць ад самавольных высечак і пажараў. Шмат якія прыбярэжныя ўчасткі знаходзяцца ў антысанітарным стане.

Так узнікае дыспрапорцыя паміж патрэбамі ў рэакрацыйных тэрыторыях і іх задавальненнем. У выніку ў ваколіцах Мінска адбываецца стыхійнае асваенне найбольш цікавых у прыродных адносінах ландшафтаў. Пры гэтым дапускаецца сур'ёзная памылка, калі непадрыхтаваныя, неабсталяваныя лясы параўноўваюцца з месцамі масавага адпачынку.

Такія адносіны да прыродных ландшафтаў непазбежна прывядуць іх да пагібелі.

Да гэтага часу не пачата распрацоўка праекта пасадкі дрэў у зялёнай зоне Мінска, зонах масавага адпачынку, прыбярэжных зонах вадасховішчаў і водаахоўнай зоны Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. А менавіта аб гэтым гаварылася ў Пастанове Савета Міністраў БССР.

Які вывад з усяго сказанага можна зрабіць? Неабходна як мага хутчэй перавесці прыгарадныя лясы ў лесапаркі, загарадныя паркі, лугапаркі, лясы інтэнсіўнага наведвання з адначасовым планаваннем дарожна-сцежкавай сеткі, месц для пікнікоў, вогнішчаў і палатак, з інжынерным абсталяваннем і элементамі пярвічнага абслугоўвання, узнаўленнем раслiннага покрыва і належнымі правіламі карыстання.

Варта мець на ўвазе, што адкладваць гэтую работу нельга, бо размова перш за ўсё ідзе пра здароўе працоўных.

В. ШЫЛЬНІКОЎСКАЯ,
архітэктар;
Г. РУСЕЦКАЯ,
інжынер.

# І СУПАКОІЦЦА МАР'ЯНКА

Дзіўная гэта рачулка. Улетку вераб'ю па калена, а вясною?.. Вясною Мар'янка бурліць, як магутная рака. Тады жыхары вёскі Ржэўцы будуюць часовыя масты, каб трапіць на калгасную сядзібу, што на другім беразе ракі. Усяго некалькі дзён у годзе бывае паўнаводнай Мар'янка, але колькі бяды нарobіць! І губіць яна не што-небудзь, а галоўнае багацце калгаса — зямлю. Ужо больш чым сто пяцьдзесят гектараў добрай зямлі загубіла яна ў калгасе «Запавет Леніна» Шклоўскага раёна.

Вясною Мар'янка разам з талай вадой забірае мноства каштоўнай зямлі і нясе ў Днепро. Скончыцца паводка, і — здзіўляюцца людзі — дзесяткі новых канаў і разор працягнуліся з палёў да рачулкі. І так штогод. Спрабавалі рознымі сродкамі спыніць свавольства Мар'янкі. Спрабавалі каля Ржэўцаў абсаджваюць берагі рэчкі дрэвамі і кустамі. Каля вёскі Сасноўка звыш трох гектараў шматгадовым лубінам засявалі. Сям-там гэта дало пэўныя вынікі, але эрозія зямлі працягвалася. І ў значных маштабах. Вось тады і адбылося спецыяльнае пасяджэнне праўлення калгаса.

Пасяджэнне праходзіла бурна. Многім здавалася, што адпусціць восемдзесят дзве тысячы рублёў на ўтаймаванне Мар'янкі — гэта ўжо занадта. Прыгадвалі, што спынілі прыдарожную эрозію са значна меншымі выдаткамі.

— Не, шкадаваць тут грошай, таварышы, нельга. Амаль усе спосабы барацьбы з Мар'янкай мы ўжо прымянялі. Вынікі, як бачыце, не вельмі суцяшальныя. Застаецца апошняе — на месцы яру стварыць штучнае возера і з дапамогай вады затрымаць далейшае разбурэнне зямлі. У Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі мне абяцалі дапамагчы з праектам. Частка тэхнікі ў нас ёсць, частку дадуць будаўнікі,— падсумаваў спрэчкі старшыня калгаса Пётр Міхайлавіч Катушкін...

Мы стаім з Пятром Міхайлавічам на беразе гэтай самай свавольнай рэчкі.

— Цяжка паверыць, што такая малеча можа нарабіць столькі шкоды! Сапраўды, цяжка. Ды нічога! Хутка ўтаймуецца свавольніца. Пабудуем плаціну, створым вадасховішча. Вадою напоім палі, вакол возера агуркі і памідоры будуць добра расці, развядзём качак, рыбу... Дзеля чаго ж мы тады на свеце жывём, калі такой рэчцы рады не дадзім?! — старшыня па-змоўніцку падміргнуў мне.

У гэтых словах — увесь Катушкін: добрасумленны працаўнік, дбайны і руплівы гаспадар, рашучы і перакананы чалавек.

Нарадзіўся і вырас ён у вёсцы на Мсціслаўшчыне. З выбарам жыццёвага шляху доўга не вагаўся — падаў дакументы ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля заканчэння некалькі гадоў працаваў аграномам, а тры гады назад узначаліў калгас «Запавет Леніна».

За гэты час у гаспадарцы адбыліся значныя змены. Вось прыклады. Ураджайнасць збожжа ў 1965 годзе складала 11,2 цэнтнера з гектара. У мінулым жа годзе тут сабралі па 33 цэнтнеры. Значна вырас ураджай бульбы і іншых сельскагаспадарчых культур. Калгаснікі пачалі больш атрымліваць за працу. Прыемна, што і моладзь, якая раней «спяшалася» ў горад, усё часцей застаецца ў калгасе. А ўзяць будаўніцтва — гаспадарчае і культурнае? Не пазнаць зараз Ржэўцаў і іншых вёсак сельгасарцелі.

Ва ўсім гэтым — немалая заслуга няўрымслівага старшыні Пятра Міхайлавіча Катушкіна.

Вось чаму, пакідаючы Ржэўцы, я не сумняваўся: хутка супакоіцца, уціхамірыцца свавольная Мар'янка.

Л. ЗДАНОВІЧ.

СССР — 50 ГОД



# ВОЛЗЕ БЫЦЬ ЧЫСТАЙ!

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову аб мерах па папярэджанню забруджвання басейнаў рэк Волгі і Урала неачышчанымі сцёкавымі водамі. Гэтую пастанову каменціруе пісьменнік Г. Кублiцкі.

Пачну з даведкі.

На той вялізнай тэрыторыі, якую географы называюць басейнам Волгі і яе прытокаў, жыве і працуе каля 60 мільёнаў нашых грамадзян. Яны карыстаюцца волжскім флотам як сродкам зносін — судны на падводных крылах ліквідавалі яго адрыў ад хуткасцей веку. Волга даўно прызнана здраўніцай, і шмат для каго палуба турысцкага цеплахода лепш за любы санаторый.

Дык ці можа не турбаваць, не хваляваць савецкіх людзей захаванне чысціні волжскай плыні, дзівоснай прыроды галоўнай нашай ракі? Зразумела таму, што пастанову Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па папярэджанню забруджвання басейнаў Волгі і Урала неачышчанымі сцёкавымі водамі» ўсе мы прачыталі з глыбокім задавальненнем.

...Вядома, што Сена, мінуючы Парыж, у іншыя гады нагадвае «кактэйль»: палавіна рачной вады, палавіна сцёкавай. І ўжо не здаецца дзіўным паведамленне з ЗША аб пажары на адной рацэ, якая ўпадае ў возера Эры: заводы так «накармілі» раку лёгкімі на загаранне адходамі, што яна ўспыхнула адразу і на вялікай даўжыні, быццам па яе рэчышчы цякла газа...

Наша краіна звыш паўвека назад аб'явіла зямлю, нетры і воды народным здабыткам. У нас існуе воднае заканадаўства, якое спрыяе найбольш эфектыўнаму навукова абгрунтаванаму выкарыстанню вод, іх ахове ад забруджвання, засмечвання і змяншэння іх запасаў. Клопат аб тым, каб захаваць прыроду, становіцца ўсенароднай справай, і як не ўспомніць тут, што вось ужо некалькі гадоў у прыволжскіх гарадах народны кантроль энергічна дзейнічае пад лозунгам «Волзе быць чыстай!».

Зроблена шмат. У прыватнасці, пастанова прыводзіць звесткі па басейнах Волгі і Урала: за пяцігодку створана 670 комплексаў, якія здольны кожныя суткі ачышчаць звыш 3 мільёнаў кубаметраў сцёкавых вод. Сутачная магутнасць сістэм зваротнага водазабеспячэння складае 70 мільёнаў кубаметраў.

І вось цяпер велізарная сума — мільярд рублёў! — выдзяляецца на тое, каб працягваць гэтую дзяржаўна неабходную справу. Пастанова вызначае: да 1980 года скід неачышчаных вод ва ўсіх гарадах басейна Волгі і Урала павінен быць цалкам спынены.

Некалькі гадоў назад Канстанцін Федзін пісаў: «Мне бачыцца кніга, якая апявае Волгу. Кніга, якая была б паклонам чароўнай рацэ, што стагоддзямі наталяла смагу народных мар аб свеце цудоўным і вольным».

Наўрад ці будаўніцтва ачышчальных збудаванняў натхніць паэтаў. Але па сутнасці сваёй менавіта такая праца якраз найбольш патрэбна сёння — каб наша Волга была «светам цудоўным і вольным», светам гарманічнага суіснавання прыроды з волатамі, якія стварыў чалавек на волжскіх берагах і ў волжскім рэчышчы.

Жамчужына Сібіры — Байкал.



# ЗЯЛЁНЫЯ ЖАМЧУЖЫНЫ УКРАІНЫ

На працягу 1972—1980 гадоў запаведныя тэрыторыі Украіны павялічацца з 57 тысяч да 700 тысяч гектараў. Дадаткова да існуючых прадугледжана да 1980 года стварыць 28 новых дзяржаўных запаведнікаў і заказнікаў.

Запаведнікі рэспублікі, якія функцыянуюць зараз, размешчаны ва ўсіх фізіка-геаграфічных зонах Украіны і выконваюць велізарнай важнасці ролю захавальнікаў некранутай прыроды з каштоўнейшымі комплексамі расліннага і жывёльнага свету, а таксама глебавага покрыва. Толькі за восьмую пяцігодку плошча гэтых своеасаблівых прыродных эталонаў, якія ахоўваюцца дзяржавай, вырасла ў 2,5 раза. У дзвюх наступных пяцігодках іх сям'ю папоўняць такія жамчужыны прыроды, як горны масіў Кара-Даг на поўдні Крымскага паўвострава, дунайскія плаўні ля ўзбярэжжа

Чорнага мора, урочышча «Чорны лес» у Знаменскім раёне Кіравагорадскай вобласці, Матронінскія лясы з апетым Т. Р. Шаўчэнкам урочышчам «Халодны яр» на Чаркашчыне.

Птушынымі заказнікамі стануць Ягарлыкскі ліман у Херсонскай вобласці і Кучурганскі на Адэсчыне. У Каркініцкім заліве Чорнага мора ствараецца вялікі Іхтыялагічны заказнік. Ландшафтнымі заказнікамі стануць Кінбурнская каса каля Ачакава і вышэйшая кропка стэпавага Крыму мыс Тараханкут. Цэлы шэраг запаведнікаў і заказнікаў будзе арганізаваны ўжо ў гэтым годзе.

Зацверджана і новая класіфікацыя запаведных аб'ектаў, якія ахоўваюцца дзяржавай. Замест раней існаваўшых дзвюх катэгорый уведзены пяць: дзяржаўныя запаведнікі, дзяржаўныя заказнікі, дзяржаўныя прыродныя паркі, помнікі прыроды, паркі-помнікі садова-паркавага мастацтва. Гэта будзе садзейнічаць палепшанню аховы каштоўных аб'ектаў і больш рацыянальнаму іх выкарыстанню, у прыватнасці, для масавага адпачынку працоўных.

Прадугледжана стварэнне двух дзяржаўных прыродных паркаў — Крымскага і Прыкарпацкага. У цяперашні час вядуцца праектныя распрацоўкі іх схем і вывучаюцца магчымасці стварэння прыродных паркаў у іншых мясцінах Украіны.

Зараз у рэспубліцы ўзяты пад ахову дзяржавы 2977 прыродных аб'ектаў, сярод іх 106 помнікаў прыроды рэспубліканскага і 2871 — мясцовага значэння. Апошнія па відах падраздзяляюцца на 277 комплексных, 1651 батанічны, 264 геаграфічныя, 622 гідралагічныя і 57 заалагічных.

У 1972 годзе на тэрыторыі Украіны прадугледжана закончыць інвентарызацыю векавых дрэў.

## ЗАКАЗНІК «ГАЯНСКІ ЗАЛІЎ»

Вялікі ўчастак Ягарлыкскай затокі Дубасарскага вадасховішча Малдаўскай ССР аб'яўлены рэспубліканскім іхтыялагічным заказнікам. Па сваіх прыродных умовах гэты вадаём, які «падкрэсліваецца» шматлікімі крыніцамі і ключамі, з'яўляецца ідэальным і адзіным на вадасховішчы месцам для натуральнага нерасту і зімоўкі каштоўных прамысловых рыб. Тут захаваліся тыповыя для Днястра пароды: судак, рыбец, лешч, сазан, тарань і іншыя.

Заказнік «Гаянскі заліў» з плошчай люстэрка ў 270 гектараў створаны з мэтай аховы рыбных запасаў, акліматызацыі і рэакліматызацыі каштоўных парод рыб, а таксама аднаўлення і павелічэння іх колькасці ў вадасховішчы і Днястры. У зоне заказніка будуць пабудаваны інкубацыйны цэх і шэраг сажалак для ўтрымання лічынак прамысловых і акліматызуемых рыб. Мяркуецца развесці ў заліве сіга і сінца. У заказніку цалкам забаронены прамысловая, аматарская і спартыўная лоўля рыбы, паляванне на звяроў і птушак, купанне, утрыманне лодак, будаўніцтва дамоў, лагераў адпачынку і спартыўных баз.

Стварэнне заказніка дасць магчымасць павялічыць у бліжэйшыя гады запасы рыбы ў Дубасарскім вадасховішчы ў тры-чатыры разы.

## НА КУРШСКАЙ КАСЕ

— Значыць, у Літву?

— Так.

— Вільнюс, Тракай, Паланга?

— Не, браце, не ўгадаў. Шылутэ, Руснэ, Ніда...

Мой субяседнік змаўкае. Янтарны россып гэтых назваў яму, відаць, ні аб чым не гаворыць.

А менавіта яна, Куршская каса, і з'яўляецца жамчужынай Прыбалтыкі. Плаўнай дугою злучае яна Калінінградскую вобласць і Літоўскую ССР. Даўжыня касы 98 кіламетраў, шырыня — ад 400 метраў да 4 кіламетраў. Трэба адзначыць, што наведванне гэтых мясцін строга абмежавана: тэрыторыя дзяржаўнага запаведніка са спецыяльным рэжымам утрымання.

Знаёмства з касой лепш пачынаць з заходняга боку. З Калінінграда — поездам да курортнага гарадка Зеленаградска. Адсюль на спадарожнай машыне можна праехаць праз усю касу, ды толькі які падарожнік згодзіцца на такое? Хто захоча апынуцца ў становішчы той дамы, якая пабываўшы ў Венецыі і ўбачыўшы там славутыя каналы, успамінала потым: «А як жа, памятаю гэты горад. Там, здаецца, была паводка».

А цяпер — крыху геалогіі. Куршская каса ўтварылася на месцы былых астравоў, якія апусціліся на дно мора. Ля іх адкладваліся рэшткі берагоў паўвострава, прынесеныя марскімі хвалямі. Пясчаныя водмелі з цягам часу злучыліся, і ўтварылася цяперашняя каса. Чаму Куршская? Некалі тут пасяліліся куршы — рыбацкае племя. Помнікі іх матэрыяльнай культуры прадстаўлены ў невялічкім, але цудоўна аформленым Шылуцкім краязнаўчым музеі, але гэта на мацерыку.

...Птушкі, якія ляцяць над морам, убачыўшы пад сабою прывабную зялёную палоску, складаюць крылы. Штогод «куршскі мерыдыян» перасякаюць мільёны пярнатых.

У пасёлку Рыбацкі размешчана Арніталагічная станцыя Акадэміі навук СССР — адна са старэйшых у Еўропе. Акальцаваныя тут птушкі былі злоўлены ў розных кутках свету — на мысе Добрай Надзеі, у краінах Паўднёвай Еўропы, на Балканах, у Індыі.

Непадалёку ад пасёлка, сярод лесу, развешаны агромністыя сеткі. Сваімі абрысамі і памерамі яны нагадваюць ангары нейкіх фантастычных лятальных апаратаў. Пад іх мітуслівы полаг і трапляюць на ляту крылатыя госці. Але палон гэты — часовы.

Пакінуўшы пасёлак, вы адчуеце, як вас «разрываюць» на часткі дзве стыхіі. Злева, за жывой агароджай сосен, шуміць мора. Добра чуваць, як набягаюць на бераг нястомныя хвалі. Справа... А справа адкрываецца нешта незвычайнае. Нібыта міраж. Там, дзе канчаюцца зараснікі, вырастаюць горы пяску, чысцюткага, бела-жоўтага. Не, не мініяцюрныя пагоркі, а сапраўдныя ўзвышшы. На іх нішто не расце. Толькі ля падножжаў дзенідзе палаюць сінімі агеньчыкамі кветкі і паблісквае вострымі пікамі асака. А вышэй, на хрыбтах і перавалах, я знарок не бяру гэтыя словы ў двукоссе, толькі вецер гуляе, замятаючы пясчынкамі незлічоныя сляды чаек. Пясок, неба і мора. Колеры, здаецца, лакальныя, а якая гармонія! Пейзаж амаль па Сар'яну. Ці Рэрыху...

Яшчэ больш прыгожыя дзюны ў раёне Ніды. Гэты ўтульны гарадок — зараз любімае месца адпачынку літоўскіх працоўных. Цікавы і такі факт. У Нідзе жыў, хаваючыся ад нацыстаў, вядомы нямецкі пісьменнік Томас Ман.

Куршская каса існуе дзякуючы лесу. Калі б не ён... Каля двух вякоў таму назад лясы ў тутэйшых мясцінах былі знішчаны. Заходнія вятры аказаліся на свабодзе. Агаленыя дзюны пачалі насоўвацца на паселішчы. Некалькі вёсак апынуліся пад саракаметровай тоўшчай пяску. Вось тады людзі і зразумелі, што яны натварылі, знішчыўшы натуральную ахову — лес. Выйсце шукаць узяўся Георг-Давід-Кувертас. На магіле яго бацькі выбіты словы: «...чый сын Георг-Давід першым пачаў саджаць тут, у журботным адзіноцтве Ніды, лясныя дрэвы».

У 1967 годзе па касе пранёсся ўраган небывалай сілы. Шмат палягло лесу. Нават Нёман павярнуў быў назад свае воды.

Крочыш цяпер і дзіву даешся: быццам нічога і не здарылася. Людская ўпартасць і творчы розум перамаглі і на гэты раз. Узнаўленне адбылося за кароткі час. Дапамаглі горная сасна і травапескалюб.

Падарожжа па касе заканчваецца ў пасёлку Руснэ, размешчаным у самай дэльце Нёмана.

Руснэ — востраў-запаведнік.

Яно так, тут багата экзотыкі: непралазныя зараснікі трыснягу, старая вуліца-запаведнік (стрэхі чаротавыя), камяніца XV стагоддзя, шырокія — аж не верыцца — рукавы Нёмана, высокія з маляўнічымі сцяжынкамі дамбы, мноства буслоў і шмат што іншае. Нездарма гэты куток любіць і часта наведвае Э. Межэлайціс.

...Бывай, Руснэ. Да пабачэння, Куршская каса!

В. ДАШКЕВІЧ.

# НЕСПАКОЙНЫ ЧАЛАВЕК

Харошы гарадок — Камянец: зялёны, чысты, утульны. Асаблівую акрасу надае яму спакойная, мо нават крышачку параўнiннаму флегматычная, з крыштальна-празрыстай паўнаводнай плынню рака Лясная. А яшчэ — славутая Белая вежа, сямісотгадовы «Камянецкі слуп», што глядзіцца ў блакіт нябёс з высокага старажытнага замчышча, нібы і зараз ахоўваючы подступы да яго з боку ракі, з боку пушчы. Колісь яна была зусім блізка, ледзь не ля самага горада. За стагоддзі пушча адступіла на захад на кіламетраў дваццаць, аж за вёску Камянюкі, але Белая вежа і сам гарадок паранейшаму засталіся яе своеасаблівымі варотамі, і шматлікія турысты, экскурсанты і падарожнікі з усіх канцоў краіны, што едуць у гэты запаведны куточак Беларусі, не мінаюць Камянца.

Ды ёсць, мне думаецца, у Камянцы і яшчэ адна мясціна, якую таксама не павінны б абмінаць турысты і экскурсанты,— маю на ўвазе вуліцу імя Дзяржынскага, што на самай ускраіне гарадка.

Знешне яна — вуліца як вуліца. Як для Камянца, гарадка дагледжанага і ўпарадкаванага, дык нават і незайздросная: незаасфальтаваная і незабрукаваная. Спачатку дык і не зразумець, чым яна ўражвае, чаму ў тваёй душы зварушваецца раптам нейкае радасна-шчымлівае пачуццё здзіўлення і замілавання. І толькі пасля, калі пройдзешся па ёй, агледзішся, даходзіць да цябе, адкуль яно, гэтае пачуццё чысціні і святочнасці.

Вось сярод каштанавых прысад тваю ўвагу спыняе акуратны, зроблены з густам стэнд, на якім словы выдатнага пісьменніка і вялікага прыродалюба М. Прышвіна: «Ахоўваць прыроду — значыць ахоўваць Радзіму». Вось з-за куста бэзу мільгануў на сцяне дома малюнак лася, на другім — малюнак зубра, на трэцім — бусла... І ты міжволі пачынаеш заўважаць і адзначаць для сябе, што вуліца гэтая, нягледзячы на сваю незамошчанасць, нязвычна гладкая, без калдобін і рытвін, і чыстая, што маладыя дрэўцы паўз тратуараў дужа стройныя, старанна абкапаныя і палітыя, што дамы — адзін у адзін — цешаць вока дагледжанасцю і акуратнасцю. І ты пачынаеш думаць, што шчаслівы лёс звёў на гэтую вуліцу сур'ёзных, дружных людзей, а яшчэ аб тым, што як здорава было б калі б усе вуліцы ў нашых гарадах і гарадках, мястэчках і вёсках былі хоць крыху падобны на гэтую,— якой прыгожай была б наша краіна, і ў збянтэжанасці спыняешся раптам перад другім стэндам, на якім чытаеш гэтыя свае думкі, выказаныя калісьці нястомным пераўтваральнікам прыроды І. Мічурыным: «Наша краіна павінна быць самай прыгожай краінай у свеце».

На гэтую вуліцу ў Камянцы мяне прывяла патрэба пабачыцца з намеснікам старшыні прэзідыума раённага савета таварыства паляўнічых і рыбаловаў А. Самуйлікам, з чалавекам, як мне казалі яшчэ ў Мінску, цікавым хоць бы сабе тым, што за кароткі час ён здолеў наладзіць работу таварыства, арганізаваць шырокую падкормку і ахову звяроў і птушак, ліквідаваць браканьерства. Ужо гэта выклікала да яго павагу і цікаўнасць. Але яшчэ з большай цікаўнасцю адчыняў я веснічкі ў двор ягонага дома, калі па дарозе, ад выпадковага прахожага, даведаўся, што і стэнды, і прыродаахоўныя плакаты-малюнкі на сценах дамоў, і каштаны ўздоўж тратуараў, і сама вуліца — усё гэта таксама справа рук і клопатаў А. Самуйліка.

...Аляксандр Іванавіч сустрэў мяне ў двары, пад зялёнай павеццю з дзікага вінаграду. Мо таму, што я ўсё яшчэ быў пад уражаннем пабачанага, гаворка наша пачалася менавіта з яе, з вуліцы, якую інакш не назавеш, як жывой і наглядной прыродаахоўнай прапагандай. Я прызнаўся свайму субяседніку, што ўбачанае па дарозе сюды ніяк не вяжацца ў маім уяўленні з воблікам чалавека з паляўнічай стрэльбай. Аляксандр Іванавіч, усміхаючыся ў чапаеўскія вусы, гаварыў:

— А што ж тут дзіўнага? Хто такі паляўнічы ці рыбалоў? Найперш — аматар прыроды, дбайны гаспадар лесу, поля, ракі. А потым ужо, скажам гэтае страшнае для вас слова, забойца. Ды парадоксу тут ніякага няма. Зрэдзь можна, а то і трэба ўжыць зброю. Галоўнае — ведаць, калі, дзе і як яе ўжыць.

Мой субяседнік прысаджваецца на лаўку, прыпальвае папяросу і, схаваўшы ўсмешку, працягвае:

— Вось вам яшчэ адзін парадокс. У нашым таварыстве зараз — 475 членаў. Для раёна — нямала. Аднак лічбе гэтай мы не рады. Чаму? Ды таму, што сярод гэтых людзей нямала такіх, якія проста не маюць права быць паляўнічымі. Толькі ў гэтым годзе мы пазбавілі права мець стрэльбу некалькі дзесяткаў чалавек, прытым, у большасці, не браканьераў. У аднаго стрэльба недагледжаная, іржавая, стрэл з якой можа і да трагедыі прывесці. Другі паводзіць сябе са зброяй безадказна — на вуліцы бабахае. Трэці ўвогуле і сам не ведае, дзеля чаго трымае дубальтоўку. Вось і адбіраем. Лепш менш, ды лепш, як Уладзімір Ільіч вучыў.

Нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Самуйлік у 1908 годзе ў вёсцы Мохра цяперашняга Іванаўскага раёна ў беднай сялянскай сям'і. Быў ён трынаццатым сынам у бацькоў, і таму, скончыўшы чатырохгадовую польскую школу, упрогся ў «ярэмца хлебароба». Сацыяльны і нацыянальны ўціск, які панаваў на «Крэсах Усходніх», хутка вызначыў жыццёвую і грамадзянскую дарогу мохраўскага юнака — дарогу барацьбіта і падпольшчыка.

У гады суровых выпрабаванняў Вялікай Айчыннай Аляксандр Іванавіч не разгубіўся. Не здолеўшы трапіць на фронт, ён пайшоў у лес — падымаць народ на барацьбу з ворагам. Аляксандр Іванавіч стаў арганізатарам і камандзірам партызанскага атрада, які пазней атрымаў імя Кірава і к сорак чацвёртаму году меў больш чым чатырыста байцоў. На рахунку атрада — дзесяткі ўзарваных мастоў і спушчаных пад адхон варожых эшалонаў, сотні знішчаных гітлераўцаў і іх памагатых.

З сорак чацвёртага года Аляксандр Іванавіч зноў на савецкай і партыйнай рабоце.

Пайшоўшы на заслужаны адпачынак, ён нядоўга пасядзеў дома: восенню 1970 года Самуйлік узначаліў раённы савет таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Работа ў таварыстве была запушчана, і Аляксандр Іванавіч з уласцівай для яго стараннасцю і імпэтам узяўся за справу. Перш за ўсё ён правёў арганізацыйнае ўмацаванне пярвічных калектываў, паставіўшы на чале іх людзей актыўных, дзейсных, аўтарытэтных, якія склалі яго надзейны актыў. Найпершымі яго памочнікамі сталі старшыня калгаса імя Леніна Камянецкага сельсавета К. Сярмяжка, старшыня калгаса імя Кірава В. Ермалюк, рабочы мясцовай электрастанцыі Э. Воднеў, трактарыст калгаса імя Леніна А. Праліска, егер Белавежскай пушчы В. Адамчук, старшыня Вярховіцкага сельсавета П. Кісляк і многія іншыя.

Зіма 1970-71 года выдалася на дзіва снежнай, завейнай. Для лясной дзічыны надышлі цяжкія часы. Асабліва пакуталі ад бяскорміцы курапаткі. Для выратавання гэтай карыснай птушкі (курапатка — адзіная птушка, якая вынішчае каларадскіх жукоў) Аляксандр Іванавіч падняў літаральна ўвесь раён. За лічаныя дні ў мясцінах зімоўкі курапатак было зроблена мноства кармушак-буданоў, дзе птушкі маглі не толькі пад'есці, але і затуліцца ад пякучага сіверу. Былі выратаваны не толькі курапаткі, але і многа казуль, аленяў.

Тая зіма многаму навучыла Самуйліка, а найперш таму, што да зімоўкі звяроў і птушак трэба рыхтавацца загадзя і што ў рабоце па ахове багаццяў прыроды павінны прымаць удзел не толькі актывісты, члены таварыстваў паляўнічых і рыбаловаў і аховы прыроды (раённыя саветы абодвух таварыстваў тут працуюць у цесным кантакце, бо, як сказаў мне Аляксандр Іванавіч, мэты і задачы іх па сутнасці адны і тыя ж), але і ўсё насельніцтва раёна. І ён узяўся за наладжванне шырокай прыродаахоўнай прапагандысцка-агітацыйнай работы. Тое, што я пабачыў на вуліцы імя Дзяржынскага, толькі невялікая частка гэтай работы. Па ўсім раёне, у самых людных месцах, размешчана больш чым сорак стэндаў і фотавітрын, прысвечаных пытанням аховы прыроды. Асаблівую ўвагу Аляксандр Іванавіч звярнуў на школы, бо выхаванне любві да красы і багацця роднай зямлі ў чалавеку пачынаецца тут. На дапамогу прыйшлі настаўнікі, піянерважатыя, камсамольцы, і зараз ва ўсіх школах раёна ёсць стэнды, вітрыны, плакаты, куткі юных аматараў прыроды, нават невялічкія прыродазнаўчыя музеі (як, напрыклад, у Мікалаеўскай васьмігодцы), працуюць зялёныя патрулі. Для прапаганды сярод насельніцтва прыродаахоўных ідэй Самуйлік выкарыстоўвае раённы друк і радыё, ён з'яўляецца самым актыўным аўтарам старонкі «Чалавек і прырода», якая рэгулярна паяўляецца ў раённай газеце «Ленінец».

Пра тое, як важна вучыць людзей лю-

біць і шанаваць прыроду, Аляксандр Іванавіч можа гаварыць бясконца, з зацікаўленасцю і непадробным захапленнем. Ён радуецца кожнаму праяўленню чалавечага прыродалюбства і з асабістаю крыўдаю ўспрымае вестку аб выпадку браканьерства, з дзіцячай гарачлівасцю ўсклікаючы: «Трапіўся б мне на вочы ў тую хвіліну — не ведаю, што зрабіў бы!..»

У той дзень, калі я гутарыў з Аляксандрам Іванавічам, ён выглядаў крышку стомленым: учора ездзіў у Маларыту, правёў цэлы дзень на нагах, вярнуўся дадому позна ўвечары. У шэсцьдзесят чатыры гады па жніўеньскай спякоце — паездка нялёгкая. Відаць, была нейкая пільная патрэба?

— Пільная, канечне,— ківае сівой лысаватай галавой Самуйлік.— Вучыцца ездзіў, як зрабіць зімавальнік для маляваж. Дачуўся, што там, у Маларыцкім раёне, гэтая справа добра пастаўлена. Вось і паехаў паглядзець. Бо і нам неадкладна трэба рабіць — зіма не за гарамі. А пачалі мы тут дзела вялікае...

«Дзела» — гэта сапраўдны рыбгас, з плошчаю сажалак у сорак гектараў, з дамбамі, шлюзамі, помпавай станцыяй. Для арганізацыі рыбнай гаспадаркі таварыства ўзяло ў арэнду ў калгасе «Кастрычнік», непадалёк ад вёскі Баранкі, закінутыя сажалкі. Ад тых сажалак амаль нічога не засталося, і трэба было пачынаць амаль, як кажуць будаўнікі, з нуля. Вялікі аб'ём земляных работ, матэрыялы і абсталяванне — усё лягло на плечы Аляксандра Іванавіча. Патрабавалася менавіта ягоная ўпартасць і старанасць, каб усё ўзгадніць, утрэсці, выбіць, дастаўіць і г. д. Многія з гэтых клопатаў засталіся ззаду — ужо гатовы дзве сажалкі, у іх запушчаны двухгодкі карпа і карася...

— Многае ўжо зроблена, гэта праўда,— Самуйлік сашчэмлівае — моцна, да хрусту — вузлаватыя пальцы,— аднак работы яшчэ ўга колькі. Зімавальнік тут самы зрабіць — раз, тры астатнія сажалкі пусціць — два, тэрыторыю вакол упарадкаваць — тры... На будучы год будзем прасіць арганізаваць з райцэнтра аўтобусны маршрут у Баранкі — там жа будзе новая зона адпачынку. І не толькі для рыбаловаў...

У вачах Аляксандра Іванавіча — лагодных, чыстых — пры гэтых словах загараюцца гарэзныя агеньчыкі. І мне падумалася, што ўсё так і будзе: будзе хадзіць у Баранкі аўтобус, і будуць сядзець на берагах штучных рыбных пасек удзячныя рыбакі, і будзе стаяць у вечаровай прахалодзе водар церпкай рыбацкай юшкі.

* * *

У гасцях у Самуйліка быў я гарачым жніўеньскім днём. А зараз на двары позняя восень, парывы сцюдзёнага ветру прыносяць подых зімы. Вось-вось ляжа снег, пойдзе гуляць па лясах і палях дзядуля-мароз — наступіць пара зацішку і спакою ў прыродзе. Што цяпер робіць Аляксандр Іванавіч? Ці пааменела ў яго клопатаў? Наўрад! Уяўляю: прыеду ў Камянец, пазваню Самуйліку і пачую ў трубцы голас дачкі альбо жонкі: «Аляксандра Іванавіча няма, паехаў не то ў Вярховічы, не то ў Дзмітровічы. Чаго? Ды да сваіх паляўнічых...».

Мікола ГІЛЬ,
спец. кар. «Роднай прыроды».



# ЗЯЛЁНЫ ПОМНІК

Стаяў верасень сорак трэцяга. Ужо чырванелі трапяткія макаўкі асін, жаўцелі доўгія косы бяроз і магутныя грывы клёнаў. Па халоднай крынічнай рачулцы, што звівалася паўз лес, усё часцей плылі карагоды лісцяў. Лянотны чырванапёры язь тыцкаўся носам у лісце, сярдзіта плёхаў хвастом, разганяючы малечу, і крута апускаўся на дно.

Жыццё, нібы вада рачулкі, плыло сваёю чарадою...

А навокал грымела вайна. Зорнымі начамі шугала над вёскамі барвовае зарыва. Адступаючы, фашысты нішчылі ўсё, што маглі.

Фронт наблізіўся да ціхай крынічнай рачулкі. Разгарэўся бой за «водны рубеж». Над лесам гулі самалёты, вылі міны, вухкалі выбухі. Адзін са снарадаў разарваўся непадалёк ад маладзенькай сасонкі — асколкамі зрэзала макаўку, рассекла ствол.

Сонца хілілася к заходу, калі да параненай сасонкі падпоўз баец. Быў ён ужо немалады, над засмяглымі губамі тапырыліся рудыя, пракураныя вусы. Салдат выкапаў акоп, зняў каску, выцер узмакрэлы лоб, закурыў. І тут убачыў параненае дрэўца. На ствале сасонкі застылі кроплі смалы — у промнях заходзячага сонца яны чырванелі, нібыта кроў.

Салдат развязаў кайстру, дастаў бінт і перавязаў ім сасонку.

— Расці вялікая! — ціха сказаў ён. А мо і не сказаў, а толькі падумаў.

— Дарэнскіх, што ты там робіш? Перавязку? — рагатнуў баец з суседняга акопа.

...На золку цішыню разбудзіла магутнае «ўра». Байцы з чырвонымі зоркамі на касках перапраўліся цераз рэчку і пагналі ворага далей, на захад. Толькі на тым беразе ракі, пад маладой параненай сасонкай, застаўся ляжаць салдат-сібірак Дарэнскіх.

А сасонка не загінула, вырасла. Толькі замест аднаго — у яе чатыры ствалы.

Гэтую гісторыю расказаў мне знаёмы ляснік дзядзька Трахім. Гаварыў, што сам бачыў пасля вайны, як на сасонцы матляліся яшчэ матузкі бінту.

# СТАРЫ ВЯЗ

На ўзлеску, між алешніку, стаіць магутны разлапісты вяз. Калі глядзіш на гэтае дрэва, здаецца, што прырода завязвала на яго галінках вузялкі на памяць, ды забылася, дзеля чаго яна гэта рабіла. От вузялкі і засталіся. Ішлі гады. Дрэва пастарэла, сукі сталі яшчэ больш вузлаватымі...

Неяк на пачатку мая з настаўнікам Рыгорам Сымонавічам, даўнім маім сябрам, прыйшлі мы ў адведкі да вяза. Дзень быў светлы, радасны. Тонкія бярозкі, нібы дзяўчынкі-падлеткі, глядзеліся ў люстэркі лужын, сваволны ветрык расчэсваў іх зялёныя косы. Кволыя ліпкія лісточкі павыстаўлялі на сонца асіны і вольхі. Ды і ўвесь лес прымяраў — яшчэ нясмела, нібыта чагосьці палохаючыся,— свой вясновы ўбор. Толькі вяз, старое мудрае дрэва, яшчэ трымаў свае зялёныя сцягі ў чахлах.

На падыходзе да вяза нас прывеціла зязюля сваім адвечным «ку-ку». Калі мы падышлі бліжэй, яна бясшумна нырнула з вяза ў гушчар.

— Дык вось каму яна зычыла доўгае жыццё! — усміхнуўся Рыгор Сымонавіч. — Значыць, яшчэ доўга будзе стаяць дрэва. Гадкоў трыста з гакам мае, відаць. Колькі чаго яно пабачыла на сваім вяку! Жывы помнік творчасці прыроды...

Потым мы сядзелі непадалёк ад вяза на старых, сухіх пнях. Ціха, задуменна шумелі наўкол сосны. У зарасніках чаромхі спрабаваў голас салавей. Яму адгукнулася зязюля — мо тая самая? А над усім гэтым узвышаўся, шумеў пад ветрам пакуль што голымі вузлаватымі галінамі стары вяз. Ён тут, на ўзлеску, як арыенцір людзям — не зблудзіць. Улетку і ўвосень, у дажджлівую пару, ён хавае пад сваім шчыльным лісцвяным дахам грыбнікоў. Сёй-той па-свойму дзякуе дрэву за ягоную гасціннасць — пакідае на ствале выразаныя ножычкам «аўтографы», хтосьці даўмеўся нават — мабыць, пастушкі — выпаліць ля самай зямлі дупло.

Гледзячы на гэтую чорную, абвугленую нару ў ствале дрэва, я падумаў: «Зычыць зязюля доўгае жыццё старому вязу. Але птушка можа і памыліцца, калі чалавек не будзе берагчы яго».

Рыгор Сымонавіч, нібы ўгадаўшы мае думкі, прамовіў:

— Збіраюся схадзіць у лясніцтва, ды ўсё няма калі. Трэба неяк ратаваць дрэва.

... У лесе гаспадарыла бабіна лета, калі я з поўным кошыкам чарнагаловых баравікоў зноў наведаўся да старога вяза. Убачыў яго і здзівіўся: да ніжняй галіны была прымацавана невялікая, акуратная дошчачка-таблічка. На ёй былі напісаны «анкетныя дадзеныя» вяза і заклік берагчы незвычайнае дрэва.

«Значыць, Рыгор Сымонавіч схадзіў усё ж у лясніцтва, — падумаў я.— А мо сам?..»

Леанід ЛЕВАНОВІЧ.

# МОЙ РОДНЫ КУТ...

## ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯКУБА КОЛАСА

У Мінску, у двары Акадэміі навук рэспублікі, у засені срабрыстых соснаў і ялін стаіць невялікі двухпавярховы дамок. У ім пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў народны пясняр Беларусі Якуб Колас.

Паэт вельмі любіў гэты ціхі куточак непадалёк ад шумнага Ленінскага праспекта. У двары свайго дома ён любоўна дагледзеў кожную латку зямлі — як дбайны і руплівы гаспадар-земляроб. Да канца сваіх дзён, нягледзячы на сваю сусветную вядомасць, вучоныя званні і высокія пасады, Якуб Колас заставаўся сынам зямлі, заставаўся ў душы земляробам і сейбітам. Кожную раніцу паэт не прамінаў зірнуць на барометр — якое надвор'е будзе сёння, ці прасушыць чэрвеньскае сонца сена на калгасным лузе альбо ці пральецца вось тая хмарка цёплым ласкавым дожджыкам на засмяглыя загоны бульбы. Гэта была не проста звычка — ён жыў гэтым. На сваім гародзе ён штогод засяваў адну з градак жытам — каб бачыць, як яно каласуе, красуе, наліваецца, каб жнівеньскай парой учуць пах спелага коласа. Аднойчы ў дарэвалюцыйным часопісе Канстанцін Міхайлавіч прачытаў заметку, у якой гаварылася аб старадаўнім спосабе сумеснага высеву ячменю і азімага жыта. Якуб Колас на будучы ж год праверыў гэты спосаб на сваім «вопытным» участку.

Вакол яго дома шумяць клёны, бярозы, каштаны, кедры — усе яны пасаджаны рукамі песняра. Яны шумяць на грудку, які Канстанцін Міхайлавіч называў «выспачкай» і дзе любіў адпачываць, пасядзець на адзіноце са сваімі думкамі, марамі, летуценнямі. Непадалёк ад «выспы» — разгалісты вяз, а пад ім звычайная драўляная лаўка. Не адну, пэўна, легенду ведаюць гэты вяз і гэтая лаўка пра «дзядзьку Якуба»: ён неаднойчы гутарыў тут з сябрамі-пісьменнікамі, вучонымі, артыстамі і іншымі шматлікімі гасцямі дома.

Расце на сядзібе і некалькі маладых дубкоў. Адзін з іх пасадзіў сам паэт. Гэты дубок ён часта называў Юркам — гэтак звалі сына паэта, што загінуў на фронце. Дубок быў відзён з акна рабочага кабінета Якуба Коласа.

Зараз у коласавым доме — музей паэта. Пры музеі жыве сястра Канстанціна Міхайлавіча Алена Міхайлаўна Лойка. Яна дагледжвае кветкі, аберагае ўсё, што звязана з памяццю брата, гутарыць з наведвальнікамі музея, апавядаючы ім пра цікавыя факты з жыцця песняра.

Усё тут — як пры жыцці Якуба Коласа. Здаецца, што зараз адчыняцца дзверы, выйдзе на ганак сам гаспадар і, абапіраючыся на кавеньку, паціху пойдзе на лаўку пад вязам...

У Беларусі нямала мясцін, звязаных з імем Якуба Коласа. Найпершая сярод іх — Мікалаеўшчына на Стаўбцоўшчыне, радзіма песняра. Тут, ва ўрочышчы Смольня, адкрыты філіял Літаратурнага музея паэта, якім загадвае пляменнік Канстанціна Міхайлавіча Уладзімір Іванавіч Міцкевіч. Леснічоўкі Ласток і Альбуць, дзе прайшлі дзіцячыя і юначыя гады паэта, адкуль бярэ пачатак ягоная песня, разам з філіялам музея ў Смольні, уваходзяць у мемарыяльны комплекс песняра.

У сваёй аўтабіяграфіі Якуб Колас пісаў: «Альбуць запомнілася мне асабліва ярка. Гэта была надзвычай прыгожая мясцінка. Сядзіба лесніка стаяла пры торнай дарозе, па якой ішлі і ехалі людзі. Шмат рознага люду перабывала ў нашай хаце. Бясконцыя захапляючыя апавяданні, размовы новых людзей пашырылі мой запас ведаў аб людзях і ўвогуле аб жыцці і далі мне багаты матэрыял для назіранняў».

І гэта сапраўды так. Калі знаёмішся з гэтымі мясцінамі, міжволі прыгадваеш коласаўскія радкі з «Новай зямлі»:

Каля пасады лесніковай  
Цягнуўся гожаю падковай  
Стары, высокі лес цяністы.  
Тут верх асіны кругалісты  
Сплятаўся з хвоямі, дубамі,  
А елкі хмурымі крыжамі  
Высока ў небе выдзяляліся,  
Таемна з хвоямі шапталіся...

Альбуць і зараз з усіх бакоў абкружана лесам, які і цяпер захапляе сваёй красой і веліччу, так тонка апетай песняром. Маляўнічыя ваколіцы Мікалаеўшчыны ўвекавечаны ў шматлікіх коласаўскіх творах — паэт быў непаўторным майстрам пейзажу. Можа і па гэтай прычыне кожнаму з нас бясконца дарагі кожны куточак гэтых святых мясцін...

Побач з філіялам музея ў Смольні шумяць высокія кучаравыя ліпы, пасаджаныя ў свой час Якубам Коласам. І калі стаіш пад імі, слухаеш іх пошум, здаецца, быццам яны хочуць штосьці сказаць, чаго не паспелі дагаварыць паэту пры жыцці.

М. ЖЫГОЦКІ,  
галоўны захавальнік фондаў  
Літаратурнага музея Якуба Коласа.

* * *

Дзяціны час!.. Я памятаю  
Зімы прыход у нашым краю.  
Стаіць над лесам шум маркотны;  
Па небе хмары, як палотны,  
Паўночны вецер рассцілае,  
І бель над далямі звісае,  
І ціха стане на падворку,  
І лес жалобную гаворку,  
Свой гоман восені канчае  
І моўчкі зіму сустракае.  
А сетка белая гусцее  
І бліжай-бліжай снегам сее.  
І вось над хатай, над гуменцам  
Сняжынкі жвавыя гуляюць,  
Садок і дворык засцілаюць  
Бялюткім, чыстым палаценцам.  
І тут у хаце не ўтрываеш:  
Кажух на плечы накідаеш,  
Бяжыш на двор, як той шалёны  
Крычыш, гукаеш здавалёны,  
Зямлі не чуеш пад сабою  
І ловіш белы пух рукою.  
Ўгару зірнеш — як рой пчаліны,  
Снуюцца ціхія пушыны,  
Угары знячэўку штурхануцца  
Глядзіш — і ў пары пабяруцца.  
— О-го-го, брат! — дзядзька  
кажа: —  
Цяпер зіма напэўна ляжа!

Я. КОЛАС, «НОВАЯ ЗЯМЛЯ».

# ТАМ, ДЗЕ ГЛЫБЛЯ І ГЛЫБЕЛЬКА...

Свіцязь, Нарач, Дрысвяты... Хто не ведае іх, гэтых славутых азёр! А ёсць сотні, нават тысячы іншых, вялікіх і маленькіх, што глядзяцца ў неба з чаротавых зараснікаў на забалочаных раўнінах і з глыбокіх катлавін лясіста-пагоркавых град узвышшаў. Беларусь — старонка лясная і азёрная, з разнастайным і багатым раўнінным і ўзгоркавым рэльефам. Значная частка яе, а менавіта паўночная, куды ўваходзіць і Мядзельшчына са славутай Нараччу, называецца Беларускім Паазер'ем.

Блакітныя азёры, пра якія нам хочацца расказаць, належаць да групы Балдукскіх азёр і знаходзяцца таксама на Мядзельшчыне, на мяжы з Пастаўскім раёнам Віцебскай вобласці. Гэта, несумненна, адзін з самых маляўнічых куткоў беларускай зямлі. Нездарма ён атрымаў такую вядомасць і стаў месцам паломніцтва шматлікіх турыстаў.

Узгорыстая, пакрытая лясамі мясцовасць са спадзістымі або крутымі схіламі ўзвышшаў, між якімі ў глыбокіх катлавінах плешчуцца Блакітныя азёры, нагадвае сабой застылыя хвалі зялёнага мора. Што ні ўзгорак, то новы раслінны свет, дзівоснае паяднанне дрэў і кустоў. На кожным грэбні лясной хвалі — гонкія, знізу цёмна-бугрыстыя, а зверху гладка-мядзяныя ствалы выносістых сосен, сярод якіх сям-там пракідаюцца такія ж гонкія бярозы і асіны; на другім, ніжэйшым, бясконца мільгацяць насупленыя і змрачнаватыя яліны ўперамешку з тымі ж асінамі і бярозамі. А між пагоркамі, у лагчынах, сапраўдная мешаніна шыракалістых і хваёвых дрэў з сакавітым пышназялёным падлескам, пад якім буяе травяністая расліннасць, імхі і папараць. Глебы тут дзярнова-падзолістыя супясчаныя і пясчаныя, а ў перападках паміж пагоркаў — дзярнова-балотныя і тарфяныя.

На гэтай узгорыстай, хвалістай зямлі, у векавых барах, што паступова пераходзяць у яловыя гушчары, якія ў сваю чаргу змяняюцца змешанымі лясамі і пералескамі, знаходзяць сабе прытулак ласі, дзікі, казулі, а таксама глушцы, цецерукі і іншыя птушкі.

Гэты казачны куток Беларусі разам з азёрамі ў верхняй частцы басейна ракі Страча, правага прытоку Віліі, пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 30 чэрвеня 1972 года аб'яўлены дзяржаўным заказнікам. Гэта азначае, што і азёры, і навакольныя лясы будуць ахоўвацца ад празмернай «апекі» іх чалавекам. На тэрыторыі заказніка забараняецца: рабіць суцэльныя высечкі лесу, пасвіць жывёлу, праводзіць гідрамеліярацыйныя і іншыя работы, скідваць сцёкавыя воды і розныя бытавыя адкіды, ставіць і мыць аўтамашыны, разбіваць турысцкія лагеры і раскладваць вогнішчы, рабіць розныя збудаванні, браць з азёр ваду для гаспадарчых патрэб, чысціць азёры і прарэджваць прыбярэжную расліннасць, карыстацца на азёрах маторнымі лодкамі, паляваць на звяроў і птушак. Лавіць рыбу ў азёрах заказніка можна толькі з дазволу Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў рэспублікі па ахове прыроды.

Нагляд і кантроль за станам і рэжымам заказніка будзе ажыццяўляць Дзяржаўны камітэт СМ БССР па ахове прыроды і Мядзельскі раённы выканаўчы камітэт дэпутатаў працоўных.

Тэрыторыю заказніка складаюць 19 кварталаў Канстанцінаўскага лясніцтва. 1447,2 гектара яе займаюць лясы, 176,5 гектара — балоты, сенажаці, дарогі і палеткі (апошніх усяго толькі 0,9 гектара). Астатняя плошча — пад вадой. 82,4 гектара прыходзіцца на долю азёр і рэк Страча і Лынтупка, 69 гектараў займаюць сажалкі мясцовага рыбгаса.

Азёры заказніка можна ўмоўна падзяліць на дзве групы, якія ляжаць у глыбокіх катлавінах па абодва бакі высокай лясістай грады, што праходзіць з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Асабліва маляўнічыя азёры паўднёва-заходняй групы. Самае большае з іх — Глыбля, катлавіна якога выцягнулася з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад на 1,1 кіламетра. Шырыня возера — 0,4—0,5 кіламетра, глыбіня — да 30 метраў. Вада ў возеры вельмі чыстая і, асабліва ля берагоў, да якіх з усіх бакоў падступае хваёвы лес, здаецца зялёнай, калі глядзець зблізку. Але варта падняцца на пагорак, як возера адразу ж мяняе колер, пераліваючыся пяшчотным, як сакавіцкае неба, блакітам: дно вадаёма ўслана карбанатнымі сапрапелямі — глеістым адкладаннем перагнілых рэштак раслін і жывёл. Пэўна, адсюль і пайшла назва — Блакітныя азёры.

Побач, крыху на паўднёвы ўсход ад Глыблі, злучаючыся з ёй пратокай, у невялікай, але глыбокай катлавіне ляжыць амаль круглае, з вузкім астраўком пасярэдзіне азярцо Вялікая Глыбелька (ёсць яшчэ і Малая Глыбелька), дно якога таксама ўслана карбанатнымі і тонкадэтрытавымі сапрапелямі. Плошча яго 0,09 квадратнага кіламетра, глыбіня дасягае 30 і больш метраў. Незвычайна прыгожым выглядае яно здалёк, з вышыні — у светла-зялёнай рамцы чароту, што кантрасна вылучаецца на фоне цёмна-мядзяных ствалоў сасновага бору, які ўзнімаецца па стромкім схіле грады.

Нельга не сказаць і яшчэ пра адно азярцо, якое ляжыць на палянцы, акружанай яловым лесам, таксама ля паднюжжа грады, у нейкай сотні метраў на поўнач ад Глыблі. З зеленавата-чорнай вадой і круглымі зялёнымі лістамі белых гарлачыкаў ля берагоў, яно не сінее здалёк і нечакана адкрываецца вачам, калі да яго застаецца ўсяго некалькі крокаў. Гэта — Лясная казка. Невялікае круглае азярцо з травяністымі берагамі, парослымі асакой і чаротам. Невялікае, але глыбокае, нібы калодзеж.

За перавалам, уздоўж паўночна-ўсходняга схілу грады, на лясістай раўніне, па якой працякае Страча, выцягнулася возера Балдук, вакол якога групуецца некалькі драбнейшых. Даўжыня Балдука — 2 кіламетры, сярэдняя шырыня каля 400 метраў, а глыбіня — больш чым 40 метраў.

Усяго на тэрыторыі азёрна-ландшафтнага заказніка «Блакітныя азёры»—14 вадаёмаў, у якіх водзяцца акунь, плотка, шчупак, верхаводка і іншая рыба. А пра тое, што ў лясах вакол Блакітных азёр растуць грыбы, розныя лясныя ягады, арэхі, і гаварыць, мусіць, не варта.

Чароўнай прыродай гэтага маляўнічага кутка роднага краю можна любавацца бясконца ў любую пару дня і года. Асабліва азёрамі. Азёры... Гэта і люстэркі неба, і вочы зямлі. Як толькі іх ні называюць паэты! У неба і азёр, безумоўна, існуюць нейкія адносіны, нейкая ўзаемасувязь, мо не зусім зразумелая нам. Калі неба бясхмарнае, блакітнае, такія ж і азёры: лагодныя, светлыя. Калі ж неба пачне хмурыцца — азёры таксама пацямнеюць. А калі на небе шугае вечаровая ці ранішняя зара чырванню ўсіх адценняў, кідаючы залатыя водбліскі на белыя кучавыя хмурынкі, што нерухома застынуць на захадзе ці ўсходзе,— тады ўсімі колерамі неба зіхацяць і азёры. Срэбна-залацістыя і агністыя блікі ўперамешку з ценямі бягуць, гайдаючыся на хвалях і раз-пораз знікаючы, як агні гарадскіх рэклам. А Блакітныя азёры, у адрозненне ад іншых, адсвечваюць яшчэ і невыказна чыстым блакітам...

Восенню дрэвы афарбоўваюць сваю пабляклую і пашкуматаную ветрам лістоту ў залаціста-пурпурныя колеры: ад бура-мядзянага да ярка-барвовага. І ўсё гэта багацце золата і чырвані, якое зіхаціць каляровымі агнямі паміж пацямнелай зеляніны ельнікаў і хвойнікаў, адлюстроўваецца ў блакітна-празрыстай вадзе азёр.

Незабыўнае ўражанне марэнна-ўзгорысты рэльеф гэтых мясцін робіць і ў пачатку зімы, калі першы прымаразак тонкай этыленавай плёнкай зацягне нерухомую роўнядзь азёр, а іней аздобіць пушыстаю срэбнаю гліцай кожную галінку на дрэве.

Край Блакітных азёр, бадай, самы цікавы па сваёй прыроднай унікальнасці і непаўторны па сваёй прыгажосці ва ўсім Беларускім Паазер'і. Вось чаму гэты азёрна-ландшафтны прыродны комплекс аб'яўлены дзяржаўным заказнікам. Гэта гарантыя таго, што і наступныя пакаленні, якія прыйдуць за намі, знойдуць гэты чароўны куточак такім, якім захаваем і пакінем яго мы.

Я. МІКЛАШЭЎСКІ,
спец. кар. «Роднай прыроды».

2 Зак. 1175







Мінула і восень. Не толькі бабіна лета з вохрай і барваю лісця ў гаях і прысадах, але і асенняя непагадзь — дажджы. Зацяжныя, нудныя, ад якіх яшчэ больш пачарнелі кусты і дрэвы. А калі між хмар, што нізка звіслі над апусцелай зямлёй, паказвалася сонца — яно ўжо не грэла, а свяціла журботна і ярка, слізгаючыся касымі промнямі па падмерзлай і заінелай зямлі.

Зямля яшчэ адтавала — і была слізкая і бліскучая. Тонкі лядок, што зранку зацягваў лужыны на дарогах, патрушчаны коламі машын і іншага сучаснага і дзедаўскага транспарту, ляжаў у калдобінах і каляінах, як шкло, што выпала з рамы і рассыпалася на друзкі.

Злева ад дарогі зелянела азіміна, а справа пачынаўся пералесак. Зрэдку стаялі, звесіўшы тонкае і празрыстае вецце, бярозы, далей цямнелі раскіданыя кроны разгалістых сосен. Лес быў наперадзе. Але колькі ні прайшоў бы па гэтай дарозе, што губляецца ў ім, не ўбачыў бы ніводнай жывой істоты, не пачуў бы ніводнага гуку і шолаху.

Надышоў дзень, і сонца, асвяціўшы на момант ранішнюю зямлю, схавалася ў хвалях густога шэрага туману, што непрыкметна зацягнуў неба. У паветры закружыліся першыя лёгкія сняжынкі. Потым нечакана сцямнела — і буйнымі густымі суквеццямі паваліў снег. Ён ішоў усю ноч, і праяснілася толькі пад раніцу. Непазнавальна змяніўся лес. Прысыпанае «шапкамі» снегу, да зямлі нахілілася голле ялін і сосен. І доўга было чуваць, як з ціхім шорганнем то тут, то там падаюць яны з галля на дол. Але паступова ўсё сціхла. І лягла навакол цішыня. Не на дзень, не на два, а на некалькі месяцаў. Але гэтая цішыня ўяўная. Калі прыглядзецца больш уважліва, то на белым і чыстым снезе можна заўважыць незвычайныя ўзоры — шматлікія сляды лясных птушак, што засталіся зімаваць у лесе або прыляцелі сюды з поўначы. А колькі слядоў пакідаюць на свежым снезе іншыя насельнікі лесу: дзікі і ласі, ваўкі і лісы, зайцы і вавёркі! І той, хто прачытае гэтыя іерогліфы, пакінутыя на снезе ляснымі жыхарамі, даведаецца не толькі пра іх, але і пра тыя драмы і трагедыі, якія адбываюцца штодзень у маўклівым і безжыццёвым на першы погляд лесе.

**Фота К. ЯКУБОВІЧА, М. ШАРАЯ, Г. ГУЛЕУСКАГА.**

## СССР — 50 ГОД



# ЭНГУРСКІ ПТУШЫНЫ ЗАПАВЕДНІК

На заходнім узбярэжжы Рыжскага залів ў акаймаванні лясоў ляжыць возера Энгура. Возера гэтае, па велічыні шостае ў Латвіі (35 квадратных кіламетраў), з'яўляецца утварэннем Літарынавага мора. У сярэднім глыбіня яго не перавышае 1 метра, максімальная глыбіня — не больш 2 метраў, на значных жа ўчастках глыбіня толькі 10—20 сантыметраў. Засушлівым летам у гэтых мясцінах лужыны глыбінёй у некалькі сантыметраў чаргуюцца з сухімі падушкамі харавых водарасцяў, пад якімі ляжыць слой глею таўшчынёй да 3—4 метраў. У выніку інтэнсіўнага зарастання за апошнія 50 гадоў плошча возера зменшылася прыкладна на 9 квадратных кіламетраў. Зараз больш 15 працэнтаў плошчы возера займаюць зараснікі трыснягу, рагозу вузкалістага, чароту, плюшчаю і хвашчу. Поруч з зарослымі асакой астраўкамі і забалочанымі ўчасткамі ўзбярэжжа гэтыя зараснікі служаць месцамі гнездавання для многіх тысяч вадаплаўных птушак.

У апошнія дзесяцігоддзі амаль ва ўсім свеце назіраецца катастрафічнае змяншэнне колькасці вадаплаўнай птушкі. Асноўная прычына гэтага — інтэнсіўная меліярацыя і асваенне для гаспадарчых патрэб забалочаных земляў і вадаёмаў. Менавіта таму значэнне возера Энгура і падобных да яго вадаёмаў у справе зберажэння вадаплаўных птушак цяжка пераацаніць. Пастановай Савета Міністраў Латвійскай ССР № 219 ад 24 красавіка 1957 года і № 695 ад 10 снежня 1964 года на пэўнай частцы возера Энгура круглы год забаронена ўсялякая гаспадарчая дзейнасць і знаходжанне людзей. На іншых участках возера такія абмежаванні дзейнічаюць у перыяд гнездавання — з пачатку раставання лёду да 31 ліпеня. Гэтая сістэма заказнікаў рознага прызначэння і стала вядома пад назвай Энгурская птушыная запаведніка. Вялікае значэнне возера Энгура пацверджана і ў толькі што падрыхтаванай міжнароднай канвенцыі аб захаванні вадаёмаў, асабліва важных для вадаплаўнай птушкі (возера ўнесена ў спіс вадаёмаў катэгорыі «Б» гэтай канвенцыі).

З усіх азёр Латвіі возера Энгура насяляе найбольш багатая і разнастайная фауна птушак. Усяго на гэтым возеры гняздуецца каля 80 відаў птушак. На гнездаванні тут зафіксаваны амаль усе віды птушак з гусепадобных, чайкавых, паганак і кулікоў, якія ўвогуле гняздуюцца ў Латвіі.

Штогод на возеры гняздуецца каля 20 пар лебедзя-шыпуна, да 200 пар крыжанкі, 300—400 пар чырвонагаловага нырца, 120—200 пар чубатай чэрнеці, 100—150 пар чырка-траскунца, каля 50 пар шыраканоскі, да 12 тысяч пар азёрнай чайкі, да 600 пар чорнай крачкі, 300 пар рачной крачкі, 300—400 пар малой чайкі, 20—30 пар шызай чайкі, 300 пар чомгі, 50 пар рагатай паганкі, 1000—1700 пар лысухі, каля 40 пар вялікага вераценніка і шмат іншай птушкі. Асабліва разнастайнай становіцца фауна птушак у часе вясновых і асенніх пералётаў, калі на возеры і яго ўзбярэжжы можна бачыць усе віды птушак, якія толькі сустракаюцца ў Латвіі.

Птушкі возера Энгура прыцягвалі ўвагу арнітолагаў ужо ў пачатку цяперашняга стагоддзя. Значнае развіццё арнітлагічных даследванняў пачалося з 1958 года, калі на возеры была створана арнітлагічная база Інстытута біялогіі АН Латвійскай ССР. Дзякуючы менавіта гэтай базе возера стала асноўным стацыянарам Латвіі і набыло папулярнасць сярод арнітолагаў і работнікаў аховы прыроды як у СССР, так і за мяжой.

...Людзі на зямлі не адны. Разам з намі жыве мноства жывых істот — непаўторных стварэнняў эвалюцыі. Наша задача — клапаціцца аб тым, каб мнагастайнасць нашых сужыцеляў па планеце Зямля не зменшылася, каб нашы ўнукі і праўнукі атрымалі ў спадчыну не збедненую прыроду, а прыроду ва ўсёй яе разнастайнасці і багацці. Але для гэтага трэба ведаць прыроду, што ў канечным выніку і з'яўляецца мэтай даследванняў, якія праводзяцца латвійскімі арнітолагамі на возеры Энгура.

Я. ВІКСНЕ,
кандыдат біялагічных навук.

# КІХНУ — ДАЛЁКІ І БЛІЗКІ

У порт я трапіў на гадзіну раней прызначанага часу. «Кайяк», невялікае судна, з замацаваным на палубе пад'ёмным кранам, стаяла ў канцы прычалаў, у самым вусці ракі Пярну.

У адзінага на палубе паўнаватага, у майцы, мужчыны я спытаў, дзе можна бачыць капітана.

— Я і ёсць капітан Оад,— адказаў мужчына.

Працягваю рэкамендацыйнае пісьмо. Адказ атрымліваю кароткі і ясны: «У 16 гадзін роўна — адыход».

З глыбіні порта пад'язджае машына, нагружаная скрынкамі са свежай салакай. Бачна, як свецяцца белыя брушкі яшчэ жывых рыбак, як пераліваюцца шызай сінявой іх спінкі.

Раптам на вачах ва ўсіх адбываецца бесцырымоннае нахабства: напад на свежы ўлоў. Чайкі! Праз якую хвіліну іх ужо добрая сотня. Адны яшчэ толькі пікіруюць, другія ўжо на ляту глытаюць схопленую з тары здабычу. Круты віраж, і зноў піке на кузаў. Узняты гвалт літаральна глушыць, хочацца бегчы прэч.

З прахадной выбягаюць шафёр, вахцёр і пачынаюць пляскаць у далоні. «Апладысменты» дасягаюць свайго. Чайкі, зрабіўшы яшчэ некалькі агрэсіўных кругоў, з неахвотай пакідаюць акваторыю порта, адлятаючы некуды на поўнач, за горад. Апошні, падхоплены ветрам, іх крык нагадаў мне назву нашага судна: Кай-як! Кай-як!

Потым я даведаўся, што «кайяк» у перакладзе з эстонскага азначае «чайка».

Паўсотні кіламетраў — і на гарызонце паказаўся востраў Кіхну. Знаёмства з ім лепш за ўсё пачаць з... гасцініцы. Яна свая, калгасная. А будавалі яе па праекту дырэктара Пярнскага краязнаўчага музея Омара Вольмера. Аднапавярховы, арыгінальнай канструкцыі будынак добра ўпісаўся ў пясчаны пагорак, парослы соснамі. Шалёўка — пад колер сасны, сцены абшыты непафарбаванымі заластымі, пад саломку, дошчачкамі. У гасцініцы дванаццаць нумароў, дзве залы, кафэ.

Востраў Кіхну ўсяго тры з палавінай кіламетры шырыні, даўжыня — сем. На ім размешчана сем вёсачак, славуты Кіхнуўскі маяк, пастаўлены больш стагоддзя таму назад. Ёсць на Кіхну і свой мініяцюрны аэрадромчык. Ляціш на маленькім самалёце і бачыш: тарпедуюць немаведама каго і што балтыйскія дэльфіны, забрылі далёка ў мора, прыкладна, на пару кіламетраў, каровы...

* * *

У кабінеце старшыні калгаса Аўгуста Вільямавіча Карына на стале, як сімвалы асноўнай дзейнасці гаспадаркі, стаяць кансервавыя бляшанкі з этыкеткамі «Салака», «Кілька».

Рыхтуюць, напаўняюць гэтыя бляшанкі ў сваім жа цэху. На этыкетках — адрас: Пярнскі раён, калгас «Савецкі партызан».

Аўгуст Вільямавіч і яго намеснік Ян Вальм гавораць:

— Перадавікі? Вядома, ёсць. Капітан Оад, так, так, той самы, з якім вы плылі на Кіхну. Герой Сацыялістычнай Працы. Рыбак Іван Палу ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, яго брат — Цімафей Палу — заслужаны рыбак Эстоніі.

І тут высвятляецца яшчэ адна дэталь. Аказваецца, паміж востравам Кіхну і Мінскам існуе прамая сувязь. Наладжана яна даўно. З Пярну, дзе размешчаны калгасны гараж, кіхнуўцы на машынах дастаўляюць дары мора прама ў беларускую сталіцу.

Вы, напэўна, частаваліся свежавэнджанай салакай? Магчыма, яна была з вострава Кіхну, такога далёкага і такога блізкага. Там шумяць сосны, ляжаць валуны, а жанчыны нават на працу ходзяць у расшытых узорамі спадніцах.

Л. ПРАКОПЧЫК.

# КАМЕННІ, ГОРЫ, ВАДА

Арменію называюць краінаю гор, сонца і патухлых вулканаў. Менавіта тут можна сустрэць амаль усе ландшафты Савецкага Саюза — ад пустынь да вечных снягоў. Тут убачым мы лававыя плато і старадаўнія вулканы, залацістазялёныя горныя лугі і вінаграднікі, змрочныя букавыя лясы і чароўнае возера Севан.

Арменія ляжыць на той жа геаграфічнай шыраце, што і Іспанія, Італія і Грэцыя, гэта значыць, у зоне субтропікаў. Летам у далінах тут спёка, як у тропіках, у той час як на вяршынях гор здараюцца маразы і выпадае снег.

Прырода краю спалучае ў сабе суровасць і пяшчотнасць. Летняя гарачыня і зімовая сцюжа, вострыя рэбры скал і бурныя рэкі, сонечнасць далін і змрочнасць бяздонных цяснін, зеляніна лясоў і пустыннасць горных вяршынь.

Суровыя і каменні Арменіі. Яна насычана імі. Каменні «растуць» у полі і на гарадскіх вуліцах, грозна нявісаюць над дарогамі. Каменні спакон веку супраціўляюцца чалавеку. Таму адваяваная ў іх зямля тройчы даражэйшая для яго, чым зямля шчодрых далін.

Гэта — адна Арменія. Але ёсць і другая — краіна цудоўных гор, цяністых лясных узлобкаў, вечных крыніц, пышных лугоў.

На вачах цывілізаванага свету ледзь не закрылася кніга гісторыі аднаго са старажытнейшых культурных народаў — армянскага. Частыя набегі чужаземцаў, шматвяковы прыгнёт туркаў і персаў прывялі народ Арменіі амаль на грань фізічнага знішчэння. Аднак знайшлася сіла, якая вярнула да жыцця армянскі народ. Сіла гэтая — Савецкая ўлада, атрымаўшая перамогу ў Арменіі...

На ўсходзе Араратскай даліны, на вышыні 2000 метраў, размешчаны адзін з прыгажэйшых прыродных раёнаў рэспублікі — замкнутая горная катлавіна, на дне якой ляжыць возера Севан, або, як называлі яго ў мінулым, Гегамскае мора. Севан — жамчужына Арменіі. Гэты цуд прыроды заўсёды прыцягваў увагу чалавека. Тут продкі армян здабывалі золата — сляды іх работы і цяпер можна ўбачыць у вярхоўях ракі Масрыка. Севан — адно з буйнейшых высакагорных азёр Савецкага Саюза. Яго плошча — 4891 квадратны кіламетр. Возера складаецца з двух басейнаў — Вялікага і Малога Севана. Максімальная даўжыня яго — 72, шырыня — 37 кіламетраў, а глыбіня — 99 метраў.

Да рэвалюцыі прыродныя багацці краю нямшчадна рабаваліся. Амаль паўсюдна былі знішчаны лясы і паляўніча-прамысловая дзейнасць. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады быў праведзены шэраг мерапрыемстваў па ахове прыроды Арменіі, па ўзнаўленню яе расліннага і жывёльнага свету.

Значную ролю ў ахове і аднаўленні прыроды краю маюць Дзіліжанскі, Шыакаохскі і Гарнійскі запаведнікі, а таксама шэраг заказнікаў. Пад асаблівым наглядам знаходзяцца тут рэдкія жывёлы: забаронена паляванне на безаравага казла, муфлона, плямістага аленя. Многія віды звяроў, птушак і рыб знайшлі ў Арменіі другую радзіму — тут акліматызаваны янот, нутрыя, сіг, высакагорны алень і іншыя.

# СЯБАР ЧАЛАВЕКА — ЭЎКАЛІПТ

Выпадковая археалагічная знаходка «спячай прыгажуні» — «Фанчулы», муміі дзяўчынкі з антычнага Рыма, выклікала сусветную сенсацыю. Але пракурор г. Рыма быў вельмі ўсхваляваны і супакоіўся толькі пасля таго, як даведаўся, што дзяўчынка памерла 18 стагоддзяў назад...

Вучоныя Італіі мяркуюць, што пры бальзаміраванні дзяўчынкі галоўным кампанентам у саставе рэчываў было эфірнае масла, якое атрымалі з эўкаліпта. Аднак 18 стагоддзяў назад эўкаліпты не ўпрыгожвалі Афрыку і Еўропу. Як жа трапіла эўкаліптавае натуральнае масла да антычных бальзаміроўшчыкаў? Гэтая тайна яшчэ не раскрыта. Відаць, старажытныя афрыканцы мелі марскія сувязі з далёкай Аўстраліяй — радзімай эўкаліпта...

У сучаснай медыцыне эўкаліптавае масла, прэпараты, а таксама лекавыя формы з лісця эўкаліпта шырока ўжываюцца для лячэння бронха-лёгачных захворванняў. Ужываюцца яны як рэчывы, якія загойваюць раны ў гнойнай хірургіі, і пры гіпертанічнай хваробе.

Высушанае і скручанае лісце эўкаліпта кураць, як тытунь, яно ўжываецца як пераджальны сродак супроць задышкі, хвароб горла і іншых захворванняў.

У залежнасці ад свайго саставу эўкаліптавае масла шырока ўжываецца і ў розных галінах прамысловасці, у першую чаргу ў парфумнай і харчовай.

Эўкаліпты азануюць і ачышчаюць паветра. Іх карнявая сістэма паглынае з глебы вялікую колькасць вільгаці і недарма эўкаліпт заслужыў назву — «дрэва — насос».

У 1872 годзе вядомы грузінскі вучоны-фізіёлаг Іван Тархнішвілі першы паведаміў Каўказскаму медыцынскаму таварыству пра акліматызацыю эўкаліпта ў Калхідзе і адзначыў яго карысныя якасці.

Грузінскі ўрач і вядомы вучоны П. Мерабішвілі, які працаваў у Эфіопіі, таксама садзейнічаў развядзенню эўкаліпта і яго выкарыстанню ў медыцыне.

Першая заметка аб эўкаліпце была надрукавана ў Пецярбурзе ў 1874 годзе. Першыя эўкаліпты з'явіліся ў Нікіцкім батанічным садзе ў 1816 годзе, у Сухумі — у 1868 г., у Батумі — у 1882 г., у Сочы — у 1891 г.

Доследы па развядзенню эўкаліпта праводзіліся ў Тбіліскім батанічным садзе з 1862 г.

У прамысловых маштабах закладкі эўкаліпта ў Грузіі былі зроблены толькі ў гады Савецкай улады. Цяпер у Грузіі сустракаецца амаль 35 відаў эўкаліпта.

У спецыяльнай і навукова-папулярнай літаратуры існавала памылковае меркаванне, што дрэвы некаторых відаў эўкаліпта дасягаюць 150—160 метраў вышыні. Прафесар М. К. Дараселія, які нядаўна прыехаў з Аўстраліі, сцвярджае, што самым высокім там лічыцца эўкаліпт «ростам» да 97 метраў. Урад штата Вікторыя нават устанавіў прэмію таму, хто знойдзе эўкаліпт вышэй за 100 метраў, але дагэтуль гэта прэмія яшчэ нікому не ўручана. На нашым Чарнаморскім узбярэжжы вышыня эўкаліпта дасягае 45 метраў.

В. ЦУЛЕЙСКІРЫ.

Чай — смарагдавыя плантацыі Грузіі.



# ТУТ МЫ ЖЫВЁМ

Што і казаць: зараз ніхто не аспрэчвае закона аб ахове прыроды, аднак строгага выканання прыродаахоўных правіл і норм прытрымліваюцца, на жаль, не ўсюды. І таму вопыт тых, хто першым зразумеў усю важнасць пытанняў аховы прыроды і пачаў паўсядзённа, без скідак на патрэбы бягучага дня, берагчы яе багацці і прыгажосць, сёння служыць добрым прыкладам для іншых.

Менавіта такімі дбайнымі гаспадарамі зарэкамендавалі сябе прыродалюбы Аршанскага ордэна Леніна льнокамбіната. Членаў таварыства тут звыш чатырох тысяч чалавек. Савет аховы прыроды ўзначальвае Мікалай Феафілавіч Бяляўскі.

...Вы шпацыравалі калі-небудзь летам у Оршы па праспекце Тэкстыльшчыкаў, бачылі, колькі там кветак? Яны ўздоўж тратуараў, у дварах, на падаконніках кватэр.

— Мы маем сваю цяпліцу,— гаворыць Алена Аляксандраўна Марцюкова (яна адказвае за кветкавую гаспадарку).— Насенне і расаду без абмежавання даем усім, хто жадае. Цікавая рэч: варта аднаму каму-небудзь захапіцца кветкамі, як тут жа з яго бярэ прыклад сусед, які, напэўна, разважае так: «А чым мы горшыя?» У тэкстыльшчыкаў стала звычайнай з'явай азеляненне балконаў і сцен паўзучымі раслінамі.

Цяпер на камбінаце без кветак не праходзіць ні адно свята, ні адна ўрачыстасць. Юбілей ветэрана, дзень нараджэння ткачыхі — прыгожы і пышны букет свежых кветак заўсёды пад рукой.

У пасляваенныя гады на тэрыторыі камбіната расло некалькі дрэў. Яна была амаль пусткай. Цяпер тут — сапраўдны парк. Тонуць у зеляніне жылыя дамы, прамысловая зона, стадыёны і бальніца, дзіцячыя сады і яслі, абсаджана чыгуначная ветка. На 49 гектарах раскінуўся парк Тэкстыльшчыкаў, 1200 пладовых дрэў пасаджана ў піянерскім лагеры. Закладзены новы парк на левым беразе ракі. Дагледжана і загарадная лясная зона адпачынку.

Калі хто-небудзь пытае ў тэкстыльшчыкаў, як гэта іх на ўсё выстрачае, дык чуе ў адказ:

— А як жа інакш? Мы ж тут жывём!

Праўда, пры закладцы новых паркаў і сквераў хацелася б бачыць больш густу і мастацкага падыходу. Прамалінейнасць алей, адсутнасць куртынных пасадак зніжаюць агульнае ўражанне. Але галоўнае — зроблена. Незлічоная колькасць ліп, таполяў, ясеняў, вязаў, тут жа аксаміт амурскі, туя, сасна веймутава, дзікія яблыні, рабіна выраслі, зашумелі, узнеслі свае гордыя кроны, нібы спяваючы славу чалавеку-працаўніку. Бо менавіта ён, чалавек-працаўнік, і праяўляе найбольшы клопат аб зберажэнні багаццяў роднай зямлі.

Усе, з кім мне давялося размаўляць на камбінаце, раілі сустрэцца з Раманенкавым. Васіль Паўлавіч — на самым гарачым участку: кіруе секцыяй аховы вод і рыбных запасаў. Ачышчальныя ўстаноўкі камбіната дзейнічаюць спраўна, хоць і з перагрузкай: да іх падключаны суседнія прамысловыя прадпрыемствы. А як жа інакш? «Чужых» сцёкаў не бывае, ёсць магчымасць — дапамажы. Так што з аховай вод асабліва вострых праблем не паўстае. А вось з парушальнікамі рыбалоўных законаў дыпламатычныя адносіны парваны раз і назаўсёды. Браканьеры даўно зразумелі: калі ў маторцы людзі Раманенкава — літасці не будзе. Сеткі і ўсе іншыя прылады канфіскуюцца і здаюцца на Віцебскі рыбазавод, штраф за кожную каштоўную рыбіну таксама не міне аматараў дармовай спажывы.

Напрыклад, раней на Дняпры ў раёне Дуброўна прыцемкамі можна было пабачыць ліхтары браканьераў. Цяпер там цішы-

# ТРЫ МІЛЬЁНЫ ПАДАРОЖНІКАЎ

ТУРЫСЦКІ ГОД: СЁЛЕТНІ І БУДУЧЫ

Савецкая Беларусь з яе сённяшняй казачнай явай, з яе гераічнай гісторыяй прыцягвае да сябе тысячы і тысячы людзей. Асабліва шматлюднымі былі і застаюцца дарогі рэспублікі ў гэтым годзе — годзе пяцідзесятых угодкаў СССР.

З поўнай нагрузкай працавалі турысцкія базы «Возера Нарач», «Беларусь» (Заслаўскае вадасховішча), «Белае возера» (лясы Мяднянскага лясніцтва), «Сож» пад Гомелем, «Высокі бераг» на Нёмане. Акрамя гэтага, да паслуг падарожнікаў і турыстаў былі камфартабельныя гасцініцы «Беларусь» у Брэсце, «Турыст» у Мінску, Брэсцкі кэмпінг.

На турбазах па 12-дзённых пуцёўках адпачыла звыш 50 тысяч чалавек. Яшчэ столькі ж карысталіся гасцініцамі і кэмпінгамі, толькі больш кароткі час.

Добрыя магчымасці для знаёмства з дасягненнямі рэспублікі ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, з яе прыродай і помнікамі гісторыі і культуры давалі ўсесаюзныя маршруты Брэст — Мінск — возера Нарач — Вільнюс; турбаза «Беларусь» — возера Нарач — Браслаўскія азёры і іншыя. У цудоўных мясцінах Беларусі правялі свае водпускі рабочыя і служачыя Масквы, Ленінграда, Чалябінска, Ташкента, Кіева...

Чыстае, настоенае на травах і хваёвым водары паветра, блакітныя люстэркі шматлікіх азёр, маляўнічыя далягляды, ветлівасць і сардэчнасць нашых людзей — усё стварала для нашых гасцей атмасферу цудоўнага адпачынку. Кнігі водгукаў і пажаданняў на турбазах запоўнены ў асноўным аднымі падзякамі. Сярод іх найбольш такіх: «Мы ў захапленні ад беларускіх дуброў, азёр і рэк! Дзякуем за выдатную магчымасць пабываць на гэтай дзівоснай зямлі!».

Улічваючы абмежаваную (на жаль, пакуль што абмежаваную) колькасць месц на турбазах і ўсё ўзрастаючую цікавасць насельніцтва да падарожжаў, Беларускі рэспубліканскі савет па турызму і экскурсіях стварыў ва ўсіх абласных цэнтрах бюро падарожжаў і экскурсій, а ў гарадах Полацку, Оршы, Барысаве, Маладзечне, Бабруйску, Горках, Салігорску, Баранавічах, Лідзе і Светлагорску — экскурсійныя бюро.

Асноўная задача ўсіх экскурсійных бюро — арганізацыя падарожжаў у цягніках, аўтобусах, самалётах, цеплаходах. Кірункі і маршруты гэтых падарожжаў — самыя розныя. Сёлета, напрыклад, было сфармавана звыш 80 турысцкіх цягнікоў, кожны з якіх браў «на борт» каля 400 чалавек. Беларусы, прадстаўнікі самых розных пластоў насельніцтва, пабывалі на іх у Сярэдняй Азіі, Прыбалтыцы, на Украіне і г. д.

Турысцкія арганізацыі Мінскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей фрахтавалі для падарожжаў марскія і рачныя цеплаходы па лініях Масква — Астрахань — Масква — Перм, Адэса — Батумі, Мазыр — Кіеў — Херсон — Мазыр.

Найбольш шырока практыкаваліся аўтобусныя паездкі. Менавіта дзякуючы аўтобусам, сельскае насельніцтва рэспублікі мела магчымасць наведаць сталіцу Беларусі Мінск і абласныя цэнтры, пабываць у музеях і тэатрах, на ВДНГ, буйных прамысловых прадпрыемствах, прысутнічаць на святах у Палацы спорту.

Каля трох мільёнаў экскурсантаў абслужылі ў гэтым годзе нашы бюро. Найбольш папулярныя маршруты вялі ў Хатынь, на Курган Славы, у Брэсцкую крэпасць-герой і Белавежскую пушчу.

Рэспубліканскі і абласныя саветы па турызму і экскурсіях многа ўвагі аддаюць развіццю самадзейнага турызму, праяўляюць клопаты аб грамадскіх гарадскіх і сельскіх клубах турыстаў, трымаюць у полі зроку каля 6 тысяч секцый у калектывах фізкультуры.

Асаблівай папулярнасцю сярод моладзі карыстаюцца паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Сёлета ў іх удзельнічала 1 мільён 600 тысяч

ня. На 150 кіламетраў уверх і ўніз ад Оршы па цячэнню Дняпра — зона спакою для рыбы. Ахоўваюцца і тры возеры: Арэхаўскае, Дзевінскае і Рыбінскае.

Восем чалавек — бліжэйшых памочнікаў Раманенкава, у тым ліку і яго семнаццацігадовы сын Алег, штодзень па графіку (о, каб яго ведалі парушальнікі!) у садружнасці з інспектарам Белрыбвода сочаць за парадкам. Вынікі? Браканьерства за апошнія гады скарацілася ледзь не ўтрая.

Нялёгка, адпрацаваўшы змену, ісці на раку. Іншы раз ноччу, у непагадзь. Часам і прастуда падпільнуе, а то з якім-небудзь упартым браканьерам і загрудкі схапіцца давядзецца. Усякае здараецца.

«Ну і што? — можа сказаць іншы скептык.— На кожным прадпрыемстве знойдуцца такія энтузіясты».

Уся справа якраз у тым, што на Аршанскім ільнокамбінаце «эпоха» асобных энтузіястаў даўно мінула. Мы пазнаёмілі чытача толькі з некаторымі актывістамі, а за іх плячыма — сотні памочнікаў. На камбінаце дзейнічаюць яшчэ і секцыі па ахове флоры і фауны, зямлі, лесу. Добра пастаўлена работа з юнымі натуралістамі. На належным узроўні агітацыя і прапаганда: чытаюцца тэматычныя лекцыі, дэманструюцца спецыяльна падабраныя кінафільмы, афармляюцца стэнды і вітрыны. Шырока практыкуюцца суботнікі і нядзельнікі.

З боку партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый — поўнае разуменне і падтрымка. Дырэкцыя не шкадуе сродкаў на прыродаўзнаўленчыя і аздараўляльныя мерапрыемствы. Штогод адпускаецца дзесяткі тысяч рублёў.

Асабліва значных поспехаў дабіліся прыродалюбы Аршанскага ардэнаноснага камбіната ў юбілейным годзе. У гонар 50-годдзя ўтварэння СССР пасаджаны новы парк, сады. Усяго пасаджана 1,3 тысячы дэкаратыўных дрэў, 25 тысяч кустоў, мноства кветак, два гектары газонаў і г. д. І ці трэба гаварыць, што ўсё гэта абернецца здароўем працоўных, добрым настроем людзей, нарэшце, іх лепшай працаздольнасцю. Нездарма Аршанскі ордэна Леніна льнокамбінат — адно з лепшых прадпрыемстваў краіны і па культуры вытворчасці, і па сваіх працоўных паказчыках.

Д. ВЕТРАЎ.

---

чалавек. Паходы — выдатная школа патрыятычнага выхавання юнакоў і дзяўчат.

1 мільён 600 тысяч... Гэта — амаль чвэрць насельніцтва рэспублікі. Лічба не можа не радаваць. Аднак не магу не сказаць і пра іншае. Уяўляю, як сёй-той, пачуўшы гэтую лічбу, скрывіцца: «Колькі ж яны зглумілі дрэўцаў, колькі рознага смецця і бруду пакінулі на берагах рэк і азёр!» Падобныя папрокі і абвінавачванні ў адрас турыстаў можна чуць часта: маўляў, яны паводзяць сябе кепска, адносяцца да прыроды з жорсткасцю. Скажу з поўнай адказнасцю: сапраўдныя турысты да гэтых папрокаў і абвінавачванняў не маюць ніякага дачынення. Гаворка павінна ісці, відаць, пра так званых «дзікуноў», якія нам, турысцкім арганізацыям, не падуладны. Перад усімі турысцкімі клубамі, секцыямі і шырокай грамадскасцю стаіць задача: аб'яднаць намаганні і запаліць «чырвоны агонь» на сцежках бяздумных і безадказных падарожнікаў. Шкада, што на прадпрыемствах, ва ўстановах і вну рэспублікі прапаганда прыродаахоўных ідэй сярод моладзі вядзецца пакуль што нездавальняюча, формы яе традыцыйна аднабаковыя — лекцыі і стэнды...

Некалькі слоў пра будучыню нашага турызму.

Прафсаюзныя і турысцкія арганізацыі рэспублікі праводзяць значную работу па ўмацаванню матэрыяльнай базы турысцкага руху. Да новага, 1973 года, павінна ўступіць у строй дзеючых новая турбаза «Дняпро» на 440 месц у Магілёве. У будучым годзе намячаецца адкрыць таксама турбазу «Палессе» на Прыпяці і два кэмпінгі — на Нарачы і на возеры Гаць. Узводзяцца турбазы «Нёман» пад горадам Гродна і «Лосвіда» пад Віцебскам.

У будучым годзе адкрываюцца і новыя ўсесаюзныя маршруты: Масква — Смаленск — Мінск — Брэст; Мінск — Магілёў — Гомель; Мінск — Стоўбцы — Баранавічы — Брэст...

Ёсць усе падставы лічыць, што экскурсійнымі мерапрыемствамі ў трэцім годзе пяцігодкі будзе ахоплена больш трох мільёнаў чалавек, а паслугамі турбаз, кэмпінгаў і гасцініц пакарыстаецца больш чым сто тысяч турыстаў і падарожнікаў.

П. БАГДАНАЎ,
старшыня Беларускага рэспубліканскага савета па турызму і экскурсіях

---

# НА ВАРЦЕ ЗЯМЛІ І ЛЕСУ



**Т. С. МАХНАЧУ — 60 ГАДОЎ**

Яго жыццёвы лёс вызначыўся змалку...

Сын селяніна-бедняка з вёскі Паляны на Бярэзіншчыне, Трафім Махнач з самага дзяцінства зведаў смак хлеробскай працы, душою і сэрцам успрыняў любоў да зямлі і да работы на ёй. Гэтую сваю любоў да зямлі-карміцелькі ён пранёс праз усе гады.

Біяграфія Т. С. Махнача тыповая для ягоных аднагодкаў, для пакалення савецкіх людзей, што ўступала ў жыццё ў канцы 20-х гадоў. У шаснаццацігадовым узросце ён — член сельскагаспадарчай камуны на роднай Бярэзіншчыне. Адсюль, з камуны, юнак пайшоў на вучобу — у Смальянскі тэхнікум сацыялістычнага земляробства.

Скончыў тэхнікум Трафім Махнач у 1932 годзе. З таго часу яго працоўная біяграфія зноў непарыўна звязана з зямлёй, з клопатам аб тым, каб яна больш радзіла, шчадрэй сплочвала людскую працу і турботы. Толькі два разы аграном Махнач вымушаны быў перапыняць сваю земляробчую дзейнасць: у 1934—35 гадах, калі быў курсантам палкавой школы ў Магілёве, і ў 1941—45 гадах, калі хадзіў цяжкімі франтавымі дарогамі. Усе ж астатнія гады аддаў зямлі: працаваў тэхнічным дырэктарам і старшым аграномам саўгасаў у Петрыкаўскім і Дубровенскім раёнах аграномам-інструктарам, старшым аграномам-інструктарам і намеснікам загадчыка сектара СНК БССР па падрыхтоўцы да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі...

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Трафім Сымонавіч некаторы час працаваў упраўляючым Белканторы гадавальніцкіх саўгасаў «Дзяржсадгадавальнік» Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі, а пасля доўгія гады быў памочнікам намесніка старшыні і старшыні Савета Міністраў БССР. З 1960 года Т. С. Махнач — намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па ахове прыроды.

Менавіта тут, на гэтай рабоце, найбольш раскрыліся і праявіліся арганізатарскія, творчыя і навуковыя здольнасці і задаткі Трафіма Сымонавіча. У камітэце ён займаецца пытаннямі аховы зямельных угоддзяў і лясоў. Працуе Т. С. Махнач сумленна, самааддана, аддаючы рабоце ўсе свае веды (у 1958 годзе ён завочна скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію) і багаты жыццёвы вопыт.

Т. С. Махнач — ініцыятар шэрагу заканадаўчых актаў па пытаннях рацыянальнага прыродакарыстання. Шмат увагі аддае ён праблеме рэкультывацыі земляў, якіх кранулася прамысловая распрацоўка. І ў тым, што за апошнія дзесяць гадоў у рэспубліцы вернута да жыцця больш чым 86 тысяч гектараў выпрацаваных тарфянікаў і кар'ераў, немалая заслуга Трафіма Сымонавіча.

Нельга не адзначыць і таго, што Трафім Сымонавіч з'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння Беларускага таварыства аховы прыроды, што з часу стварэння яго ён — нязменны намеснік старшыні прэзідыума Рэспубліканскага савета таварыства. І на гэтай пасадзе Т. С. Махнач шмат зрабіў для згуртавання аматараў прыроды, для прыцягнення іх да актыўнай работы па зберажэнню і памнажэнню красы і багацця роднага краю.

Трафіму Сымонавічу Махначу споўнілася 60 гадоў. Віншуючы яго з юбілеем, рэдакцыя біюлетэня «Родная прырода» і яе шматлікія чытачы ад душы зычаць яму доўгіх гадоў жыцця і новых поспехаў у яго карыснай і высакароднай рабоце.





У наш час «нараджаюцца» пасажырскія самалёты, якія ўдвая перакрываюць хуткасць гуку, і пацiху ўваходзiць у моду... стары веласiпед. Чалавека ўсё болей акружаюць даброты цывiлiзацыi, i, разам з тым, кожны з нас свой адпачынак iмкнецца правесцi на ўлонні прыроды, далей ад горада, яго шуму i мiтуснi.

Парадоксы... Яны ўсюды. Возьмем народную архiтэктурную разьбу. Здавалася б, пара ёй растварыцца ў сучасным архiтэктурным рацыяналiзме, а яна — жыве, не выраджаецца ў прымiтыўны арнамент, накшталт лiнейна размешчаных ромбiкаў i кубiкаў. У большасцi выпадкаў застаюцца усё тыя ж матывы: фiгуркi жывёл, сiлуэты раслiн i дрэў (альбо толькi намёк на iх). У iх — i пантэiстычнае адчуванне свету, i традыцыi (а iх шмат у беларускiх разбяроў: ужо ў XVII стагоддзi старац Арсенi i майстар Клiм Мiхайлаў выконвалi заказы ў Крамлi), i такая про-

# ПАДКАЗАНА ПРЫРОДАЙ







стая рэч, як прэстыж гаспадара: «каб не горш, чым у людзей».

Праўда, цяперашняя вёска, з яе ўхілам да індустрыялізацыі, больш клапоціцца аб якасці, трываласці будынкаў, чым аб іх дэкаратыўным упрыгожванні. Але і ў нашы дні майстры-разбяры не застаюцца без работы.

У розных ракурсах укладзенай шалёўкай і разьбой упрыгожваюцца франтоны. На іх часта размяшчаюцца разеткі і салярныя



ўзоры. Асаблівая ўвага аддаецца вільчаку (каньку): верхнія канцы дошак, якія закрываюць абрашотку страхі, выразаюцца ў выглядзе розных фігур жывёл і птушак. Сустракаюцца вільчакі ў выглядзе стылізаваных стрэл, трызубцаў, шпіляў і кветак.

Але, бадай, галоўнае — афармленне аконнай ліштвы. Асабліва ўпрыгожваецца яе верхняя частка.

У многіх дамах не застаюцца без увагі і аканіцы. Праўда, галоўная роля тут належыць не разьбе, а афарбоўцы.

На некаторых сядзібах дэкаратыўнай разьбой упрыгожаны ганкі, вароты і нават платы.

«Певень» на страсе, ломаныя і звілістыя ўзоры на ліштве, пакручастая разьба ганачных слупкоўапор — усё гэта сведчанні неўміручай прагі чалавека да прыгожага, ягонага жадання знайсці шлях да гармоніі. І першы крок на гэтым шляху, як заўсёды, падказвае прырода.









# ПАД ПОЛАГАМ ЛЕСУ

Значэнне лесу вялікае і разнастайнае. Ён даваў і дае чалавеку самыя разнастайныя прадукты. Але галоўны з іх — драўніна. Нават у наш час, у век атама, радыёэлектронікі і хіміі, значэнне яе не толькі не зменшылася, але, наадварот, узрасло, таму што яна была і засталася універсальнай сыравінай, без якой проста немагчыма ўявіць сабе будучыню эканомікі краіны. Драўніна — цудоўны прыродны палімер, магчымасці выкарыстання якога ў самых розных галінах народнай гаспадаркі бязмежныя і далёка не раскрытыя. Дастаткова сказаць, што з 4—5 кубаметраў свежассечанай драўніны можна атрымаць адну тону цэлюлозы, якая ў сваю чаргу дае нам віскозу. А гэта — штучныя валокны, штучная шэрсць, штучны каракуль, корд, цэлафан, ацэтатныя валокны, шматлікія пластыкі і інш.

Карысць, якую атрымлівае чалавек ад лесу, гэтым, канечне, не вычэрпваецца. Карацей кажучы, лясы мы павінны берагчы, клапаціцца аб іх, думаць аб тым, каб бясцэнны дар прыроды не змяншаўся.

У комплексе мерапрыемстваў, якія забяспечваюць устойлівае павышэнне прадукцыйнасці нашых зялёных кладовак, рашаючае значэнне мае рацыянальная сістэма ўтрымання лясной глебы, выкарыстанне розных угнаенняў. Сярод апошніх вядучае месца належыць арганічнаму рэчыву (перагніўшае лісце, травы і інш.), якое падтрымлівае жыццядзейнасць лясной флоры і фауны. Вось чаму лесаводы павінны ўважліва сачыць за колькасцю арганічнага рэчыва ў лясной глебе, рэгуляваць яго баланс, асабліва суадносіны ў ім вугляроду і азоту. Менавіта азот у асноўным і вызначае рост дрэў і раслін, стымулюе накапленне прадуктаў фотасінтэзу. Таму для павышэння ўрадлівасці глебы маюць аднолькавае значэнне ўсе працэсы, якія адбываюцца ў лесе, бо ад іх залежыць, колькі накопіць зямля атмасфернага, так званага «біялагічнага» азоту.

Ці можа чалавек рабіць уплыў на гэты працэс? Так. Трэба сеяць у лясах бабовыя расліны, у прыватнасці, шматгадовы лубін мнагалісты.

Шматгадовы лубін завезлі ў Еўропу з Амерыкі як прыгожую дэкаратыўную расліну. Гэта напаўхмызняковая, шматсцяблова расліна, якая дасягае паўтара метра ў вышыню. На яе карэнні прыкладна праз месяц пасля з'яўлення ўсходаў утвараюцца шматлікія клубеньчыкавыя ўздуцці, у якіх знаходзяцца бактэрыі, якія выконваюць функцыі накапіцеля азоту. Акрамя таго шматгадовы лубін дае шмат зялёнай масы: больш за канюшыну і люцэрну. Лубін узбагачае лясную глебу гумусам, азотам і фосфарам, спрыяе захаванню вільгаці, узмацняе аэрацыю, стварае спрыяльныя ўмовы для жыцця ў лесе шматлікіх мікраарганізмаў.

Аб тым, што пасевы шматгадовага лубіну ў лясах вельмі перспектыўныя, пераканаўча сведчаць вопыты, якія былі пастаўлены ў Негарэльскім навукова-вопытным лягасе БТІ імя С. М. Кірава пад кіраўніцтвам заслужанага лесавода БССР, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара Б. Жылкіна. Супрацоўнікі кафедры лесаводства гэтага інстытута ўважліва даследвалі ўплыў шматгадовага лубіну на пасадкі сасны і елкі.

Назіранні вяліся на працягу васемнаццаці гадоў. Яны паказалі, што пад уздзеяннем лубіну, які пастаянна ўзбагачае глебу «біялагічным» азотам, у верасовым сасняку прырост агульнай арганічнай масы павялічыўся за гэты час ў параўнанні з кантрольнымі ўчасткамі на 105 працэнтаў, стваловай масы — на 107, карэння — на 250 і лапак на 42 працэнты. Гэтыя дадзеныя, атрыманыя ва ўмовах Беларусі, супадаюць з думкай акадэміка Д. Пранішнікава, які ўстанавіў, што галоўнай умовай, якая вызначае ўрадлівасць наогул, з'яўляецца ступень забяспечанасці раслін азотам.

Даследванні, якія вяліся іншымі вучонымі, пацвердзілі таксама і тую думку, што пасевы шматгадовага лубіну ў лясах прыкметна ўплываюць на тэрміны палавой сталасці дрэў — гэта адбываецца на 10—15 гадоў раней звычайнага, у 1,5—2 разы павялічваецца колькасць пладаносных дрэў, а ўраджай насення, напрыклад, сасны павышаецца ў 2—3 разы.

Беларускі селекцыянер Я. Свірскі вывеў яшчэ адзін гатунак шматгадовага лубіну — салодкі. Даследванні паказалі, што гэты гатунак, валодаючы якасцямі звычайнага шматгадовага лубіну, можа яшчэ ўжывацца як корм для хатніх і дзікіх жывёл.

Рост патрэбы народнай гаспадаркі ў спелай драўніне стымуляваў таксама правядзенне вопытаў, якія звязаны з уплывам шматгадовага лубіну на прадукцыйнасць не толькі маладых лясоў, але і сярэдневзростаых і прыспяваючых. Справа ў тым, што доўгі час уладарыла такая думка: пад полагам лесу, ва ўмовах недахопу сонечнага асвятлення, лубін расці не будзе. Але даследванні беларускіх вучоных-лесаводаў абвергл гэтую думку. І ў гэтых умовах шматгадовы лубін добра расце, цвіце і пладаносіць.

Цяпер супрацоўнікі кафедры лесаводства БТІ імя С. М. Кірава вядуць работы па вывучэнню ўплыву шматгадовага лубіну і розных угнаенняў на рост, фізіялагічныя асаблівасці і прадукцыйнасць насаджэнняў сасны розных узростаў і ў розных тыпах лясоў.

С. ІВАНОЎ,
Г. МЕРКУЛЬ.

## НА ТВАЮ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ, ПРЫРОДАЛЮБ

Выдавецтва «Ураджай», улічваючы рэкамендацыі Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па ахове прыроды і рэспубліканскага савета Беларускага таварыства аховы прыроды, а таксама пажаданні чытачоў, пачало выпуск серыі кніг, прысвечаных расліннаму і жывёльнаму свету рэспублікі, запаведнікам і заказнікам Беларусі, кніг, якія апяьаюць прыгажосць і багацце роднага краю і вучаць любіць і шанаваць іх.

Адрасуем чытачам дзве кнігі — «першыя ластаўкі» з гэтай серыі.

### «ЛЯСНЫМІ СЦЯЖЫНАМІ»

Пад такой назвай выйшла ў свет кніга аб жывёльным свеце нашай рэспублікі, напісаная кандыдатам біялагічных навук Аляксандрам Курсковым. Аб змесце кнігі красамоўна гавораць назвы нарысаў, што склалі яе: «Ласі», «Увага — ваўкі!», «Каля лісінай нары», «Бяляк і русак», «Калючы смяльчак», «Жыхары дуплянак», «Рукакрылыя падарожнікі», «Белы бусел», «Жар-птушка Белавежскай пушчы», «Лясныя будаўнікі» і г. д. Нарысы гэтыя нарадзіліся ў выніку назіранняў аўтара за жыццём і звычкамі лясных, рачных і палявых жыхароў на блакітных азёрах Віцебшчыны, у балотнай дрыгве Бярэзінскага запаведніка, у пойменных дубровах Палесся і ў непаўторнай па сваёй красе Белавежскай пушчы.

Аб чым гэта кніга? У невялікай прадмове да яе гаворыцца: «Чытач даведаецца, дзеля чаго разводзяць і ахоўваюць зуброў, карысць ці шкоду прыносіць рыжая лісіца, добрая ці кепская маці зайчыха, чаму дзіцяняты аленяў, казулі і дзіка маюць іншую афарбоўку, чым іх бацькі, ці ядавітая мядзянка. У кнізе шмат цікавага аб жыцці лася, аленя, ваўка, барсука, крата, лясной соні. Дадзены адказы на пытанні: калі і адкуль да нас у Беларусь завезены і як прыжыліся звяры і птушкі-навасёлы, куды і навошта кажаны, як і птушкі, робяць вясной і восенню пералёты, дзе зімуюць жабы, яшчаркі і змеі, ці карыстаюцца совы радарамі».

Вось толькі адзін факт з жыцця буслоў — «святых птушак», як называюць іх у народзе, птушак, пра якіх складзена нямала легенд, з якімі звязана шмат народных прыкмет і павер'яў. Часам пад старой ліпай, на якой знаходзіцца буслянка, людзі знаходзяць буслянят. «Звалілася малое», — думае чалавек і не паленуецца, узбярэцца на ліпу, каб пакласці бусляня ў гняздо. А між тым малога скінулі самі... дарослыя буслы. Так бывае, калі летам наступае засуха, калі высыхаюць вільготныя пойменныя лугі і знікае буслінья ежа — жабы. У гэты час буслы ідуць, на першы погляд, на злачынства: яны выкідваюць з гнязда сваіх птушанят, пакідаючы ў ім толькі аднаго-двух — самых здаровых і дужых. Калі засуха заспее бусліху, якая яшчэ наседжвае яйкі, буслы скідаюць з гнязда некалькі яек. Інстынкт нібыта падказвае птушкам, што ўсіх дзяцей пракарміць ім не ўдасца, таму яны пакідаюць у гняздзе столькі, колькі змогуць забяспечыць ежай...

# ДЗІЧЫНЕ — НА ЗІМУ

Праверкай паляўнічых гаспадарак Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў устаноўлена, што біятэхнічныя мерапрыемствы, у прыватнасці — будаўніцтва кармушак і стварэнне саланцоў, вядзецца без уліку біялагічных і экалагічных асаблівасцей дзічыны. Асобныя кіраўнікі паляўнічых гаспадарак няправільна арганізуюць і праводзяць біятэхнічныя мерапрыемствы. Адсюль і розныя меркаванні адносна нормы падкормкі і нарматываў біятэхнічных збудаванняў. Практыка ж паказвае, што для кожнага віду дзікіх жывёл неабходна праводзіць комплекс біятэхнічных мерапрыемстваў. Пра гэта і пойдзе ў нас гаворка.

### ЛАСІ

Для ласёў робяцца толькі саланцы на вышыні ад 1 да 1,5 метра ад зямлі. Устанаўліваюцца яны ў месцах познезімовых стаянак звера з разлікам адзін саланец на тысячу гектараў лесу. Для таго, каб ласі лягчэй іх знаходзілі, саланцы размяшчаюцца на ласіных сцежках і каля вадапояў. Класці соль у саланцы трэба рэгулярна.

### КАЗУЛІ

Зімовая падкормка казуль з'яўляецца абавязковым мерапрыемствам. Найбольш мэтазгодна раскладваць кармы ў кармушкі. Звычайна карыстаюцца ясельнымі кармушкамі. Пад яслямі ўмацоўваюць латочак для солі. Будаваць кармушкі неабходна ўлетку, каб жывёла прызвычайлася і не палохалася іх. Месца для саланцоў і кармушак выбіраецца з такім разлікам, каб казулі на падыходзе да іх мелі шырокі агляд. Найлепшы корм для казулі — добрае сена.

### ЗАЙЦЫ

Месцы падкормкі зайца-русака вызначаюць яшчэ з восені. Найбольш зручнымі і прыгоднымі для гэтага з'яўляюцца ўскрайкі палёў, равы, пералескі, папары. Выбранае месца пазначаецца слупкамі вышынёй 1,5—2 метры. На слупкі насаджваюцца снапкі сельскагаспадарчых культур. Падкормку таксама можна рабіць у скрынях, пастаўленых пад спецыяльныя стрэшкі. Снапкі можна прывязваць да дрэў альбо хмызнякоў. Зайцу-русаку падкормка патрэбна толькі ў той час, калі выпадае шмат снегу. Саланцы для яго наладжваюцца на ўзлесках ці на палянках.

Для зайца-беляка робяцца толькі саланцы. Соль кладуць на паваленыя дрэвы альбо на пні, на такой вышыні, каб яна была даступна зайцу.

### БАРАВАЯ ДЗІЧЫНА І КУРАПАТКІ

Курапаткі патрабуюць падкормкі з выпаданнем снегу. Але пачынаць падкормліваць іх трэба раней, каб прывучыць птушак да месца выкладкі кармоў. Найлепшы корм — зернеадходы. Падкормачныя пункты трэба размяшчаць сярод хмызнякоў, у прыдарожных палосах, на ўзлесках. Адно месца падкормкі ад другога размяшчаць прыблізна праз кожны кіламетр. Каб снег не засыпаў корм, яго кладуць пад розныя паднавесікі альбо ў буданах, якія адначасова могуць быць і прытулкам птушак у час непагадзі. Побач з падкормачнымі пляцоўкамі робяцца галечнікі.

Для баравой дзічыны падкормачныя пляцоўкі робяцца пад дрэвамі. На корм скарыстоўваюцца зернеадходы, а таксама пучкі рабіны і снапкі аўса.

Некалькі слоў пра іншыя біятэхнічныя збудаванні.

### ВЫШКІ ДЛЯ СЕЛЕКЦЫЙНАГА АДСТРЭЛУ ДЗІЧЫНЫ

Такія вышкі будуюцца звычайна каля падкормачных пляцовак. Будаваць іх трэба так, каб яны не кідаліся ў вочы, а ўпісваліся ў ансамбль лесу. Таму ствараць іх трэба з неакораных слупоў, а месца для стралка маскіраваць жэрдкамі і свежымі яловымі ці сасновымі лапкамі.

Устанаўліваюцца вышкі не далей 30—40 метраў ад месца, куды павінен падысці звер. Вышыня месца паляўнічага ад узроўню зямлі не павінна перавышаць чатырох-пяці метраў. Вышкі павінны быць трывалымі, каб іх не мог гайдаць вецер. Не павінны яны, вядома, і скрыпець пад цяжарам паляўнічага.

### СХОВІШЧЫ ДЛЯ КАРМОЎ

Сховішчы для кармоў трэба рабіць непасрэдна ў паляўнічых угоддзях непадалёк ад месц падкормкі, каб не было праблем транспарціроўкі. Робяцца сховішчы на сухіх мясцінах. Для бульбы, буракоў і іншай гародніны, якую любяць дзікі, звычайна капаюцца ямы. Сценкі ям для надзейнасці можна ўмацаваць, а дно заслаць сенам ці саломаю. Над ямай лепш за ўсё зрабіць двухскатную стрэшку.

Для сховішча сухіх кармоў (для ласёў, казуль і аленяў) будуюцца дашчаныя буданы. Для эканоміі сродкаў буданы можна рабіць з адходаў — розных аполкаў і абрэзкаў. Ставіць буданы трэба таксама непадалёк ад падкормачных пляцовак і лясных дарог і прасек.

Ю. СПІРЫДОНАЎ,
загадчык аддзела паляўнічых гаспадарак і рыбалоўства РС БТПР;
У. ДАМАШЭВІЧ,
паляўнічазнаўца.

Кніга, несумненна, абудзіць у чытача не толькі цікавасць да загадак жывой прыроды, імкненне бліжэй пазнаёміцца з насельнікамі лясоў і балот Беларусі, але і жаданне самому прыняць удзел у вялікай і пачэснай справе аховы роднай прыроды.

Нарысы, сабраныя ў кнізе «Лясным сцяжынамі», з цікавасцю і карысцю прачытаюць школьнікі і студэнты, паляўнічыя і турысты, настаўнікі-біёлагі і натуралісты — усе, хто любіць прыроду роднай зямлі, хто заклапочаны зберажэннем і памнажэннем яе багаццяў.

## «У КЛОПАТАХ АБ ЗЯЛЁНЫМ ДРУГУ»

Зялёны сябар — гэта, канечне, лес. І не толькі ці не проста — сябар. Лес — і заступнік, і абаронца, і карміцель чалавека. Лес — і багатая кладоўка самай разнастайнай сыравіны. Мы спяшаемся ў лес у летнюю спёку, спадзеючыся знайсці там жаданую прахалоду, цішыню і спакой, мы ідзем да яго і завейнай зімовай парой, каб улагодзіцца яго велічнай задуменнасцю і запасціся бадзёрасцю і здаровай жыццядзейнасцю. А што мы ведаем пра яго, пра нашага маўклівага зялёнага друга? На гэтае пытанне адказваюць у сваёй кнізе «У клопатах аб зялёным другу» Уладзімір Раманаў і Віктар Пабедаў.

«У чалавека зусім дастаткова аб'ектыўных прычын, каб імкнуцца да захавання дзікай прыроды. Але прырода будзе агароджана ад небяспекі толькі ў тым выпадку, калі чалавек хоць крышачку палюбіць яе проста таму, што яна цудоўная», — пісаў французскі вучоны Ж. Дорст. Аўтары кнігі кіраваліся менавіта гэтым жаданнем — перадаць хоць частачку сваёй любві да прыроды, у дадзеным выпадку да лесу і яго насельнікаў, іншым, дапамагчы ім зразумець законы прыроды, тую карысць, якую дае лес чалавеку і грамадству.

Кніга складаецца з трох раздзелаў. У першым ідзе размова аб лесе ўвогуле, даецца характарыстыка розных лясоў нашай рэспублікі з прыцягненнем цікавага гістарычнага матэрыялу, гаворыцца аб значэнні лесу (дрэва) у жыцці чалавека. Цікавыя старонкі прысвечаны лясным дарункам, якімі шчодра карыстаецца чалавек, — травам, грыбам, ягадам. Вялікую пазнавальную каштоўнасць уяўляюць таксама нарысы «Лес абараняе» і «Лес лечыць». Другі раздзел кнігі называецца «Птушкі і звяры нашых лясоў», трэці — «Лес і паляванне». Апошні адрасаваны перш за ўсё паляўнічым. Тут, акрамя агульных звестак пра лясную фауну Беларусі, прыведзена нямала практычных парад, карысных кожнаму, хто прыходзіць у лес са стрэльбай.

Пераказваць змест кнігі, мусіць, не варта — яе трэба прачытаць. І тады чытач даведаецца шмат цікавага і захапляючага аб прыгажосці лесу, аб велізарным значэнні лясных насаджэнняў у жыцці чалавека, аб дзівосных пераўтварэннях драўніны (з яе можна атрымаць больш чым 15 тысяч самых разнастайных прадметаў і рэчаў) і аб тым, як беражліва трэба яе выкарыстоўваць, аб звярах і птушках — лясных насельніках, аб жыццядзейнасці лясных мікраарганізмаў. Пра ўсё гэта аўтары кнігі расказваюць з навуковай дасведчанасцю і пераканаўчасцю, з глыбокай зацікаўленасцю і вялікай любоўю, з высокай грамадзянскай заклапочанасцю за лёс і будучыню нашых лясоў.

І апошняе. Кнігі «Лясным сцяжынамі» і «У клопатах аб зялёным другу» выдадзены любоўна, зручным і арыгінальным фарматам, у цікавым мастацкім афармленні (мастак — М. Басалыга). Абедзве кнігі багата ілюстраваны — у кожнай з іх змешчана больш трыццаці яркіх і маляўнічых фотаздымкаў.

М. КАЛІНА.



# КАЛІ МЯДЗВЕДЗЯМ СНЯЦЦА СНЫ...

Засмужаны блакіт неба на ўсходзе перамяшаўся з чырванаватай фарбаю вялізнага шара малінавага сонца, якое выплыла з-за лесу. Снапок залацістых промняў рассыпаўся па вяршалінах дрэў. Яшчэ маўчалі нястомныя спевакі-птушкі.

Мядзведзь, падклаўшы адну лапу пад галаву, нібы чалавек руку, спаў. Нейкія цяжкія прыглушаныя стогны і ўздыхі непакоілі яго чуйны сон.

Недзе непадалёк залапатаў крыламі і моцна, на ўвесь лес, крыкнуў чорны крумкач. Мядзведзь як і не спаў: стаў на пярэднія крывыя лапы, панюхаў паветра, павадзіў вакол з-пад ілба злоснымі карычневымі вачыма. Нейкі лясны шолах насцярожыў магутнага звера яшчэ больш. Мядзведзь ускочыў, быццам нейкая спружына падняла яго, выцягнуў лабастую галаву, нюхаючы паветра.

Затрубіў на балоце журавель, другі... Гэта былі знаёмыя гукі. Яны супакоілі звера. Мядзведзь чорнымі, загнутымі, як кручкі, вострымі кіпцюрамі пашкроб за вухам і зноў лёг. Здавалася, што ён нібыта адным вокам назіраў за пазалочанымі сонцам вяршалінамі дрэў і слухаў, як абуджаецца ўранку лес.

Роўных яму па сіле ў навакольным лесе не было. Але мядзведзь быў напагатове, прыслухоўваючыся да кожнага шолаху, да кожнага гуку, бо ў сваіх лясных уладаннях ён не мог трываць няпрошаных гасцей.

Усё жыццё бурага мядзведзя звязана з тым лесам, дзе шмат ягад, дзе ёсць рэчкі, азёры і балоты, непраходныя бураломы, з тым глухім змрочным лесам, дзе мала бывае чалавек, якога магутны звер заўсёды пазбягае і толькі тады кідаецца на яго, калі адчувае, што яму пагражае небяспека.

Позняй восенню, калі дні прыкметна карацеюць, а сонечныя промні астываюць, калі чарнее лес і ранкам сівее ад інею, калі толькі яшчэ крыху жаўцеюць амаль распранутыя бярозы, мядзведзь рыхтуе на зіму бярлогу, як правіла ў зацішным месцы, каб сон узімку быў спакайнейшы, каб ніхто яго не трывожыў. Багаты запас тлушчу падтрымлівае яго жыццё ўсю зімоўку.

Спіць-дрэмле мядзведзь у бярлозе чуйна. У любую хвіліну ён можа падхапіцца і пакараць таго, хто патрывожыць яго сон.

У Бярэзінскім запаведніку ў розных месцах знаходзілі бярлогі, нават там, дзе ніхто і не думаў іх знайсці.

Люты гэтага года быў маласнежны. Васіль Паўлавіч Шынкевіч, інжынер па ахове лесу запаведніка (жыве ён у вёсцы Домжарыцы) удзень пайшоў у лес. За плячыма была стрэльба, зараджаная шротам, а побач бег сабака Барс. За кіламетр ад вёскі, за нейкіх трыста метраў ад поля, непадалёк ад квартальнай прасекі, дзе нядаўна ляснік расчышчаў буралом, Барс забрахаў, поўсць на ім дыбам стала. Васіль Паўлавіч глянуў перад сабою на вялізны вываранець яліны і спыніўся, як укапаны. За нейкіх пяцьшэсць метраў ад сябе ён убачыў, як з-пад ствала яліны высунулася калматая галава мядзведзя. Звер стаў на заднія лапы, расплюшчыў вочы. Нейкую хвілю Васіль Паўлавіч, як скаваны, не могучы варухнуцца, глядзеў мядзведзю ў вочы, а мядзведзь — яму. Сабака прыціснуўся да ног. Стрэльба была за плячыма. Але Васілю Паўлавічу пашанцавала. Мядзведзь заплюшчыў вочы і схаваўся ў бярлозе. Тады Васіль Паўлавіч схапіў сабаку за ашыйнік і хутчэй назад.

Праз некалькі дзён (тады была адліга) Васіль Паўлавіч вырашыў праверыць, ці не пакінуў мядзведзь зімовую ляжанку. Метраў за трыста ён пачаў абыходзіць бярлогу, каб глянуць, ці няма на снезе выхаднога следу. Больш глядзеў у той бок, дзе была бярлога. Раптам павярнуў галаву і метры за чатыры ад сябе ў развернутай купіне ўбачыў мядзведзя, які стаяў на задніх лапах з разяўленай пашчай. Васіль Паўлавіч не разгубіўся. На гэты раз ён трымаў у руках стрэльбу, зараджаную кулямі. Можа і мядзведзь гэта зразумеў, бо хвіліны дзве чалавек не зводзіў вачэй з мядзведзя, а мядзведзь з чалавека, потым звер асунуўся і лёг. Васіль Паўлавіч, адступаючыся, пакінуў звера ў спакоі.

Пасля другой сустрэчы з чалавекам мядзведзь пакінуў і гэтую бярлогу. Васіль Паўлавіч больш яго не сустракаў.

Часам цяжка зразумець, чым касалапы кіруецца, калі выбірае месца для бярлогі.

У студзені 1970 года некалькі леснікоў з Васілём Паўлавічам пайшлі рабіць адстрэл лася і дзіка для навуковых мэт. Абышлі шмат урочышчаў, а ні лася, ні дзіка не сустрэлі. За сто метраў ад шашы Бягомль—Лепель у маладым ельніку пачулі, як забрахаў сабака. Усе падумалі, што ён «затрымаў» дзіка. Акружылі гэты ўчастак лесу. Адзін ляснік пайшоў «браць» вепра. Мінут трыццаць было ціха. Нават сабака маўчаў. Потым цішыню зімняга лесу скалануў стрэл і жудасны крык.

Ляснік ужо мінуў бярлогу, калі з яе выскачыў мядзведзь і з хуткасцю маланкі скокнуў на яго. Ляснік стрэліў і сарваў куляю ў касалапага на спіне толькі шматок поўсці. Каб не сабака, які кінуўся на дапамогу чалавеку, дык невядома, чым скончылася б гэтая сустрэча з мядзведзем, бо лютасць раззлаванага мядзведзя нельга параўнаць з лютасцю ніводнага звера. Па-сапраўднаму раззлаваны мядзведзь усё крышыць, нішчыць і так раве, што калоцяцца дрэвы, а калі няма чаго ламаць, крышыць, дык у дзікім шаленстве круціцца на месцы і кусае сваю лапу. Жудасную гісторыю пра мядзведжую лютасць расказаў Васіль Паўлавіч.

Стары мядзведзь заспеў мядзведзіцу з медзведзянятамі. Тыя яму нечым не спадабаліся. Ён кінуўся на медзведзянят. Маці ўступілася за іх. Але сілы былі няроўныя. Тады маці з малымі забралася на бярозу. Раззлаваны мядзведзь не пакінуў у спакоі сям'ю. Вакол бярозы павырываў кусты, абадраў усю кару, абламаў на дрэве да апошняе галінкі, паскідаў медзведзянят, патаптаў, адно разарваў напалам, а другому адарваў галаву. Які яшчэ звер здольны на такое!

Звычайна мядзведзь зімуе ў адной бярлозе. Аднак бываюць і выключэнні. У запаведніку зарэгістраваны выпадак, калі адзін мядзведзь зрабіў дзве бярлогі: адну пад вываратнем, а другую ў выглядзе вялізнага гнязда за дваццаць метраў ад першай у густым ельніку. Калі было холадна, касалапы адлежваўся ў цёплай бярлозе, пад вываратнем, калі ж цёпла — у бярлозе-гняздзе. Часта ён мяняў свае кватэры і паміж *бярлогамі* вытаптаў сцежку.

Быў выпадак, калі мядзведзь уладкаваўся на зіму нават у стозе сена.

Паводзіны мядзведзя цяжка ўгадаць наперад. Калі ён, седзячы на паляне, абшморгвае салодкі авёс і гучна чмякае, калі ласуецца малінаю, то здаецца, што

ён самы ціхмяны, самы ласкавы, што нібыта ён спецыяльна створаны прыродаю для цыркавых трукаў. Але калі касалапы нападае на аленя, лася ці карову, ён падобны на тыгра. І апетыт у яго тыгравы. За некалькі дзён ад каровы ці лася застаюцца толькі косці.

Чалавека мядзведзь пазбягае. Пры сустрэчы ўступае яму дарогу.

Мядзведзь — хітрая жывёліна і, бадай, разумная. Аднойчы ён забраўся ў вальеру, дзе знаходзіліся зубры. Якраз выпаў першы снег. Касалапы пералез праз плот. Але зубры прыціснулі яго да плоту і добра такі пашкуматалі. Выскачыў адтуль мядзведзь і сеў непадалёк ад вальеры. Нават снег растаў на тым месцы. Магчыма, ён абдумваў план, як адпомсціць зубрам, бо на другую ноч разламаў адзін пралёт вальеры — відаць, рабіў праход, каб добра было ўцякаць. Але нічога з яго хітрыкаў не атрымалася. Выгналі яго зубры, а пасля і самі пайшлі ў лес. Толькі тады, калі прыціснулі маразы, зубры вярнуліся назад у вальеру.

Сіла ў касалапага таксама не малая. Неяк у вальеры загінуў дзік. Даглядчык паклаў яго ў скрыню, каб пасля агледзеў ветурач. Але ноччу мядзведзь выцягнуў дзіка са скрыні і з цяжкаю ношаю пералез праз плот і непадалёк з'еў яго. На другую ноч мядзведзь зноў палез да дзікоў. Але адзін сякач, хоць і самому дасталася, адвучыў касалапага, як лазіць у чужы дом.

Яшчэ ў другой палавіне мінулага стагоддзя буры мядзведзь быў распаўсюджаны на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Нават існавала Смаргонская акадэмія, дзе дрэсіравалі медзведзянят. Вучылі іх цыркавому мастацтву і ў Нясвіжскім замку Радзівілаў. А горад Ашмяны меў на сваім гербе мядзведзя. Паўсюдна на іх палявалі. Цяпер жа мядзведзі ў асноўным сустракаюцца толькі ў лясах Віцебшчыны, і то ў нязначнай колькасці. У Беларусі іх каля 200. Паляванне на іх забаронена.

У расказах, казках і байках буры мядзведзь паказваецца гэтакім разумным, дабрадушным, часам жа дурным. Ён любіць улетку паласавацца малінай і мёдам, а зімою, у бярлозе, калі няма ні маліны, ні мёду, смокча сваю лапу.

Калі ж даць кароткую характарыстыку мядзведзю, то яна будзе прыкладна такая: мядзведзь, як малое дзіця, можа куляцца, можа быць дураслівым, можа быць дужа ласкавым, але ў гэтым «дзіцяці» вагою да 400 кілаграмаў хаваецца моц зубра, лютасць тыгра, прагнасць ваўка, нахабства шакала, вёрткасць куніцы, хітрасць лісіцы. І яшчэ ў ім ёсць такое, чаго не ўгадаеш. На што толькі не здатны гэты пацешны буры цяльпук!

Натужна і жаласліва стогнуць зімовыя завірухі, глуха стукаюць у звонкім лесе маразы. Мядзведзі ў гэты час спяць. Зіма для іх ніколі не бывае цяжкай, бо ў бярлозе ў цёплым футры ім не страшны ні маразы, ні мяцеліцы.

Зм. БЯСПАЛЫ.



Пад старым яловым вываратнем выбраў мядзведзь сабе месца для бярлогі.



З гэтай вышкі ўлетку можна назіраць, як мядзведзь ласуецца аўсом.

НАТАТКІ НАТУРАЛІСТА

## МАЛЫЯ ХІТРУНЫ

Вяртаўся я аднойчы з вёскі ў пасёлак. Паціху брыдучы грэбляй, раптам пачуў, як у зарослай асакой і аерам канаве штосьці залапатала. Асцярожна падышоў бліжэй. Гляджу — ажно дзікая качка з выводкам. Пачуўшы мае крокі, качка трывожна закрычала і ўзляцела, а малыя сыпанулі, хто куды. Узяла мяне цікавасць: «Куды ж вы пахаваліся?» Падыходжу яшчэ бліжэй, узіраюся. Ціха шушукае пад ветрам асака, ціха ляжаць на паверхні вады лісткі вадзянога лопуху. Качанят не відно нідзе. Раптам адзін лісток варухнуўся, і з-пад яго паказалася качаня, крышачку далей, з-пад другога лістка, вынырнула другое. Хапіўшы паветра, яны тут жа зноў шуснулі пад свае сховішча.

Міжволі падумалася: як жа яны ўмудраюцца так доўга трымацца пад вадой? Іх жа павінна вада адразу выкідваць напаверх? Прыгледзеўся я лепей і ледзь не разрагатаўся: качаняты трымаліся дзюбкамі за сцяблінкі травы, што расла ў канаве.

— Ах вы, малыя хітруны! — сказаў я сам сабе і пайшоў далей, бо недзе непадалёк падавала роспачны голас качкамаці.

Уладзімір ТРЫБУНАЛАЎ.

Гарадскі пасёлак Глуск.

## БЕЛЫ ШПАК

На правым беразе Бярэзіны, між вёскамі Красноўка і Васілёўка, ёсць мясціна, якую тутэйшыя жыхары называюць Шпакава. Мясціна гэтая вельмі маляўнічая. Зараснікі маладога дубняку, арэшніку, бярэзніку і вербалозу, спакойнае люстра возера Старык (назва яго паходзіць, відаць, ад слова «старыца», бо і само возера — колішняя старыца Бярэзіны) — сапраўднае царства вадаплаўнай і лясной птушкі. Тут заўсёды можна сустрэць дзікіх качак, балотных кулікоў, буслоў, наслухацца спеваў салаўя.

Восенню 1970 года я выбраўся на возера Старык — вырашыў паспрабаваць свайго рыбацкага шчасця. Лугавой сцяжынай шыбаваў я з вудамі за плячыма да возера. Міжволі звярнуў увагу на мноства шпакоў — літаральна ўвесь луг быў укрыты чародкамі птушак. Тут, у Шпакаве, яны штовосень збіраюцца тысячамі — рыхтуюцца да адлёту ў вырай. Нечакана сярод бліжэйшай чародкі я ўгледзеў... белага шпака. Так, так! Усе яго суродзічы былі шэрыя, а ён — белы. Больш ён нічым не адрозніваўся — ні памерам, ні паводзінамі. Гэтак жа, як і астатнія птушкі, белы шпак паважна пахаджваў па скошаным лузе. Я прыпыніўся і доўга назіраў за гэтай рэдкай у прыродзе з'явай...

Неўзабаве птушкі паляцелі ў вырай. Аднак на белага шпака я не забыўся. Кожны раз, бываючы ў Шпакаве, прыглядаўся: а мо раптам угледжу? Ды марна. Відаць, нешта перашкодзіла майму знаёмаму вярнуцца ў родныя мясціны з далёкага выраю.

Іван СТЭЛЬМАХ.

Светлагорскі раён.

**СССР — 50 ГОД**



# ПАМІР У КАРАЛЯХ ЛЕСУ

Здаецца, сама прырода аднойчы і назаўсёды абдзяліла Кіргізію лясамі. Аб крутыя схілы найвышэйшага «даху свету», як завуць Памір, б'юцца тут хвалі пустынь. «Але чалавек мацнейшы за прыроду. Ён стварае ў гарах і пясках густыя і багатыя лясы»,—гаворыць першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Кіргізскай ССР Ф. Маргун. У гутарцы з карэспандэнтам АДН ён расказаў:

На карце лясоў свету мая рэспубліка выглядае амаль суцэльнай белай плямай. Толькі дзе-нідзе зеленеюць астраўкі лясоў. Праўда, паданне гаворыць, што некалі на схілах Паміра былі дрымучыя зараснікі і што ў іх палявалі нават сам Аляксандр Македонскі. Але прайшлі стагоддзі, горныя ледавікі зверху, хвалі пустынь знізу сцёрлі зялёныя масівы. Прыклаў да гэтага руку і чалавек: бессістэмныя высечкі, лясныя пажары, якія прыйшлі ўслед за засяленнем лясоў, знішчылі зялёныя астравы.

Аднак гэта больш датычыцца мінулага, чым будучыні кіргізскай зямлі. Я гляджу іншы раз на карту рэспублікі з радаснай «прыкрасцю»: зноў картографы не паспелі нанесці на яе маладыя лясы!

А іх усё больш — па схілах гор і ў глыбіні пустынь. На прыкладзе гэтых дзіўных пераўтварэнняў з усёй паўнатой раскрываецца сэнс дзейнасці чалавека на зямлі: не толькі браць, але і памнажаць яе багацці. Прыйдзе, безумоўна, час, калі ўсе людзі планеты Зямля будуць працаваць, памятаючы пра гэтую высокую ісціну. А пакуль што такая арганізаваная і мэтанакіраваная праца вядзецца на той частцы зямнога шара, якую займаюць краіны сацыялізму.

Я сцвярджаю гэта па праву чалавека, які добра ведае пераўтваральную дзейнасць савецкіх людзей, хаця б у адной з пятнаццаці рэспублік СССР. А яна вядзецца на ўсёй неабсяжнай тэрыторыі краіны ад Балтыкі да Ціхага акіяна. І з кожным годам усё шырэй яе маштабы. Клопат аб захаванні і памнажэнні прыродных багаццяў стаў адным з асноўных прынцыпаў сацыялістычнага гаспадарання на зямлі.

Савецкае маладое пакаленне ўжо пачынае адчуваць гэтыя даброты. Па схілах гор і на гарачай багары (непаліўныя землі) у Кіргізіі толькі за мінулую пяцігодку (1966—1970 гады) зазелянела 36 тысяч гектараў маладых лясоў. Яшчэ больш з'явіцца іх у дзевятай пяцігодцы. Ужо ў першым яе годзе саджанцы будучых зялёных масіваў з'явіліся на дзесятках тысяч гектараў.

Але лясы — гэта не толькі аздоба нашай зямлі. Яны павінны «працаваць» на чалавека. Вясновыя воды, каменныя патокі з гор спрадвеку разбуралі глебу. Найлепшым яе абаронцам становіцца лес. На дзесяці тысячах гектараў кіргізскай зямлі з'явіліся насаджэнні, якія засцерагаюць глебу ад расшырэння яроў, створана паўтары тысячы гектараў полеахоўных палос. Вакол гарадоў і рабочых пасёлкаў, асабліва тых, што размешчаны бліжэй да пустыні, па берагах каналаў і рэк з'явіліся дзесяткі кіламетраў насаджэнняў. Яны надзейна ахоўваюць паветра і воды ад гарачага подыху сярэднеазіяцкіх пустынь.

Адна характэрная дэталь ва ўзаемаадносінах савецкага чалавека з прыродай. Новыя, створаныя яго працай лясы аказваюцца лепшымі і багацейшымі за тыя, што стварыла прырода. Я пакажу гэта на прыкладзе арэхавых лясоў Кіргізіі. Яны ўяўляюць унікальную каштоўнасць. У Ошскай вобласці рэспублікі знаходзіцца своеасаблівы батанічны сад: тут растуць 130 парод дрэў і кустоў. Найбольш каштоўныя з іх — масівы грэцкага арэха.

Спрадвеку яго плады лічыліся каштоўным харчовым прадуктам. Ядро арэха ўтрымлівае 70 працэнтаў тлушчу і багаты набор вітамінаў. Яно ў два-тры разы больш каларыйнае за хлеб, мяса, рыбу, малако і іншыя прадукты. Нездарма вялікі рускі даследчык прыроды Іван Мічурын назваў гэтыя арэхі «хлебам будучыні».

Аднак лесаводаў рэспублікі не задавальняе прыродная «вытворчасць» арэхавых лясоў — прадукцыйнасць іх нізкая. Вучоныя Кіргізіі распрацавалі рэкамендацыі па паляпшэнню гэтых лясоў культурнымі гатункамі. На створаных чалавекам арэхавых плантацыях пасаджана трынаццаць тысяч культурных саджанцаў. І ўжо ў бліжэйшыя гады на схілах «даху свету» зашумяць лесасады — прамысловыя плантацыі лепшых мясцовых і прывазных гатункаў арэха. Да 1980 года арэхавыя сады з'явяцца на 1200 гектарах, будзе створана 9,5 тысячы гектараў пасадак арэха, міндаля і іншых карысных культур.

«Дах свету» — Памір, які заўсёды быў белай плямай на зялёнай карце зямлі, ужо праз некалькі дзесяцігоддзяў паўстане перад чалавецтвам у каралях лясоў.

# ВАДА ІДЗЕ З ГОР

Гэта здарылася ўначы 19 лютага 1911 года. Зафіксаваны нават час — 23 гадзіны 15 мінут. У наступную, шаснаццатую, мінуту зямля ў даліне Мургаба ажыла, пачуўся страшэнны грукат — і трохкіламетровая гара ўпала ў даліну. Потым падлічылі, што ўпала 2 мільярды 200 мільёнаў кубічных метраў каменя.

Яшчэ не супакоіліся апошнія глыбы, а вада Мургаба, якая сустрэла на сваім шляху вялізную сцяну, ужо ўтварала возера. Катастрофу назвалі Усойскім завалам, а возера — Сарэзскім.

Праз 21 год пачалося вывучэнне энергетычных рэсурсаў Паміра, потым была складзена карта гэтых рэсурсаў, і там, дзе адбылася катастрофа, была запраектавана буйнейшая з памірскіх гідраэлектрастанцый — Сарэзская. Тут не трэба было траціць шмат сіл і сродкаў на стварэнне штучнага вадасховішча — гэта зрабіла сама прырода.

Водныя запасы Паміра — велізарныя. Усе горныя рэкі і азёры з часам будуць служыць чалавеку, як служыць сёння рака Гунт, што забяспечвае электраэнергіяй горад Харог і многія калгасы. Самая галоўная рака раўніны Сярэдняй Азіі — Амудар'я — «жывіцца» вадою Паміра. З 10 тысяч квадратных кіламетраў ледавікоў, з якіх Амудар'я збірае сваю ваду, больш чым 7 тысяч прыпадае на Памір. Таму, калі праз пяскі Каракумаў вада Каракумскага канала прыходзіць у Ашхабад, гэта таксама вада Паміра.

Так, водныя запасы Паміра — велізарныя, але не бясконцыя. І таму ёсць яшчэ адна праблема, звязаная з рэкамі Паміра, над якой наўрад ці задумваліся ў мінулым памірцы, калі з дзівосным майстэрствам адводзілі ваду горных ручаёў і рэк на свае палі. Вада — гэта жыццё. Праблема толькі ў тым, каб горы — натуральныя накапіцелі і захавальнікі прэснай вады — выкарыстоўваць рацыянальна. І таму сёння чалавек думае не толькі аб тым, як ашчадней абыходзіцца з памірскай вадой, але і над тым, як павялічыць яе запасы. І хто ведае, магчыма, у будучым мы навучымся штучна збіраць у гарах ваду, намарожваць новыя ледавікі.

Д. БІЛЕНКІН.

# У ЦЯСНІНЕ ЧАРЫНА

Вышыня больш за чатыры тысячы метраў. Сотні метраў абледзянелага каменя крута абрываюцца ўніз. Удалячынь, нібы хвалі застылага мора, цягнуцца ланцугі горных хрыбтоў. З-за белых цюрбанаў іх вяршынь відаць бясконцыя лянівыя аблокі. Яны клубяцца ў цяснінах, чапляючыся за шчэць елак, пакідаючы на іх шматкі туману, падобныя на камячкі ваты. На грэбнях ляжыць снег, ва ўпадзінах складкі ледавікоў. Б'юцца ў каменных цяснінах пеністыя косы горных рэк. Увабраўшы ў сябе шматлікія ручаі і рэкі, абпальвае скалы белым агнём імклівы, капрызны Чарын. У яго цясніне прырода захавала для нас шмат рэліктаў — рэштак старадаўняй расліннасці. Нібы падпіраючы неба, стаяць па схілах саракаметровыя свечкі — цянь-шаньскія елкі. Яны захаваліся з трацічнага перыяду, пачатак якога ад нас аддзяляе амаль 70 мільёнаў гадоў.

Ніжэй, у раёне сёлаў Чунджа і Тас-Карасу, скалы, якія патрэскаліся ад спёкі і часу, нагадваюць егіпецкія піраміды. Бязлесыя гэтыя далі, як пісаў адзін з даследчыкаў гэтага краю, нагадваюць пустынныя землі Паўднёвай Амерыкі. Толькі ў каньёне ўступамі спускаюцца да Чарына тугайныя лясы. Месцамі яны дасягаюць шырыні да двух кіламетраў. Лес займае амаль пяць тысяч гектараў. Гэта і ёсць Чарынская дача — адна з жамчужын Алма-Ацінскай вобласці.

Яшчэ ў 1857 годзе П. П. Сямёнаў-Цяньшанскі, пераязджаючы праз раку Ілі ў раёне цяперашняга пасёлка Ілійска, бачыў гаі сагдзіянскага ясеня. Гэта было першае знаёмства еўрапейца з гэтай раслінай. Дайшоўшы да нас з трацічнага перыяду, ясень аказаўся менш устойлівы да геалагічных і кліматычных змен. У Чарынскай лясной дачы ён захаваў свае дагістарычныя калоніі. Тут існуе адзіны ў свеце унікальны гай рэліктавага ясеня. Уперамежку з кітайскай таполяй ён займае каля 900 гектараў. Асобныя дрэвы дасягаюць 30—35 метраў.

Па рашэнню Савета Міністраў Казахскай ССР у сакавіку 1964 года Чарынская водаахоўная зона была аб'яўлена помнікам прыроды. Вялікую работу па яго захаванню вядуць леснікі і егеры Ілійскага лягаса. Яны добра ведаюць кожны куток лесу, кожнае дрэва на сваім участку. Там-сям бачны сляды звяроў; у глухое мармытанне Чарына, які бяжыць па дне каньёна, уплятаюцца таямнічыя шолахі, галасы птушак. Часамі стаяць на скальных выступах, застылыя ў гордай позе, казулі.

Г. БАГАМОЛАЎ.

## ЧЫМ ХАРЧУЕЦЦА ХАНГУЛ?

Умяшанне чалавека ў прыроду, яго жаданне максімальна выкарыстаць натуральныя рэсурсы прыводзяць часам да самых нечаканых вынікаў. Вучоныя падлічылі, напрыклад, што безкантрольнае паляванне і змены ўмоў жыцця жывёл прывялі да поўнага знікнення 72 відаў млекакормячых. Яшчэ 600 відаў жывёл знаходзяцца на мяжы пагібелі.

Напэўна, цяжка знайсці ў Сярэдняй Азіі аматара прыроды, які б не чуў пра тугайнага ці бухарскага аленя, якога называюць яшчэ хангулам. Я не выпадкова ўжываю слова «чуў». Справа ў тым, што ўбачыць гэтае прыгожае тварэнне — прадстаўніка сярэднеазіяцкай фауны давялося людзям старэйшага пакалення. А вось пераважная большасць сённяшніх школьнікаў, у тым ліку будучыя біёлагі, такой магчымасці не маюць.

Так здарылася таму, што ў мінулым на тугайнага аленя вялі неразумнае паляванне, і нават тады, калі на ўсім працягу ад Чарджоу да Арала тугаяў заставалася ўсяго некалькі дзесяткаў, браканьеры працягвалі сваю справу: без жалю знішчалі апошніх аленяў. Цяпер у нізоўі Амудар'і хангул ужо не сустракаецца.

Нядаўна ў ніжнім цячэнні вялікай ракі створан Бадай-Тугайскі запаведнік. Яго супрацоўнікі паставілі перад сабой мэту: рэакліматызаваць хангула, які яшчэ захаваўся ў вярхоўі, у месцах яго пастаяннага знаходжання. Каб пазбегнуць магчымых памылак, біёлагі распрацоўваюць спецыяльную праграму падрыхтоўчых работ. Важнае месца ў ёй, як паведаміў дырэктар запаведніка, кандыдат біялагічных навук В. П. Лім, займаюць пытанні кармавога рацыёну бухарскага аленя. Дадзеных пра яго харч у прыаральскіх тугаях няма. А ў вярхоўі Амудар'і відавы састаў раслін, іх хімічныя і біялагічныя асаблівасці іншыя.

Такім чынам, натуралістам у першую чаргу трэба высветліць, якой расліннасцю харчаваўся хангул у Кара-Калпакіі, як ён прыстасуецца да новай ежы. Як толькі гэтыя і шэраг іншых пытанняў будуць вырашаны, будзе практычна вырашаным вяртанне хангула ў ніжнеамудар'інскія тугаі.

А. САЛАМАНЧУК.

## СУБТРОПІКІ АЗЕРБАЙДЖАНА

Прырода Азербайджана — казачны свет. Свет рэдкіх жывёл, раслін і дзівосных ландшафтаў. Ля ласкавага мора ляжыць субтрапічны Талыш, а на схілах блакітных узвышшаў — плантацыі чаю, сады, у нізінах — пасевы рысу.

У Азербайджане больш чым дванаццаць тысяч відаў жывёл, з іх — 92 віды млекакормячых, 350 відаў птушак, 88 відаў рыбы і больш чым дзесяць тысяч відаў безпазваночных. Тут мноства рэптылій. З-пад ног шмыгаюць круглагалоўкі, агамы, яшчаркі, сцінкі. Поруч з імі тут ёсць ядавітыя змеі — рагатая гадзюка, гюрза. У Азербайджане шмат чарапах, а берагі Каспія — сапраўднае птушынае царства. Асабліва шмат птушак у Кызылагаджскім запаведніку. У балотах і лясах Ленкаранскай нізіны зімуюць пеліканы, фламінга, лебедзі, жоўтая, шэрая, белая і егіпецкая чаплі, розныя віды гусей, качкі, бакланы, круглы год жыве тут паўднёвая красуня — султанка.

У Азербайджане — шэраг запаведнікаў. Сюды завезены плямісты алень, сайгак, амерыканскі янот, скунс, нутрыя і іншыя жывёлы.

## КВЕТКІ ПУСТЫНІ

Пяскі.... Як мы ўяўляем іх? Гарачыня, пясчаныя буры, знясіленыя падарожнікі, якіх падпільноўваюць змеі, скарпіёны, фалангі...

Вядома, яно бывае і так. Бываюць і пясчаныя буры і фалангі. Сапраўды, чалавек у пустыні без вады ўлетку можа пражыць не больш сутак, пустыня — грозная стыхія, з ёю — не жартуюць.

І ў той жа час для туркмена пустыня — гэта жыццё. З даўніх вякоў людзі змагаюцца з ёю і прыстасоўваюцца да яе, адступаюць і перамагаюць.

Мы былі ў пустыні вясною, у красавіку, калі пустыня самая цікавая. Цвілі блакітныя ірысы і чырвоныя макі, калыхаўся пад ветрам ілак — любімы ласунак авечак. Трава гэтая нагадвае іголку з карычневай шышкай-кветкай на вастрыі. У спякоту яна засыхае, авечкі знаходзяць і ўжываюць яе ў такім выглядзе. У снежныя зімы яны харчуюцца саксаулам. Саксаул у пустыні — харч для авечак і цудоўнае паліва, з яго яшчэ робяць і агароджы для жывёлы, але галоўная яго функцыя — стрымліваць пяскі. Праблемамі развядзення саксаула займаецца спецыяльны навукова-даследчы інстытут, які знаходзіцца на станцыі Раўніна. Тут жа ёсць і запаведнік флоры і фауны пустыні.

Тады, вясною, саксаул нагадваў кусты алешыны, толькі замест лісцяў — маленькія пупышкі салатавага колеру.

У Туркменіі вырошчваюць бавоўну, у горных і субтрапічных раёнах людзі займаюцца садаводствам. Але асноўны занятак туркменаў — усё ж авечкагадоўля.

Раскажам пра адну гаспадарку — каракулеводчы саўгас «Уч-Аджы». Саўгас займае тэрыторыю, амаль роўную па плошчы Мінскай вобласці. Дзеляцца абшары не на ўчасткі і брыгады, а на... калодзежы. Калодзежы — базы атары. Тут юрта чабана, загон для жывёлы.

У пасёлку школа, чыгуначная станцыя, бальніца, пошта, саўгасная канцылярыя і прыстань караблёў пустыні — вярблюдаў. Праўда, цяпер яны ўжо не «караблі» далёкага плавання, а хутчэй прыбярэжныя «кацеры» — возяць прадукты толькі да бліжэйшых калодзежаў. У больш далёкія пункты адпраўляюцца ўсюдыходы. На адным з іх прыехалі і мы, пакінуўшы за сабой кіламетры пяскоў.

Пустыня жыла, пераліваласа колерамі кветак, зелянела травою. Ля дарогі слупочкамі стаялі суслікі, паводзілі доўгімі вушамі тушканчыкі. Яны не ўцякалі ад машыны, ад людзей. Для скарпіёнаў, мабыць, яшчэ не настаў сезон ці іх тут, наогул, нямнога, але жукоў скарабеяў хапала. Яны каціці перад сабою катышы, пакідаючы на пяску ледзь прыкметныя дарожкі-каляіны.

Водзяцца тут джайраны, ваўкі. У трыснягах на беразе Каракумскага канала можна сустрэць дзікоў і нутрый.

Саўгас «Уч-Аджы» — інтэрнацыянальны. На яго землях працуюць людзі пятнаццаці нацыянальнасцей: туркмены, узбекі, казахі, белуджы, курды, рускія. Кожны носіць нацыянальнае адзенне.

За гады Савецкай улады ў жыццё туркменаў прыйшлі не толькі веды, матэрыяльная забяспечанасць, культура. Прыйшлі новыя звычкі і адносіны паміж людзьмі. Вось ветэрынарны ўрач курд Худайберды ажаніўся з туркменкай. Па дарэвалюцыйным законе яму пагражала смерць. Цяпер жа гэта ні ў кога не выклікала нават здзіўлення.

Братэрства савецкіх людзей тут адчуваецца на кожным кроку. І гэта адна з прычын таго, што пустыня квітнее.

А. ТРУКШЫНА.

## НАШ КАЛЯНДАР

### ЛІСТАПАД — СНЕЖАНЬ

Пэўна ж, нездарма народ назваў гэтую пару парой лістападу. Пад рэзкімі, парывістымі павевамі ветру раняюць дрэвы долу свой апошні ўбор. Мусіць, менавіта пра гэты час Якуб Колас пісаў:

Нікла жыцце ў цёмным лесе,
Агаляўся твар зямлі...

Неба нізкае, мутна-шэрае. З бясконцых хмар сеецца на зямлю дробны надакучлівы дождж, зрэдку пераходзячы ў мокры снег. Пад нагамі—слізкае, абрыдлівае месіва. Усё наўкол выглядае панура і змрочна. Апусціўшы мокрае, набраклае веццё, зажурана стаяць пры дарозе колішнія прыгажуні-бярозы. Дрыжаць чорным голлем кусты, самотна, быццам пакрыўджаныя, калеюць пад дажджом яблыні, ігрушы, слівы. Толькі дзе-ля платоў, у зацішку, яшчэ зелянее тлусты ліст лопуху ды напамінае аб мінулай летняй раскошы забыты на гародзе бурак.

Што і казаць: змрочная пара года — лістапад. Сонца амаль не паказваецца. Раніцою ноч неахвотна саступае дарогу дню — кароткаму і шэраму, каб неўзабаве зноў усё ўзяць у сваю ўладу.

Толькі адзін хвойны лес, бадай, не паддаецца подыху блізкай зімы: ён хоць і пацямнеў, паглушэў, але стаіць такі ж зялёны і велічна-спакойны. Пад яго густымі шатамі застаюцца зялёнымі і многія кветкавыя расліны — бруснічнік, грушанка, гірлянды плывунцу ды яшчэ мох.

Гола і ў полі. Цешаць вока хіба толькі стагі ды сціртытымі саломы — плён працы чалавечай, а таксама зяленіва — асабліва яркае і любае такою парою — азіміны і шматгадовых траў. Крыху пазней, калі ўдарыць мароз, а снег крыху запозніцца, тут знойдуць добры покарм зайцы, а часам забрыдзе мо і чыя карова — паласавацца ў апошні раз сакаўной свежасцю, аж да вясны.

Усё часцей неба дыхае холадам. Ртутны слупок няўмольна апускаецца ўніз, да нуля і ніжэй — лужыны на дарогах зацягваюцца пад раніцу ломкай, хрумсткай слюдой.

Адпаведныя змены адбываюцца і ў жывой прыродзе. Зніклі ягады — і птушкі шукаюць сабе іншай спажывы. Цецерукі, глушцы, рабчыкі пачынаюць дзяўбці пупышкі і маладыя парасткі дрэў. Падаліся бліжэй да чалавечага жытла сарокі, галкі, шэрыя вароны — тут усё-такі лягчэй расстарацца чаго-небудзь. У гарадах і вёсках з'яўляюцца сініцы. Адлятаюць запозненыя чародкі дзікіх галубоў, апошнія пралётныя качкі, белыя лебедзі. Рыхтуюцца да адлёту чыжы, кормячыся пакуль што насеннем бярозы, вольхі, сасны і яліны. У лесе застаюцца толькі попаўзні, дзятлы, сойкі ды некаторыя іншыя птушкі, што зімуюць тут, у родных мясцінах.

У звяроў заканчваецца лінька — усе стараюцца апрануць цяплейшае футра. Кладзецца ў бярлогу мядзведзь, засынае ў норы барсук і янотападобны сабака, сцішваецца, замірае ў зацішнім месцы, акрыўшыся лісцем, вожык.

Спіць і большасць рыб. Не спяць толькі драпежнікі — шчупак, акунь, мянтуз: яны бадзяюцца па вадаёмах у пошуках здабычы ўсю зіму.

Пахаваліся ў зімовыя кватэры і насякомыя. Матылькі і розныя жучкі зашываюцца ў мох, пад апалае лісце, пад кару пнёў і дрэў, у розныя шчыліны і трэшчыны. Лічынкі хрушчоў, вусені азімай соўкі і іншых насякомых зарываюцца глыбока ў зямлю, туды, дзе іх не дастане мароз.

У лістападзе восень сустракаецца з зімой. Першы снег, першы марозны дзень, першы лёд на рэчках і азёрах — таксама ў лістападзе. Аднойчы прачнешся раніцою, зірнеш у акно і не адразу зразумееш — ад чаго гэта так светла? Аказваецца, выпаў першы снег. Значыць, прыйшоў снежань, першы зімовы месяц. Ён, вядома, можа і спазніцца крыху, можа, наадварот, прыхапіць крыху і лістапада, але гэта не так ужо істотна: снежань ёсць снежань, пара самага кароткага дня і самай доўгай начы. 22 снежня працягласць дня — менш 7 гадзін на поўначы Беларусі і каля 8 гадзін на поўдні.

Менавіта ў снежні з'яўляецца ў Беларусі звычайна ўстойлівае снежнае покрыва. Вышыня ці таўшчыня яго — у сярэднім 5—7 сантыметраў. Часам пачатак зімы — наяўнасць снежнага покрыва — можа прыпадаць на пачатак студзеня.

Снежань у нас цяплейшы, чым ва ўсходніх раёнах Еўрапейскай часткі краіны. Тлумачыцца гэта тым, што зімою ў нас пераважаюць заходнія вятры Атлантыкі. Менавіта яны прыносяць да нас у снежні частыя адлігі.

У пачатку снежня на поўначы і ў канцы месяца на поўдні Беларусі рэчкі пакрываюцца лёдам, хоць бывалі выпадкі, калі рэкі замярзалі ў лістападзе і, наадварот, у студзені альбо нават у лютым.

Нягледзячы на тое, што снежань — месяц самага кароткага дня, прырода выглядае весялейшай, чым у лістападзе — месяцы самых цёмных начэй. Адчуванне гэтай весялосці, нават святочнасці надае ўсяму навакольлю снег — чысцюткая белая коўдра разаслалася без канца і краю. Цёпла пад ёю спачываць зямлі, цёпла зімаваць раслінам. Толькі, бадай, лясной жыўнасці гэтая белая коўдра не на радасць.

Цяжка здабываць ежу птушкам, асабліва тым, што харчуюцца насякомымі. Не дужа лёгка і астатнім пярнатым: пасправуй, раздзяўбі мёрзлую ягадзіну, здабудзь насенне клёна ці ясеня. Але — дзяўбуць! Тыя ж снегіры, напрыклад. Чачоткі кормяцца насеннем бярозы, крыжадзюбы — насеннем яловых шышак, а на дзіва шустрыя каралькі абшукваюць ствалы дрэў зверху да нізу — а раптам дзе трапіцца якая казюрка ці мошка. Разам з каралькамі завіхаюцца і сінічкі, а таксама попаўзні і стракатыя дзятлы. Паблізу будынкаў і на лясных палянах можна ўбачыць чачотак, шчыглоў, чыжоў, аўсянак і асабліва галак, сарок і варон.

Шукае палёвак і зайца ліса. Грызе кару асіны, а калі пашанцуе, дык і яблыні, заяц-русак, які не баіцца пасяліцца ля чалавечага жытла. Бяляк трымаецца бліжэй да лесу. Ласі і казулі, скінуўшы рогі ў пачатку снежня, ходзяць невялікімі статкамі, кормяцца яны парасткамі вярбы і бярозы, карой дрэў. Вавёрка ласуецца яловым насеннем і прызапасенымі арэхамі ды грыбамі. Ваўкі трымаюцца бліжэй да сцежак і дарог, спадзеючыся пажывіцца якой-небудзь хатняй жывёлінай.

У дні адліг у лесе пануе ажыўленне. Тады чуецца звонкі голас вялікай сініцы, перагукваюцца між сабою чубатыя амялушкі, жоўта-зялёныя чыжы, вясёлыя шчыглы, гучней, чым звычайна, трашчаць сарокі. У такія цёплыя дні кепска спіцца ў бярлозе мядзведзю, прачынаецца барсук...

Зіма са сваімі суровымі маразамі і мяцеліцамі не можа спыніць жыцця прыроды. Яна, ахутаўшыся снежным шалікам, спачывае, набіраецца сіл...

●

Позняя восень і пачатак зімы — пара адпачынку хлебаробаў. Але сякая-такая работа ёсць і зараз. Пэўнай увагі патрабуе, напрыклад, сад. Трэба ачысціць кару дрэў ад гнёздаў шкодных насякомых, прарэдзіць кроны, зняць зімовыя гнёзды вусеняў баярышніцы і залатагузкі. Пасля таго, як выпадзе снег, неабходна яго абціснуць вакол дрэва, каб мышы і вадзяныя пацукі не маглі дабрацца да стваloў і да карэнняў. Рэкамендуецца таксама раскладваць атручаныя прынанкі ў норкі. Для таго, каб прывабіць у зімовы сад птушак, варта зрабіць і расставіць на дрэвах палічкі і паднавесікі і класці на іх корм.

### НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

Калі ў лістападзе туман — будуць зімой часта адлігі і позняя вясна.

●

Рана пахаладала — да ранняй вясны.

●

Калі лісце з дубоў і бяроз абляцела дружна — будзе мяккая зіма.

●

Сям-там лісце на дрэвах засталося — да суровай зімы.

●

Калі снежань сухі — будзе сухая вясна і сухое лета.

●

Снежань цёплы і мокры — да зацяжной зімы і позняй, халоднай вясны.

●

Калі снег мокры і цяжкі — чакай мокрага лета, а калі сухі і лёгкі — лета будзе сухое.

●

Калі першага снежня добрае надвор'е — будзе пагодлівая і ранняя вясна.

●

Калі ў сярэдзіне снежня шмат снегу — будзе добрая трава.

## ШКОЛЬНАЯ ФЕРМА

— Хто хоча навучыцца пілаваць і стругаць? — Выкладчык працы Міхась Іванавіч Трафімчык уважліва паглядзеў на прыціхлых хлапчукоў.

Першымі падняліся Ваня Арцюкевіч, Алег Багданкевіч і Ваня Урбановіч...

Разам з Міхасём Іванавічам яны накіраваліся ў школьную майстэрню. Адны хлопчыкі рыхтавалі вызначаных памераў дошкі, іншыя збівалі скрынкі.

— І навошта нам патрэбны гэтыя скрыні? — пацікалі плячыма дзеці.

Міхась Іванавіч загадкава ўсміхаўся.

— Пачакайце крыху, усяму свой час.

А хутка ў майстэрні з'явілася жалезная сетка. І тут усе здагадаліся, што рабілі яны самыя звычайныя клеткі.

Але зноў загадка: для каго?

Усе зробленыя клеткі вучні перанеслі ў спецыяльнае памяшканне. Вось тады Міхась Іванавіч і адкрыў сакрэт:

— У вольны ад заняткаў час вы збіраеце металалом, макулатуру, даглядаеце школьны гарод. Гэта патрэбная і карысная справа. Але... Вось нядаўна быў я ў праўленні калгаса, пазнаёміўся там з цікавымі лічбамі: які стане наш калгас праз некалькі год. Твая, Ваня, мама, Алегаў бацька і іншыя калгаснікі будуць дабівацца высокіх ураджаяў бульбы, жыта, пшаніцы, павышаць надоі малака. А якую карысць можам прынесці роднаму калгасу мы?

Вучні задумаліся, прыціхлі.

— Я вось быў у некалькіх школах нашага раёна,— працягваў Міхась Іванавіч.— Там піянеры і камсамольцы гадуюць трусоў. А мы ж не горшыя за іх...

Мінуў час. І аднойчы ля школы спынілася машына. Уся школа выйшла сустракаць сваіх будучых гадаванцаў. Трусы былі трох парод: белы велікан, срабрысты велікан, чорна-бury. Даглядаць іх даручылі Ваню Грыбу, Алегу Багданкевічу, Ваню Урбановічу...

Зараз на школьнай трусагадоўчай ферме каля пяцідзесяці звяркоў. Іх даглядаюць дванаццаць хлапчукоў і дзяўчынак — цэлая брыгада. Кожны год юныя трусаводы нарыхтоўваюць на зіму авёс, сена, буракі, капусту, моркву.

Але гэта яшчэ не ўсё. Неяк Міхась Іванавіч прынёс у школу дзіўнага звярка: вялізныя вусы, хвост, быццам рыдлёўка, а зубы — пальцаў не падстаўляй.

— Гэта нутрыя,— растлумачыў Міхась Іванавіч.— Разводзяць іх таксама, як і трусоў. Толькі футра і мяса яе каштуюць даражэй.

Так на школьнай ферме з'явіліся навасёлы — нутрыі. Спачатку клопату з імі было шмат. Аднойчы не дагледзелі, і адна нутрыя збегла на возера і не вярнулася. А ў клетцы засталіся яе зусім маленькія дзіцяняты. Але юныя звераводы не разгубіліся: некалькі дзён кармілі малых цёплым малаком, якое налівалі ў бутэльку з соскай. Усе дзіцяняты выжылі. Зараз на ферме каля дваццаці нутрый.

...Цікавыя планы школьных звераводаў на будучыню. У бліжэйшы час яны збіраюцца расшырыць памяшканне фермы, пабудаваць новыя клеткі для трусоў і нутрый. Радуецца за сваіх выхаванцаў Міхась Іванавіч Трафімчук. Гэта ж ён зацікавіў вучняў патрэбнай і карыснай справай.

Ёсць у Волменскай школе-інтэрнаце Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці і свае пчалаводы. Пад іх апекай знаходзіцца каля дзесяці сем'яў пчол.

Часта ў рабят адбываюцца цікавыя дыскусіі.

— Няма лепшай прафесіі, чым пчаляр,— гавораць адны.

— Няпраўда,— пярэчаць другія.— Лепш працаваць на ферме.

— Самая ганаровая праца — праца земляроба,— не згаджаюцца з імі трэція.

Спрэчкі, спрэчкі, спрэчкі... Галоўнае тут — у іншым. Усе прафесіі добрыя. З цягам часу кожны выбера сабе нейкую адзіную, тую, якая стане галоўнай на ўсё жыццё. І хораша, што ўжо сёння хлопчыкі і дзяўчынкі «прымерваюцца», калі можна так сказаць, да яе, сваёй будучай прафесіі.

М. ТКАЧОЎ.

## ШАНУЙ СВАЙГО СЯБРА

Я вельмі люблю лес, яго цішыню і спакой, птушыны гоман і сонечную стракатасць палян. А які цудоўны ён позній восенню! Гэта ні з чым не параўнаны цуд. Восеньскі лес, багаты на грыбы і арэхі,— найлепшае месца адпачынку. Хаджу, хаджу я па лесе, а калі стамлюся — сяду пад бярозкай і вяду з ёю размову. Яна слухае ўважліва, ні адным лісцікам не зварухне.

Аднойчы прынесла я бярозку з лесу і пасадзіла ля хаты, пад акном. Даглядала яе старанна: абкопвала, вадою палівала. Цяпер яна ўжо значна падрасла. Сустракаемся мы штодня. Іду ў школу — яна мне быццам поспехаў жадае. Вяртаюся дадому — яна свае галінкі да мяне працягвае, быццам з вяртаннем віншуе.

Аднойчы я моцна прастудзілася. Мама пайшла да бярозкі, нарвала на ёй пупышак і зрабіла мне бярозавы адвар. Я піла яго і хутка мне стала лягчэй. А калі я ачуняла зусім, дык першым чынам пабегла да бярозкі. Якая радасная гэта была сустрэча!

Цяпер мая бярозка панікла — холадна на дварэ, сцюдзёна. Але я веру, што вясной яна ажыве, расквітнее.

Я расказала гэта для таго, каб сказаць усім сваім равеснікам і аднагодкам: беражыце лес, клапаціцеся аб кожным дрэўцы. За гэта лес аддзякуе аддана і шчодра.

Таня АНЦІПАВА,
вучаніца 8 класа СШ № 3.

г. Рэчыца.

## МІНІЯЦЮРЫ

### АДНОЙ ДАРОГАЙ

Выйшаў я з дому рана. Падыходжу да хмызнякоў, што за вёскай, а там ужо — свежыя сляды. Нехта апярэдзіў мяне. «І калі толькі,— здзіўляюся,— спяць людзі?»

Глыбокія ў мяккім снезе сляды то зліваліся ў адну баразёнку, то шырока разыходзіліся ў бакі. Я ступаў па іх і ў думках прыкідваў, хто б гэта мог быць.

Сляды вывелі мяне да лясной ручаіны. Спусціўся з пагорка ў нізінку. Гляджу — у лёдзе невялічкая палонка. Чарнее, нібы той сподачак. Ручаінка плыткая, на дне жоўты пясочак відзён, а па пясочку чыстая вадзіца струменіцца.

І толькі тут зразумеў я, што сляды, па якіх ішоў сюды, не чалавечая, а ласіныя: на цвёрдым лёдзе засталіся выразныя адбіткі капытоў. Ага, значыць, гэта ласі і палонку прабілі. Напіліся і пайшлі сваёю дарогаю.

Я таксама прысеў напіцца. Падымаю галаву — заяц па майму следу бяжыць...

Што зробіш, калі зімой у лесе мала дарог? От таму і людзі, і звяры — усе ходзяць адны мі і тымі ж сцежкамі.

Рыгор ІГНАЦЕНКА.

### ПАМЯЦЬ

Мы доўгі час жылі з дзядзькам Антонам на адной вуліцы, і я мог бы расказаць пра яго шмат што: і які заядлы грыбнік быў дзядзька Антон, і пра яго любоў да рыбалкі, і пра яго руплівасць на рабоце. Але часцей за ўсё прыгадваецца мне адна даўняя зіма.

Ціснулі маразы. Лясной жыўнасці даводзілася туга. Нават курапаткі шукалі паратунку каля людзей — не баяліся прылятаць на ўскраіну горада. А аднойчы мы ўбачылі паблізу заечыя сляды. Заяц у горадзе, каля яблынек, якіх ніхто ніколі і не думаў абвязваць? Дай ты веры! У першую ноч ён пашкодзіў дрэўцы ў адным садзе, потым — у другім. Трэцяй ад поля была хата дзядзькі Антона з добра дагледжаным садком.

— У Антона стрэльба. Нікуды даўгавухі не дзенецца, трапіць у гаршчок,— гаварылі суседзі.

Уначы, сярод настоенай марознай цішы, сапраўды прагрымеў стрэл. А раніцой уся вуліца пакеплівала з дзядзькі Антона:

— Ну й стралок! З пяці метраў у зайца не трапіў!

...Толькі ўлетку, на рыбалцы, прызнаўся мне дзядзька Антон, што знарок не трапіў у зайца.

— Калі звер бяжыць да чалавека, значыць, спадзяецца на яго ласку і дабрату. У каго ж рука падымецца страляць у яго?

Многае забылася, а от гэтыя дзядзькавы словы не забываюцца.

Яўген ПУШКІН.

# РАЧНЫЯ БАБРЫ



У свеце, бадай, знойдзецца мала жывёл, якія б па сваіх біялагічных асаблівасцях, звычках і значэнню ў жыцці чалавека маглі паспрачацца з бабрамі. Гэтыя буйнейшыя грызуны, вага якіх дасягае 30 і больш кілаграмаў, не маюць сабе роўных па сваіх будаўнічых навыках. Ніякі іншы звер, акрамя бабра, не будуе сабе такіх хатак (вышынёй больш двух метраў і даўжынёй да трынаццаці метраў), не ўзводзіць плацін (да шасцісот метраў даўжынёй і больш двух метраў вышынёй), не стварае такой густой сеткі нор і каналаў, працягласць якіх можа быць у некалькі сот метраў. Бабры таксама непераўзыдзеныя плыўцы і рэкардсмены па працягласці знаходжання пад вадой (да пятнаццаці мінут).

Папрацаваў тут не тапор, а бабровыя разцы...



Жывуць бабры сем'ямі, у якіх двое старэйшых выхоўваюць адначасова два пакаленні дзяцей апошніх двух гадоў нараджэння. Сем'і налічваюць 8—10 асобін, бо звычайна бабрыха прыводзіць ад трох да пяці бабранят. Уся сям'я прымае чынны ўдзел у рабоце. А работа гэтая, як для жывёлы, надзвычай разнастайная: бабры згрызаюць асіны, дубы, вербы (часам вельмі тоўстыя, да метра ў дыяметры), беспамылкова валяць дрэвы ў патрэбны бок, абгрызаюць сукі, «пілуюць» на кавалкі ствалы і ўсё гэта па каналах і сцежках сплаўляюць і перацягваюць да свайго жытла. Тонкія галіны і кара дрэў скарыстоўваецца як надзённы корм, а восенню з іх робяцца запасы на зіму. Адна сям'я нарыхтоўвае часам 80—100 кубаметраў драўніны. Такіх запасаў хапае звяркам на ўсю зіму, і многія сем'і ўзімку зусім не выходзяць на паверхню, хоць пры неабходнасці бабры лёгка прагрызаюць палонкі ў лёдзе, няхай сабе яго таўшчыня дасягае пяцідзесяці сантыметраў.

Бярвенцы і таўсцейшыя галіны бабры змацоўваюць глеем і воднай расліннасцю. Гэта іх будаўнічы матэрыял, з якога яны ўзводзяць свае хаткі (у хатцы бывае да чатырох пакояў, якія размешчаны на розным узроўні) і плаціны, якія размяшчаюцца на рэчцы ці ручаі каскадам, праз некалькі дзесяткаў метраў адна ад адной. Робіцца гэта для таго, каб падтрымліваць патрэбны ўзровень вады на магчыма большым участку рэчкі, калі яна недастаткова глыбокая. Унікальны каскад бабровых плацін знаходзіцца, напрыклад, у Бабінавіцкай спартыўна-паляўнічай гаспадарцы Віцебскай вобласці на невялікім Васілёвым ручаі.

У красавіку-маі, калі чакаецца з'яўленне чарговага патомства, бабраняты пазамінулага года нараджэння пакідаюць сям'ю і ў часе вясенняй паводкі выпраўляюцца на пошукі месца жыхарства. Аблюбоўваюць яны невялікія азёры альбо ціхія рачулкі, багатыя на водную расліннасць, з берагамі, парослымі травой і хмызнякамі. Знайшоўшы падыходзячы ўчастак, бабры неадкладна прымаюцца за работу. Перш-наперш яны пазначаюць межы сваіх уладанняў пахучымі выдзяленнямі залоз — «бабровым струменем». Гэта азначае, што месца занята і доступ непажаданым гасцям закрыты. Увогуле бабры міралюбныя звяркі, але калі на іхні ўчастак паквапляцца няпрошаныя прыхадні, гаспадары смела атакуюць іх і праганяюць. У такіх выпадках бабры адольваюць нават такіх спрытных і дужых драпежнікаў, як выдры.

Гістарычна склалася так, што першабытны чалавек сяліўся ў тых жа мясцінах, што і бабры — па берагах рэк і азёр. Мусіць таму бабры спрадвеку былі адным з галоўных аб'ектаў яго палявання. Пры раскопках старажытных гарадзішчаў на Нёмане, Дняпры, Сажы і ў іншых мясцінах Беларусі знойдзена велізарная колькасць бабрыных касцей, што сведчыць аб значэнні баброў у жыцці першабытнага чалавека. Пазней, у часы Кіеўскай Русі, на думку шэрагу спецыялістаў, існавала своеасаблівая сістэма бабровых гаспадарак, так званых «бабровых гонаў», якія здаваліся князямі ў арэнду гарадам альбо абшчынам. Былі спецыяльныя брыгады «баброўнікаў», члены якіх вызваляліся нават ад вайсковай павіннасці.

У сярэдневяковай Маскве існавалі спецыяльныя бабровыя і сабаліныя гандлёвыя рады, у той час як уся астатняя пушніна адносілася да разраду «мяккага хламу» і прадавалася асобна, у тым ліку нават шкурка куніцы — таксама каштоўнага звера.

Калісьці ў Беларусі існавала нават прымаўка: «Не заб'еш бабра — не будзеш мець дабра» — гэта значыць, не разбагацееш. Але па меры вынішчэння баброў феадалы цалкам захапілі права на іх промысел і жорстка каралі «смердаў» за парушэнне гэтага права. І тады ранейшая прымаўка перайначылася: «Заб'еш бабра — не будзеш мець дабра».

З развіццём капіталізму вынішчэнне баброў прыняло драпежніцкі характар. Баброў забівалі галоўным чынам дзеля «струменю», кошт якога быў на вагу золата. Апошняе трэба разумець літаральна: на адну талерку вагаў клалі «струмень» і ўраўнаважвалі яго адпаведнай колькасцю залатых манет. Тлумачыцца гэта тым, што доўгі час у многіх народаў бытавала ўяўленне аб дзівосных лекавых якасцях «бабровага струменю»: нібыта ён лечыць ледзь не ўсе вядомыя на той час хваробы.

У выніку к 20-м гадам нашага стагоддзя бабры, якія калісьці насялялі азёры і рэкі Еўропы і Азіі ад Атлантыкі да Усходняй Сібіры, былі амаль цалкам вынішчаны. Засталося толькі некалькі мясцін, дзе яны ўцалелі, але і то ў невялікай колькасці. Напрыклад, у басейнах Сожа, Бярэзіны і Нёмана налічвалася ўсяго каля трохсот рачных дойлідаў.

Савецкая ўлада прыняла неадкладныя меры для зберажэння і размнажэння каштоўнага звера. Былі створаны Бярэзінскі і Варонежскі запаведнікі і шэраг спецыяльных бабровых заказнікаў. Усё гэта дало добры плён.

Зараз толькі ў Беларусі налічваецца каля трыццаці тысяч баброў — сорак працэнтаў ад усіх баброў, якія жывуць у нашай краіне. За апошнія гады ў нашай рэспубліцы было адлоўлена каля пяці тысяч звяркоў для расселення іх у іншых раёнах краіны — ад Прыбалтыкі да Сібіры. З 1963 года пачата ў нас і прамысловая здабыча бабра, якая праводзіцца, канечне, па ліцэнзіях спецыяльна падрыхтаванымі брыгадамі бабраловаў і пад строгім адміністрацыйна-навуковым кантролем. Здабыча бабра праводзіцца не толькі з-за яго каштоўнай шкуркі і «струменю» (апошні шырока ўжываецца ў парфумнай прамысловасці), але і для таго, каб рэгуляваць колькасць і расселенне звяркоў, бо ў асобных мясцінах іх шчыльнасць стала настолькі высокай, што не засталося месца для расселення прыплоду і рэзка скарацілася кармавая база. Гэты навукова абгрунтаваны промысел не толькі не прывёў да скарачэння агульнага пагалоўя баброў, а, наадварот, спрыяе хутчэйшаму ўзнаўленню кармавой раслліннасці, стварае лепшыя ўмовы для расселення і жыцця бабровага маладняку, увогуле амаладзіў і аздаравіў папуляцыю баброў.

Зараз беларускія бабры, калі можна так сказаць, перажываюць сваю другую маладосць, і далейшы лёс гэтага раней амаль вынішчанага звера не выклікае непакою. І гэта лепшы прыклад таго, як чалавек, клапатліва і ашчадна ставячыся да роднай прыроды, можа зрабіць яе яшчэ больш багатай і цудоўнай.

Э. САМУСЕНКА.

Фота П. КАЗЛО і Л. КОЛБІНА.



Жыллё «рачнога архітэктара».

Не адзін год працавалі бабры над гэтай грэбляй...



# ЛЕШЧ

Звычайна лешч — самы галоўны і важны прадстаўнік свайго роду, да якога належаць таксама рыбец, сінец і іншыя. Усе гэтыя рыбы вылучаюцца больш ці менш сціснутым целам, вельмі высокім і вузкім спінным плаўніком. Ляшча лёгка адрозніць ад іншых рыб. Галава ў яго невялікая, рот вельмі малы. Маленькія ляшчы, якіх завуць падлешчыкамі, значна вузейшыя, маюць большыя вочы. Колер цела ў ляшча таксама мяняецца з узростам: маладыя ляшчы шаравата-белыя з серабрыстым адценнем, потым яны паступова цямнеюць і атрымліваюць буравата ці чарнаваты колер з залаціста-жоўтым адценнем.

Ляшчы дасягаюць значных памераў. Самыя вялікія сустракаюцца ў азёрах Шатландыі, але і ў нас таксама сустракаюцца сапраўдныя волаты. Вядомы выпадкі, калі надараліся (напрыклад, на Віцебшчыне) ляшчы вагой з пуд. Распаўсюджванне ляшча даволі шырокае. Яго можна сустрэць амаль па ўсёй Еўропе. Аднак у Сібіры ляшча зусім няма і ён сустракаецца толькі ў некаторых зауральскіх азёрах. У адкрытым моры ляшчы амаль не сустракаюцца. На думку рыбакоў, яны слепнуць ад салёнай вады.

Ва ўсе поры года ляшчы жывуць вялікімі чародамі, акрамя лета. Месцам свайго жыхарства яны выбіраюць глыбокія рачныя затокі, часцей гліністыя ямы пад кручамі. У азёрах і асабліва ў сажалках ляшчы любяць гліністае, крышку мулаватае, але не ціністае дно. Дарослыя ляшчы сустракаюцца на пясчаных месцах толькі зрэдку ў час сваіх пераходаў для пошукаў ежы.

Вызначаюць тры галоўныя перыяды нерасту гэтай рыбы, якія падзелены паміж сабою 7—10 дзённымі прамежкамі. Першымі пачынаюць нераставаць дробныя, затым буйныя ляшчы. Нераст працягваецца каля месяца. Рыба кладзе ікру на травяністых водмелях, у неглыбокіх залівах, а таксама ў месцах, затопленых вадою. У Беларусі нераст ляшча прыпадае на май. Адна самка адкладае да 140—150 тысяч ікрынак. Гэтым і тлумачыцца шырокае распаўсюджванне ляшча.

Як адзначалася, ляшчы не любяць мясцін з роўным пясчаным дном і бываюць тут толькі зрэдку. Такім чынам, ляшча трэба шукаць на гліністых і мулаватых глыбокіх месцах. Аб прысутнасці ляшча можна меркаваць па характэрнаму «плаву». Перад навальніцаю, у спёку, а таксама ў ветраныя дні ляшчы ўзнімаюцца на паверхню, каб потым зноў схавацца ў глыбіні. Пры гэтым яны высоўваюць з вады спачатку галаву, потым спінны плаўнік і, нарэшце, хвост. Акрамя таго, ляшча можна адрозніць ад іншых рыб па яго звычнаму чмяканню: ён любіць «смактаць» маладыя парасткі водных раслін. Некаторыя вопытныя вудзільшчыкі ўгадваюць прысутнасць ляшча па дробных бурбалках, якія ён пускае, капаючыся на дне.

Вуджэнне ляшчоў пачынаецца з ранняй вясны і заканчваецца позняй восенню. Праўда, улетку здараюцца перапынкі. Зімою лешч трапляецца на кручок выпадкова. Ляшчы не засынаюць на зіму. Не падкарміўшы напярэдадні ляшча, яго можна злавіць толькі ў самую спёку, неўзабаве пасля нерасту. Звычайна рыбаловы робяць прынаду там, дзе ляшчы маюць сваю пастаянную «рэзідэнцыю». Аднак не трэба кідаць шмат смачнага корму. Колькасць прыкорму павінна быць небагатай, а якасць яго — ніжэйшая за якасць насадкі. Пры вуджэнні ў мулаватых месцах карысна высыпаць у ваду, каб прынадзіць рыб, некалькі вёдзер пяску.

Насадка для ляшчоў — чырвоныя гноевыя чарвякі ці хлеб. Прычым у адных мясцінах ляшчы аддаюць перавагу чарвякам, а ў іншых — хлебным шарыкам. Насадкамі таксама могуць служыць апарышы, ліняючыя ракі, радзей матыль.

# ЭТЫКЕТ ПАЛЯЎНІЧАГА І РЫБАЛОВА

Слова этыкет — французскага паходжання, і ў перакладзе яно азначае ярлык, этыкетка і цырыманіял, гэта значыць, парадак правядзення нейкай цырымоніі. У цяперашні час слова этыкет азначае: «устаноўлены парадак паводзін, формы абыходжання ў якім-небудзь грамадстве» (акадэмічны слоўнік сучаснай рускай мовы).

Дык вось, пра этыкет, пра паводзіны людзей, якія выбіраюцца са стрэльбай у лес і з вудай на рэчку...

Этыкет паляўнічага і рыбалова не з'яўляецца сумай нейкіх асаблівых рэкамендацый і правіл, а, як і ўвогуле этыкет савецкага чалавека, вызначаецца правіламі і прынцыпамі камуністычнай маралі.

На працягу гісторыі чалавечага грамадства мэты, змест і формы палявання няспынна змяняліся. Для старажытных плямёнаў, якія бясконца вандравалі, паляванне было асновай існавання. У ранняе сярэдневякоўе паляванне таксама шмат у чым задавальняла патрэбы ў прадуктах харчавання. Але ў эпоху феадалізму народ страціў права на рыбную лоўлю і паляванне, уступіўшы яго арыстакратам. Неўзабаве феадалы атрымалі выключнае права на паляванне і яно ператварылася ў пышную прыдворную забаву.

Карысліваcць, паляўнічая зайздрасць і азарт пры капіталістычнай сістэме арэнды паляўнічых участкаў прыводзілі да поўнага вынішчэння дзічыны на іх. Прыдворнае паляванне мала чым адрознівалася ад масавай бойні, сэнс палявання знік і яно ператварылася ў стральбу па жывой мішэні.

У міфах старажытных рымлянаў ёсць чароўны вобраз багіні палявання Дзіяны. Мастакі паказваюць яе ў вобразе грацыёзнай жанчыны, легканогай, з прыгожым тварам і зоркімі вачыма, з лукам у руках і калчанам ля пояса. І гэты вобраз адлюстроўвае тую вечна маладую чароўнасць, жыццярадаснасць, якія ўласцівы ўрачыстасці палявання.

У сувязі з гэтым хочацца нагадаць выказванне І. С. Тургенева. У пісьме да М. А. Някрасава ён пісаў: «Зараз абмяжуюся жаданнем, каб паляванне, гэтая забаўка, якая зблізіае нас з прыродай, прывучае нас да цярплівасці, прыдае целу нашаму здароўе і сілу, а духу — бадзёрасць і свежасць... доўга б яшчэ працвітала на нашай Радзіме!»

Паляванне — найбольш блізкі і захапляючы шлях да глыбокага пазнання прыроды, а паляўнічы — найбольш пільны назіральнік жывёльнага свету, поўнага таямнічай і казачнай прыгажосці.

Даўно заўважана, што адносіны да прыроды выяўляюць маральны воблік асобы чалавека. Чалавек, які ўсведамляе адказнасць за захаванне багаццяў краіны, ніколі не дазволіць сабе варварскіх адносін да прыроды. У лесе, ля глухога возера ці на беразе несамавітай рачулкі ён паводзіць сябе так як у садзе, які ён сам пасадзіў і вырасціў.

Гэта ўсё датычыць і паляўнічага, паводзіны якога павінны адпавядаць этычным нормам грамадства.

Такім чынам, паляванне — гэта не разбой, калі знішчаецца ўсё жывое, паляванне — гэта не нагода скарыстаць шматлікія спосабы здабычы і лоўлі, паляванне — гэта найлепшы адпачынак сярод маляўнічай прыроды.

Паляўнічы хутчэй, чым хто-небудзь іншы, заўважыць і падбярэ птушанё, што выпала з гнязда, ён умее глядзець са спагадай і замілаваннем на маленькае зайчанё, непакоячыся аб тым, каб яго выпадкова не пакрыўдзіў сабака.

Змяніліся часы і шмат якія ўяўленні. Меркай усіх спраў стаў чалавек, дзеля якога мы ахоўваем прыроду, клапоцімся пра дзічыну і здабываем яе.

Сутнасць палявання не ў тым, каб здабыць як мага больш трафеяў.

Права на паляванне павінна быць высокім гонарам і абавязкам паляўнічага. Да яго клопатаў пра дзічыну далучаецца і абавязак прытрымлівацца правіл палявання. Права на паляванне павінен атрымліваць толькі той, хто выконвае пісаныя і няпісаныя законы нават у самым глухім кутку прыроднага рэзервата.

Выхаванасць — агульнапрызнаная рыса культурнага чалавека наогул. Такім чынам, і крытэрыем культуры паляўнічага павінен быць, па-першае, высокі ўзровень спецыяльных ведаў і, па-другое, уменне паводзіць сябе на паляванні.

Вось гэтых ведаў, гэтага ўмення ў нас часам і не хапае.

Паляўнічы мінімум, які патрабуецца ад таго, хто ўступае ў таварыства паляўнічых, безумоўна, яшчэ недастатковы. Адказаць больш-менш здавальняюча на пастаўленае пытанне — вельмі мала для таго, каб атрымаць паляўнічы білет. Неабходна, каб кандыдат у члены таварыства паляўнічых пасля здачы паляўнічага мінімуму яшчэ нейкі тэрмін атрымліваў права на паляванне толькі ў паляўнічай гаспадарцы пад кантролем кваліфікаваных паляўнічых, дзе ён здолее прадэманстраваць сваю сталасць і набудзе неабходныя навыкі для самастойнага палявання.

Што такое правільнае паляванне? Гэта не проста паляванне на дзічыну (на якую наогул паляваць не забаронена) у дазволены тэрмін, у дазволеным месцы, з выкананнем устаноўленых норм здабычы. Гэта яшчэ і выкананне правіл, якія склаліся на працягу стагоддзяў. Для таго, каб не парушаць правілы палявання на дробную балотную дзічыну, на вывадкі цецерукоў увосень, патрэбна паляваць з выжлам. Для таго, каб правільна ўпаляваць зайца па парошы, патрэбна спачатку знайсці «манок» і ісці па следзе да месца яго лежкі. Каб правільна паляваць з ганчакамі, патрэбна страляць пераважна з-пад гону.

Прапаганда ў паляўнічых гаспадарках правіл палявання спрыяе павышэнню нашай паляўнічай культуры, і калі гэтую задачу мы вырашым, знікне неабходнасць напамінаць пра тое, што заходзячы ў памяшканне, неабходна разрадзіць стрэльбу.

Аднак колькі б ні выдавалася добрых законаў і прыватных пастаноў, усяго прадугледзець немагчыма. У справе палявання вялікае значэнне мае гонар, сумленне і наогул духоўны воблік паляўнічага і рыбалова-аматара.

Паляўнічы, выходзячы са стрэльбай, ставіць сябе ў асаблівае, часам даволі складанае становішча ў адносінах да прыроды наогул і да тых жывёл, забіваць якіх ён узяў на сябе права. Прытым адзіным суддзёю сваіх учынкаў з'яўляецца ён сам і яго сумленне.

Найбольшая загана многіх паляўнічых — празмерная стральба. І чым дзічыны меней, тым больш у лесе стрэлаў. Мы часта бачым у паляўнічых пусты патранташ (стралялі, значыць, шмат) і... пустую сумку. Можна не сумнявацца, што ў лесе засталося шмат падранкаў, бо паводле падлікаў выдатнага паляўнічага С. А. Бутурліна, сярэдні стралок робіць каля 60 працэнтаў трапных стрэлаў.

Выклікае пярэчанне і стральба па чародах. Часам, стрэліўшы дуплетам з адлегласці ста метраў, удаецца выбіць з чарады качку, і паляўнічы ў такім выпадку задаволены: «Ах, які трапны стрэл!» А трапнага стрэлу якраз і не было: проста наляцела няшчасная качка на смяротную шрацінку. Ні з пункту гледжання «сумленнага палявання», ні ў сэнсе аховы прыроды гэта зусім не «па-паляўнічаму».

Непрыемная і шкодная, але шырока распаўсюджаная з'ява — паляўнічая прагнасць, нягледзячы на тое, адкрытая яна ці замаскіраваная пад «нястрымную паляўнічую страсць». На жаль, паляўнічая прагнасць мае месца і зараз.

Нельга не згадаць адкрыццё палявання на вадаплаўных птушак у наваколлі Прыпяці. Сярод паляўнічых былі класныя стэндавыя стралкі, паляўнічыя пажылога ўзросту і зусім маладыя. Калі б ва ўсіх гэтых людзей было сапраўднае паляўнічае сумленне, любоў і замілаванне да жывой прыроды, многія паляўнічыя не паводзілі б сябе так агідна, як у той дзень. Менавіта паляўнічай прагнасцю можна растлумачыць той факт, што некаторыя надта «гарачыя» паляўнічыя пры выхадзе на змярку імкнуліся абагнаць адзін аднаго, каб раней дабегчы да балот і заняць найбольш зручнае месца. Такія паводзіны не толькі псуюць усім астатнім удзельнікам палявання настрой і задавальненне ад яго, але і прыводзяць да браканьерства. А які выгляд у такіх паляўнічых?! Дзічына ў іх сетках набіта як папала, ім некалі займацца ўкладкай птушак. Забіў, наспех запіхнуў у сетку і пабег за наступнай. Такое жорсткае знішчэнне дзічыны не мае нічога агульнага з сапраўдным паляваннем, а такія бязлітасныя людзі — з паляўнічымі.

Вельмі распаўсюджанае парушэнне этыкі — стральба па дзічыне, якая паднята чужымі ганчакамі. І яшчэ горш тое, што, упаляваўшы «чужога» звера або птушку, паляўнічы, не жадаючы даваць тлумачэнні гаспадару сабакі і аддаваць трафей, стараецца замесці сляды. Згодна старому паляўнічаму правілу, той, хто нешта ўпалюе такім чынам, павінен дачакацца гаспадара сабакі, уручыць яму трафей і папрасіць прабачэння. А той вяртае яму патрон. Нешта пачалі забываць у нас гэты звычай.

Мы гаварылі ў асноўным пра тыя выпадкі, калі паляўнічы дзейнічае адзін і вызначае свае адносіны да дзічыны, аховы прыроды, а таксама да іншых паляўнічых згодна са сваім паляўнічым сумленнем. Зусім іншае становішча складаецца на арганізаваных грамадскіх паляваннях на лася, дзіка і асабліва на ваўка. Найбольш спрэчак у такіх выпадках вынікае пры вырашэнні пытання: каму належыць звер, хто яго ўпаляваў? Наконт гэтага існуе такое правіла: не страляць па лініі стралкоў, не страляць па зверу, што ідзе на чужы нумар, па нябачнай або неразборлівай цэлі ці шолаху, не страляць адначасова з абодвух ствалоў, не страляць седзячы, лежачы, з калена і г. д. Часцей за ўсё парушаецца правіла, якое забараняе стральбу па зверу, што ідзе на чужы нумар.

Вялікае значэнне ва ўзаемаадносінах паміж паляўнічымі альбо рыбаловамі мае пачуццё такту, якое залежыць ад сціпласці чалавека. Тактоўны чалавек не падкрэслівае сваёй перавагі, свайго службовага становішча, не навязвае свайго погляду і волі, а пераконвае.

У інструкцыйных матэрыялах Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў ёсць невялікі раздзел — этыка паляўнічага і рыбалова, дзе сказана: кожны паляўнічы і рыбалоў павінен выконваць паляўнічую і рыбалоўную этыку, заснаваную на ўзаемнай павазе і ўзаемадапамозе. У паляванні і рыбалоўстве галоўнае не колькасць трафеяў, а тое, наколькі этычна, з захаваннем асноў заканадаўства па ахове прыроды яны здабыты.

У час палявання паляўнічы і рыбалоў павінны выконваць наступнае:

а) не парушаць правіл палявання і рыбнай лоўлі і затрымліваць кожнага, хто гэта робіць;

б) не парушаць тэрмінаў палявання і норм адстрэлу дзічыны і лоўлі рыбы, не імкнуцца да найбольшай здабычы, таму што паляванне і рыбалоўства не промысел, а задавальненне і актыўны адпачынак;

в) не перашкаджаць іншым здабываць свой трафей. Падстрэліў падранка суседа — аддай яму. Калі дапамаглі табе здабыць падранка — аддай патрон. Не страляй звера на гоне чужога сабакі, а калі забіў — аддай трафей гаспадару сабакі;

г) не перашкаджай лавіць рыбу іншым. Едучы па вадаёме на маторнай лодцы, не збівай хваляй рыбака;

д) паляўнічы не павінен накіроўваць стрэльбу на людзей ці ў напрамку нейкага гуку; адпраўляцца на лодцы ў штармавое надвор'е і выходзіць на тонкі лёд зімою.

І паляўнічым, і рыбаловам, якія збіраюцца на паляванне ці рыбную лоўлю, патрэбна апранацца зручна і ахайна. Вопратка павінна адпавядаць любым умовам (пераходам, начлегу, дажджліваму, халоднаму, сухому і гарачаму надвор'ю), быць свабоднай і адносна лёгкай.

Калі нехта трапіць у бяду, паляўнічы павінен дапамагчы сам і паклікаць на дапамогу іншых.

Традыцыі бацькоў і дзядоў гавораць:

Не здабывай больш, чым можаш выкарыстаць.

Ты не воўк, каб рэзаць статак да апошняй авечкі.

Ты — чалавек, значыць, найпершы гаспадар і абаронца лясоў, палёў, рэк і азёр.

Такія элементарныя патрабаванні паляўнічага этыкету, якія неабходна ведаць і выконваць паляўнічым і рыбаловам.

Прыемна, што большасць беларускіх паляўнічых і аматараў-рыбаловаў з гонарам выконваюць правілы паляўнічага этыкету. Аднак нямала ёсць у нас яшчэ членаў таварыства, якія іранічна адносяцца як да правіл паводзін паляўнічага і рыбалова, так і да тых, хто гэтыя правілы выконвае.

Усё сказанае — гэта толькі асобныя разрозненыя думкі. Пра гонар і мараль паляўнічага і рыбалова можна было б сказаць яшчэ шмат і прывесці нямала красамоўных прыкладаў. Але і з таго, што сказана, можна зрабіць наступны вывад: для таго, каб паляванне і аматарскае рыбалоўства былі наладжаны лепей, а тая карысць і задавальненне, якія яны нам даюць, былі яшчэ большыя, патрэбна болей займацца выхаваннем асабістых якасцей — выхаваннем паляўнічага сумлення і пачуцця гонару, паляўнічай этыкі. Я думаю, што настаў час стварыць у Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў, згадаўшы нашы ўласныя і вывучыўшы паляўнічыя звычаі іншых таварыстваў, свой кодэкс звычаяў і правіл палявання, у якім падрабязна распрацаваць як агульныя палажэнні, так і правілы на розныя прыватныя выпадкі.

Д. ГУБЕНКА,
адказны сакратар прэзідыума Рэспубліканскага савета БТПР.

# З ЛЕСАМ ЗАРУЧОНЫ

Далёка не кожнаму лес раскрывае свае таямніцы.

Віктар Фаміч Шэршань, стары лесавод, казаў мне, што трэба любіць сосны і бярозы, дубы і асіны, любіць кожны куст, кожную травінку ў лесе, каб выклікаць іхні давер да сябе. Толькі чалавек, які не зрабіў лесу шкоды, не пакрыўдзіў ніводнага з лясных жыхароў, а пасадзіў і вырасціў ялінку ці сасонку, дуб ці клён, ліпу ці таполю, дапамог звярам і птушкам у цяжкую хвіліну,— толькі такі чалавек можа разлічваць на тое, што лес адкрые яму нешта цікавае. Калі ж чалавек вырасціў не адно-два дрэўцы, а цэлы бор ці дуброву, дык можа спасцігнуць любыя лясныя таямніцы. За такога чалавека лес сцяной стане...

Я слухаў Віктара Фаміча, глядзеў, як ён, схіліўшыся над сталом, пісаў у газету гнеўны артыкул пра браканьераў, заклікаючы людзей любіць і бараніць родную прыроду, і думаў пра яго самога. Пра яго незвычайны лёс, пра ягоную чалавечую і грамадзянскую мужнасць, пра яго добрую — на усё — заручонасць з лесам...

Ён вырас у сям'і чыгуначніка — пуцявога рамонтніка. Бацька чакаў, што сын пойдзе ягоным шляхам, але памыліўся. Віктар не пакваліўся на большыя заробкі, не пайшоў на чыгунку, а падаўся ў лес. Бацька крыўдаваў, ды сын стаяў на сваім.

То быў час, калі ўсцяж новай дарогі Масква — Мінск збіраліся садзіць сосны. Віктар паспеў якраз на першыя пасадкі — на ўчастку ад Крупак да Бабра. Неўзабаве яго накіравалі на курсы ляснікоў у Полацк. Там, у лясным тэхнікуме, заўважылі, што ў сыне чыгуначніка жыве душа заўзятага лесавода, і пакінулі яго вучыцца ў тэхнікуме. У 1939 годзе малады лесавод Віктар Шэршань вярнуўся ў родныя Крупкі.

Працаваў ён у ляснічстве. Галоўны яго занятак быў — садзіць лясы. За гэтым мірным заняткам яго і заспела вайна. Віктар Фаміч даў сабе клятву: лепш памерці з голаду, а працаваць на фашыстаў не пойдзе. Але інакш разважалі падпольшчыкі і партызаны. Яны сказалі Шэршаню, што трэба ўмець не толькі садзіць лясы, але — цяпер гэта галоўнае — захаваць іх ад згубы, не дапусціць вывазу ў Нямеччыну. Былі і іншыя меркаванні накont таго, каб мець свайго чалавека ў акупацыйнай лясной установе. Так Віктар Фаміч стаў работнікам гітлераўскага лясніцтва.

Ляснічага фашысты прывезлі аднекуль здалёк — нейкага Губліса. Гэта быў іх чалавек, гітлераўцы яму давяралі. Хутка партызаны даведаліся (вядома ж, праз Шэршаня), што ў сейфе Губліса ляжыць ладны стос аўсвайсаў. А партызанам і падпольшчыкам дужа патрэбны былі гэтыя самыя аўсвайсы: без іх у той час нельга было ступіць і кроку. Шэршань атрымаў заданне: любымі сродкамі здабыць і перадаць сувязным нямецкія прапускі.

Віктар Фаміч выканаў заданне: партызанскі сувязны панёс ад яго некалькі дзесяткаў аўсвайсаў. Усё, здавалася, абышлося. Губліс не заўважыў прапажы. Гэта надало Віктару Фамічу смеласці. Ён папярэдзіў партызан, што неўзабаве здабудзе новую партыю дакументаў.

Аднойчы Губліса па нейкай тэрміновай справе выклікалі да начальніка палявой СД. Ён так спяшаўся, што забыўся замкнуць сейф. Віктар Фаміч скарыстаў выпадак: узяў у сейфе стосік чыстых бланкаў. Вярнуўся Губліс, здзівіўся, як гэта ён не замкнуў сейфа, усё пільна агледзеў, сказаў спакойна, што прыемна, маўляў, працаваць з сумленнымі людзьмі. Віктар Фаміч з палёгкай уздыхнуў: цяпер толькі дачакацца сувязнога з лесу і перадаць яму аўсвайсы.

І не ведаў Шэршань, што Губліс знарок пакінуў незамкнёным сейф, што ўсё ў ім было старанна пералічана, што то была загадзя падрыхтаваная пастка.

Віктара Фаміча схапілі на парозе роднай хаты. Тут жа абшукалі і выцягнулі з-за пазухі чатыры дзесяткі аўсвайсаў.

На першым жа допыце ў яго патрабавалі прызнання, што ён камуніст, вымагалі, каб сам аддаў партыйны білет. Білі няшчадна, адлівалі і зноў білі: «Дзе схаваў партыйны білет?» Віктар Фаміч зацята маўчаў. Не, ён не быў камуністам, але хіба што-небудзь дакажаш гэтым вылюдкам?

У Крупках за гады Савецкай улады ніколі не было турмы. Фашысты стварылі адразу аж чатыры. І ўсе чатыры былі перапоўнены. Вязні не мелі магчымасці не толькі легчы, але нават сесці — стаялі ўдзень і ўночы. Слабейшыя паміралі ад голаду і катаванняў.

Аднойчы з тае камеры, дзе гітлераўцы трымалі Шэршаня, восем чалавек кудысьці павялі — сказалі, што на работу нібыта. Вярнуліся вязні на змярканні і паведамілі, што ў лесе, адразу за бальніцай, непадалёк ад шашы яны капалі магілу на чалавек дваццаць — сорак.

Неўзабаве людзей пачалі выклікаць у дзяжурку. Выклікалі і Віктара Фаміча, і яго суседа па камеры Багамолава, якога схапілі таксама за сувязь з партызанамі. Калі людзей набілася поўная дзяжурка, іх вывелі на двор і пачалі грузіць у аўтамашыну: кідалі ў кузаў, нібы гэта былі не людзі, а дровы.

Загуў матор, і машына рушыла з турэмнага двара. Віктар Фаміч ведаў у Крупках кожную яміну, кожны пагорак, кожны паваротак вуліц. Зараз, лежачы ў кузаве, ён стараўся ўгадаць, куды іх вязуць. Вось машына выехала на шашу Масква — Мінск, вось павярнула направа, і яшчэ раз направа, цяжка ссунулася з асфальта і спынілася. Шэршань добра ведаў гэтую мясціну: тут ён рабіў свае першыя пасадкі. Сасонкі ўжо добра выцягнуліся...

Фашысты выцягвалі з машыны вязняў, прымушалі тут жа распранацца, потым прыкладамі падштурхоўвалі да ямы. Віктар Фаміч чамусьці намагаўся ўспомніць, які сёння дзень, ды ніяк не мог прыгадаць, як ні напружваў памяць. Урэшце ўсё ж прыгадаў і ледзь не крыкнуў ад радасці: «Сёння, таварышы, субота, 19 лістапада 1943 года!..»

З кузава выцягнулі Багамолава, а праз хвіліну двое гітлераўцаў тузанулі за ногі і яго, Шэршаня. Апынуўшыся на зямлі, Віктар Фаміч угледзеў зорнае неба. Бралася на мароз...

— Раздевайсь! — па-руску загадаў эсэсавец.

Шэршань механічна, нібы заведзены, зняў паліто, потым шапку, чаравікі. Але холаду не адчуваў. Наадварот, было горача, аж да млоснасці. Гэтак жа механічна сцягнуў з сябе кашулю, спусціў штаны. Фашыст загадаў скінуць і бялізну. Віктар Фаміч нагнуўся, каб развязаць матузкі на споднiках, і тут убачыў, як цягнулі да ямы паўжывога Багамолава. І нібы нейкае здранцвенне сышло з Шэршаня, быццам толькі зараз зразумеў, што і яго чакае тое ж самае. «Жыць! Жыць!» — застукала ў скронях. Там, у камеры, іншы раз здавалася, што лепей было б памерці, чым цярпець гэтыя бясконцыя здзекі і пакуты. Цяпер жа тое адышло на другі план.

— Ну ты, быстрей! — раўнуў фашыст.

Гэта нібы падштурхнула Віктара Фаміча. Рукі яго адарваліся ад матузкоў, хапілі прыгаршчы пяску і з усяе сілы сыпанулі той пясок у вочы фашысту. Сам ён, нібы падкінуты спружынай, скочыў у бок і сiгануў у сасоннік. Стрэлаў Віктар Фаміч не чуў: па вушах, па вачах, па твары балюча сцябалі галінкі. Зразумеў, што па ім страляюць, толькі тады, калі нешта гарачае апякло нагу. Але не спыніўся, яшчэ хутчэй пабег-пагробся ўглыб сасонніку, далей ад дарогі.

Калі зразумеў, што ўцёк, што фашысцкія кулі яго ўжо не даганяць, падумаў пра тое, каб хацяя не пусцілі следам сабак. А раптам пусцяць? Значыць, трэба хутчэй дабегчы да балота, там лягчэй будзе ўратавацца....

Акрываўлены, абдзёрты, ледзь жывы дабрыў ён да лясной вёсачкі Захараўка. Тут, у знаёмага лесніка Мацвея Іванавіча Дамаронка, Віктар Фаміч знайшоў прытулак. Потым апынуўся ў партызанскім шпіталі брыгады імя Кірава. Тут ягоныя раны далечвалі мяккай сасновай ігліцай, робячы з яе цёплыя ванны.

І ён выжыў і гнаў фашыстаў, у складзе мінамётнага ўзвода, на захад, вызваляючы ад нечысці родную зямлю.

А пасля вайны вярнуўся да свайго любімага занятку, з якім доля заручыла яго назаўсёды,— садзіць і гадаваць лясы...

Кожны, хто праязджае па шашы Масква — Брэст, можа бачыць плён працы Віктара Фаміча. Тут, на ўчастку паміж Крупкамі і Бабром, кожная сасна ведае Шэршаня. Яны, выносістыя прыгажуні, падыходзяць да самай дарогі. Лістападаўскай ноччу сорак трэцяга яны выратавалі чалавека, які даў ім жыццё.

Уладзімір МЯЖЭВІЧ.

## СТРАУСЫ ТАКСАМА СТРОЯЦЦА

Вартаўнікамі Нацыянальнага парку ў Кеніі працуюць людзі, якія горача любяць жывёл. Акрамя ўсіх іншых абавязкаў, кожны вартаўнік абавязкова клапоціцца і аб адным страусе: корміць яго, ахоўвае і ўвогуле ўсяляк яму дапамагае ў жыцці. Гэта ўжо стала своеасаблівай звычкай. І страусы настолькі прывыклі да гэтых людзей, што як толькі птушкі ўгледзяць свайго гаспадара і дабрадзея, адразу ж кідаюцца да яго. Страусы звычайна збіраюцца ля будынка дырэкцыі, куды вартаўнікі прыходзяць на ранішняе пастраенне. І калі прагучыць каманда: «У дзве шарэнгі — станавіся!», страусы таксама становяцца ў строй — у другую шарэнгу, кожны за сваім сябрам-чалавекам.

## КОЛЬКІ Ў ЕЎРОПЕ ВАЎКОЎ!

Ваўкі ў Еўропе захаваліся зусім у малой колькасці, пераважна ў Іспаніі, Італіі, Скандынаўскіх краінах і на Балканскім паўвостраве. У астатніх жа краінах іх вельмі мала. Мяркуецца, напрыклад, што ў Нарвегіі і Швецыі іх усяго каля шасці штук.

## СЛОН І ЛЕС

Буйны слон важыць прыкладна пяць тон. За суткі ён з'ядае 300 кілаграмаў корму. У параўнанні з іншымі жывёлами слон спажывае адносна мала корму на адзінку вагі — усяго каля 6 працэнтаў. Тым не менш павелічэнне колькасці сланоў ва Усходняй Афрыцы прыводзіць да вынішчэння лясоў.

## АРАНГУТАНГІ-БЛІЗНЯТЫ

Сапраўднай сенсацыяй сярод аматараў прыроды стала нараджэнне арангутангаў-блізнят у заапарку Манака. Да гэтага быў вядомы такі выпадак у адным заапарку ЗША, але тады блізняты загінулі неўзабаве пасля нараджэння. У Манака яны выжылі, хоць маці іх і не глядзела: адразу ж пасля нараджэння яны былі дастаўлены ў гарадскую дзіцячую бальніцу, дзе за імі быў наладжаны такі ж догляд, як і за немаўлятамі.

## ХТО ХОЧА ЗЛАВІЦЬ КРАКАДЗІЛА!

Урэшце і Безілу Строўнтомбу, рыбаку-спартсмену з англійскага горада Саўгемптана, усміхнулася рыбацкае шчасце. Пасля дзвюх гадзін марнага бадзяння ўздоўж берагу ракі Ітчан на яго прынаду трапіла здабыча. Яна аказалася незвычайная: малады паўметровы кракадзіл! Безіл пайшоў у паліцыю. Высветлілася, што з тэрарыума Саўгемптанскага універсітэта ўцякло пяць кракадзілаў. Тут жа, у паліцыі, сядзеў і засмучаны дырэктар тэрарыума. Вырашылі даць у газетах аб'яву наступнага зместу: «Асоб, якія жадаюць злавіць кракадзіла, просім пайсці на раку Ітчан». Разлік аказаўся правільным: падагрэтыя рыбацкімі страсцямі, сотні людзей кінуліся на берагі Ітчана. К вечару наступнага дня ўсе пяцёра ўцекачоў былі вернуты ў тэрарыум.

## КУРАПАТКІ-ВАДАНОСЫ

Самцы пясчанай курапаткі поясь сваіх птушанят вельмі арыгінальным спосабам. Птушкі акунаюцца ў ваду так, што пер'е на грудзях намакае. Пасля яны лятуць да птушанят, і тыя п'юць ваду, што сцякае з пер'я. Да нядаўняга часу гэта лічылі выдумкай настырных газетчыкаў. Аднак апошнія назіранні ў пустыні Калахары (Паўднёвая Афрыка) прымусілі скептыкаў змоўкнуць. Пясчаныя курапаткі сапраўды носяць сваім дзецям ваду такім дзіўным спосабам. Праўда, робяць яны гэта толькі ў выпадку крайняй неабходнасці.

## СЕРНА Ў РУМЫНІІ

Колькасць сернаў у Румыніі дасягнула 160 тысяч. Найбольшая шчыльнасць гэтых капытных даходзіць да 105 штук на 1000 гектараў. Штогадовы прырост сернаў у лепшых паляўнічых гаспадарках складае 140 працэнтаў.

## БЕЛЫ ВЯРБЛЮД

Нядаўна ў Будапешцкім заапарку вярблюдзіца прывяла белае вярблюдзяня. Белы двухгорбы вярблюд — надзвычайная рэдкасць.

## ЦІ ПАДОБНЫЯ ЖЫРАФЫ!

«Ва ўсёй Афрыцы нельга знайсці двух цалкам аднолькавых жырафаў»,— гаворыць заолагі запаведніка паблізу Найробі (Афрыка). Яны ўстанавілі, што малюнак на шыі жырафы такі ж непаўторны, як непаўторны малюнак адбіткаў чалавечых пальцаў.

## У ПАДАРУНАК — ІЛЬВА

«Леў — найлепшы падарунак пад Новы год!» Такая рэклама з'явілася не так даўно ў Францыі. Нейкі віконт дэ Лапануз у сваім маёнтку арганізаваў прыватны заапарк — з адных ільвоў. Яны свабодна хадзілі па парку, а наведвальнікі любаваліся «царамі звяроў» з аўтамабіляў. Спачатку ільвоў было нешта каля дваццаці пяці, ды хутка іх колькасць пераваліла за сотню. Львіцы прыводзілі па пяць, а адна нават шэсць ільвянят. Сто ільвоў — гэта ўжо занадта, пагадзіўся і віконт. Вось тады і з'явілася гэтакая гучная рэклама. Цікава тое, што першым на яе адгукнуўся прэс-аташэ аднаго заходнеафрыканскага пасольства. Дыпламат заявіў, што яго краіна закупіць дзесятак ільвоў — на развод, бо там яны цалкам вынішчаны.

## ШАЛЁНЫЯ ЛІСІЦЫ

У апошні час ветэрынарная служба Венгрыі вядзе ўпартую барацьбу з распаўсюджваннем шаленства сярод хатняй жывёлы. Крыніцай захворвання з'яўляюцца лісіцы. Падлічана, што каля 70 тысяч лісіц у краіне хворыя. У многіх раёнах праводзіцца масавая вакцынацыя ўсіх катоў і сабак. Паляўнічыя дружыны акружаюць логавішчы хворых звяроў і знішчаюць іх. І ўсё ж выпадкі захворвання хатняй жывёлы і нават людзей надараюцца. Шаленства сярод лісіц распаўсюджана і ў Паўднёвай Славакіі.

## КАРОВЫ-РЭКАРДСМЕНКІ

Лічыцца, што каровін век — гадоў 20—25, а час яе прадукцыйнага выкарыстання — прыкладна 12—15 ацёлаў. Аднак вядомы выпадкі, калі каровы жылі і цяліліся значна даўжэй.

Напрыклад, 32-гадовая карова ў Венгрыі прынесла 26 цялят, прычым толькі цялушачак. Карова Эгіда ў Польшчы за сваё жыццё дала 77 154 кілаграмы малака і толькі на 12-м годзе жыцця паказала вышэйшую прадукцыйнасць — 8900 кілаграмаў малака тлустасцю 3,01 працэнта.

Самай старой каровай у свеце лічаць 40-гадовую. Яна прынесла 30 цялят і давала малако да 37-га года жыцця. У СССР вядома карова Зазуля сіментальскай пароды. Пасля чацвёртага ацёлу яна дала за лактацыю 12 761 кілаграм малака (586 кілаграмаў малочнага тлушчу). У племянным заводзе «Цярэзіна» карова Тэорыя за 16 гадоў і 9 месяцаў прынесла 7 цялушачак і 5 бычкоў. Дзве трэці свайго жыцця яна даілася.

Вучоныя мяркуюць, што каровы ў большасці сваёй атрымліваюць у спадчыну даўгалецце ад сваіх бацькоў і што яго можна замацаваць у спадчыннасці. Вывучэннем даўгалетніх жывёлін займаюцца многія вучоныя свету. Гэта якасць жывёлы — адна з самых важных гаспадарчых якасцей.

## ГРАД ПА ГУСІНАМУ ЯЙКУ

Мінулым летам у ваколіцах югаслаўскага горада Драгаш выпаў град велічынёй з гусінае яйка. Град знішчыў пасевы, пашкодзіў дахі дамоў. Градам было забіта 17 кароў і некалькі коз. Град — незвычайная з'ява ўвогуле для гэтых мясцін, а такога не прыгадваюць нават самыя старыя жыхары краю.



Адзін рыбак-аматар натрапіў на вялізнае незнаёмае возера. Падхапіў вуды і да берага. Насустрач школьнік.

— Скажы, хлопчык, тут вудзіць можна?

— Можна, дзядзька,— адказаў падлетак.

— Дык не будзе злачынства, калі я злаўлю хоць адну рыбку?

— Не, гэта будзе дзіва.

●

Нідзе навукова не даказана, што страва з рыбы садзейнічае паляпшэнню разумовай дзейнасці. Але, слухаючы расказы рыбака, можна з упэўненасцю сказаць, што рыбная лоўля стымулюе развіццё фантазіі.

●

Рыба вельмі хутка расце.

Яна тройчы павялічваецца ў памеры з таго моманту, як яе злавілі, да моманту, калі шчаслівы рыбак апісвае яе свайму сябру.

●

Большасці людзям вялікія здзяйсненні ўдаваліся тады, калі яны знаходзіліся ў адзіноце.

Адзін з прыкладаў: рыбакі.

●

Рыбак выхваляецца:

— Што вы тут расказваеца пра буйныя ўловы, хлопцы! Вось я мінулай восенню падчапіў такога шчупака, што толькі яго фатаграфія важыла чатыры кілаграмы.

●

Інспектар падыходзіць да рыбака:

— Чаму вы ловіце рыбу ў забароненым месцы?

— Я не лаўлю, таварыш інспектар. Я купаю чарвяка.

— Дайце я гляну на яго! Ага! Усё роўна плаціце штраф.

— За што?

— За тое, што чарвяк без купальніка.



ЗАЯЦ:

— Больш не будзе паляваць на нас з фарамі...

# РЫБАЛОЎСТВА Ў БССР

## Старонкі гісторыі

У 1921 годзе СНК Беларусі перадаў вадаёмы рэспублікі ў распараджэнне Народнага камісарыята земляробства. У адпаведнасці з гэтым пры Наркамземе быў створаны аддзел рыбаводства і рыбалоўства. Упершыню на беларускіх вадаёмах уводзіліся правілы лоўлі рыбы. З гэтага часу, па сутнасці, і пачалася арганізацыя рыбнай прамысловасці ў рэспубліцы.

На пачатку, а гэта быў перыяд НЭПа, у рыбную гаспадарку Беларусі быў дапушчаны прыватны капітал. Таму рыбакам—як адзіночкам, так і рыбацкім арцелям—даводзілася наймацца да прадпрыемцаў, што арандавалі дзяржаўныя вадаёмы, або ісці да гандляроў рыбай, якія забяспечвалі рыбакоў сецематэрыяламі, прадуктамі харчавання, прамысловымі таварамі.

У канцы 20-х гадоў прыватны капітал у рыбнай прамысловасці быў ліквідаваны. На змену традыцыйным рыбацкім арцелям прыйшлі новыя вытворчыя калектывы: рыбалоўная арцель сацыялістычнага тыпу і рыбалавецкая калгасная брыгада. У 1931 годзе на вадаёмах Беларусі працавала 137 такіх калектываў, якія аб'ядноўвалі 1987 чалавек.

У канцы 20-х—пачатку 30-х гадоў эксплуатацыя вадаёмаў была ўскладзена на Белрыбтрэст, Белрыбаксаюз і спажывецкую кааперацыю. У 1935 годзе абавязкі па рэгуляванню рыбалоўства і рыбаводства, планаванню і кантролю за рыбагаспадарчымі арганізацыямі былі перададзены Народнаму камісарыяту харчавання, а ў 1939 годзе было арганізавана Галоўнае ўпраўленне рыбнай прамысловасці рэспублікі.

Акрамя пошукаў найбольш рацыянальных форм кіраўніцтва рыбнай гаспадаркай, партыя і ўрад рэспублікі аказвалі вялікую ўвагу і паляпшэнню дабрабыту рыбакоў. Так, у 1933 годзе была павялічана плата за здадзеную дзяржаве рыбу. Адначасова з гэтым устанаўліваліся адлічэнні ў грамадскі фонд, сродкі з якога ішлі на культурнае абслугоўванне і на матэрыяльнае заахвочванне рыбакоў, брыгад і арцеляў.

У адказ на гэта беларускія рыбакі павышалі сваю працоўную і грамадскую актыўнасць. З году ў год рос агульны ўлоў азёрна-рачной рыбы ў рэспубліцы. У 1937 годзе ён дасягнуў 33,1 тысячы цэнтнераў, што ў 2,4 раза перавышала ўлоў 1927 года. Паміж участкамі, арцелямі і брыгадамі штогод разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва, адшукваліся новыя спосабы здабычы рыбы. Усё гэта прынесла пэўны плён. У 1940 годзе беларускія рыбакі вылавілі сорак адну тысячу цэнтнераў рыбы.

Вялікая Айчынная вайна нанесла рыбным запасам рэспублікі велізарныя страты. Аднак агульнымі намаганнямі рыбакоў і ўсяго народа да 1950 года рыбная прамысловасць Беларусі была поўнасцю адноўлена. У гэтым годзе ўлоў рыбы дасягнуў рэкорднай для пасляваеннага часу лічбы—36,1 тысячы цэнтнераў.

У пачатку 60-х гадоў рыбалавецкія калгасы былі ліквідаваны, здабыча рыбы была перададзена брыгадам рыбазаводаў і калгасаў. Так, у мінулым, 1971, годзе рыбу ў рэспубліцы лавілі 296 рыбакоў дзяржлову і 519 калгаснікаў.

У апошнія гады здабыча рыбы ў Беларусі стабілізавалася на ўзроўні 21,1—21,4 тысячы цэнтнераў. Гэта менш даваенных паказчыкаў. Прычын гэтага зніжэння некалькі: змяншэнне рыбных запасаў у выніку атручвання вод рэк і азёр прамысловымі адходамі, павелічэнне колькасці рыбаловаў-аматараў, недастатковае зарыбленне вадаёмаў і г. д. Ёсць і іншыя прычыны, якія, калі можна так сказаць, закладзены ў самой арганізацыі рыбнай прамысловасці рэспублікі. У даваенны час, напрыклад, рыбу лавілі на ўсіх больш-менш вялікіх вадаёмах і рэчках. Цяпер жа чамусьці шэраг вадаёмаў і рэк (Дняпро, Нёман, Бярэзіна, Заходняя Дзвіна) альбо эксплуатуюцца недастаткова альбо і зусім не эксплуатуюцца—аддадзены рыбаловам-аматарам і, што найгорш, браканьерам.

Хочацца сказаць і яшчэ аб адным, хоць, можа, гэта і выходзіць за межы чыста гістарычнай даведкі. Нейк сталася так, што зараз людзі не дужа ахвотна ідуць у рыбакі. Прычына гэтага, думаецца, у тым, што арганізацыя промыслу, побыт рыбаловаў не адпавядаюць сённяшняму дню. Праца рыбака ў многіх рыбалавецкіх калектывах дрэнна механізавана. З неахвотай выязджаюць рыбакі на далёкія вадаёмы, бо ім часта даводзіцца самім шукаць начлегу: рыбацкія домікі, больш-менш прыстасаваныя для адпачынку, можна пералічыць на пальцах. Не задавальняе рыбакоў і якасць спецвопраткі, а таксама культурнае абслугоўванне ў час рыбнага промыслу.

І. БРАІМ.

Ба 52/4



# ПАЎНОЧНЫЯ ГОСЦІ

На прозалаць лістапада выпаў першы снег. Нядоўга пакрываў ён зямлю, што не паспела яшчэ аддаць цалкам летняе цяпло, але ўсё ж пагасіў яркія фарбы асенняга лесу. Пажух дыван апалага лісця. Вецер і дождж сарвалі пашкуматаныя ўборы з бяроз і асін. Толькі волат-дуб не паддаўся непагадзі і па-ранейшаму ганарліва трымае на сваіх плячах вохрыста-мядзяную кальчугу восеньскага ліста. Неўпрыкмет зіма сваім халодным подыхам апранае дрэвы то ў празрыстую тканіну танюсенькіх ільдзінак, то ў пушыстае футра шэрані, то ў мяккі і бялюткі снежны сарафан...

...Бадай, кожны жыхар горада звяртаў увагу на тое, што позняй восенню ў гарадскіх садах і парках з'яўляюцца чародкі амялушак. Часцей за ўсё іх можна ўбачыць на рабіне: аблепяць дрэва і дружна частуюцца падмарожанымі барвова-чырвонымі ягадамі. Не заўважыць амялушак проста немагчыма. Па-першае, чародкі іх даволі вялікія — да паўсотні і болей птушак. А па-другое, амялушкі вельмі даверлівыя і падпускаюць чалавека зусім блізка. Ну, а галоўнае — яны надзвычай прыгожыя, гэтыя паўночныя госці нашых лясоў і садоў.

Вось, пасля набегу на пахіленую ад цяжкіх чырвоных гронак рабіну, чародка амялушак адпачывае. Адпачывае тут жа, на дрэве, якое толькі што пачаставала іх смачным сняданкам. Птушкі старанна чысцяць пёркі — прыхарошваюцца. Я падыходжу зусім блізка. Увагу прыцягвае самая буйная і самая стракатая птушка сярод чародкі. Несумненна, гэта дарослы самец. Магчыма, важак. Прыгожая галоўка з какетлівым, крышачку набакір высокім і пышным чубікам. На агульным дымчата-бурым фоне апярэння вылучаецца залацістая канва пёрак хваста і махавых пер'яў крыла. На кончыках гэтых пёрак гараць яркай кінаварру вузенькія рагавыя пласцінкі.

Але нядоўга адпачываюць амялушкі. У іх цудоўны апетыт. Абчысціўшы аблюбаваную рабіну альбо куст каліны ці ядлоўцу, птушкі зноў шчыльнай чародкай абляцяюць узлескі, сады і паркі ў пошуках чарговай «сталоўкі». І так на працягу ўсяго дня.

Гасцююць у нас амялушкі ўсю зіму. У сакавіку ці ў красавіку, у залежнасці ад характару зімы, птушкі зноў вяртаюцца на поўнач, у мясціны, дзе яны робяць гнёзды і выводзяць птушанят...

На ўзлесках, у цёмных ельніках, у заснежаных барах зрэдзь часу можна сустрэць птушак, якія вельмі нагадваюць крыжадзюбаў. У іх такая ж магутная, тоўстая дзюба, толькі без крутой крывізны дзюбы-ножнаў крыжадзюба. Пяшчотна-пунсовай афарбоўкай самца і шаравата-вохрыстай афарбоўкай самачкі птушкі таксама нагадваюць крыжадзюбаў. Але гэта не крыжадзюбы. Гэта шчуры ці іначай пчалаедкі. Невялікімі чародкамі шчуры марудна-дзелавіта аглядаюць галінкі дрэў, здзюбваючы пупышкі бяроз, асін, ягады ядлоўцу, здабываючы з шышак насенне елкі і сасны. У пошуку корму пералятаюць з дрэва на дрэва з характэрным тонкім посвістам. Аднойчы ўбачыўшы шчуроў і пачуўшы іх характэрны посвіст, вы пры новай сустрэчы з гэтымі птушкамі ніколі не зблытаеце іх з іншымі.

Урэшце — колькі слоў пра снегіроў. Іх ведаюць, бадай, усе. Марозным сонечным днём снегіроў лёгка ўбачыць на кустах каліны — іх грудкі на фоне снегу гараць зыркім полымем. Натапыраныя на марозе, гэтыя жывыя агеньчыкі здаюцца незвычайна буйнымі, хоць на самой справе снегіры — птушачкі невялікія.

Без снегіра неяк цяжка ўявіць сабе нашу зіму. Ды, аказваецца, ён таксама наш паўночны госць — прылятае да нас толькі на час зімы. У Беларусі снягір гнездзіцца рэдка, і асноўная маса птушак, якія з'яўляюцца ў нас позняй восенню, прылятае з таежных лясоў. У вельмі суровыя зімы снегіроў мы сустракаем толькі восенню і ў пачатку зімы. Пазней яны адлятаюць далей на поўдзень, дзе крышачку цяплей. Зноў з'яўляюцца яны ў нас не толькі ў канцы зімы, па дарозе да месц гнездавання.

Але не толькі лес прымае на зіму паўночных гасцей. На адкрытых мясцінах, у полі трымаюцца пуначкі. Цяжкі зімовы час прымушае іх мяняць не толькі месца жыхарства (прылятаць да нас), але і цалкам мяняць свой кармавы рацыён. Невялікімі чародкамі яны лятаюць над полем, кормячыся насеннем палявых раслін, падбіраючы на ўзбочынах і ў каляінах дарог натрэсенае з саней зерне. Асноўны колер пяра ў пуначак — белы, як і ва ўсіх сапраўдных жыхароў поўначы. З кароткай дзюбкай, чорнымі пацеркамі вачэй і чорнымі боцікамі лапак, пуначкі вельмі прыгожыя. Пры першых прыкметах вясны яны пакідаюць нашы палі і спяшаюцца на радзіму, у халодныя абшары тундры...

Не, не замірае ўзімку жыццё нашага лесу. Ён з радасцю прымае прыгожых у сваёй сціплай красе паўночных гасцей.

Р. СУХАЎ.

Фота аўтара і А. САБАДАША.





Ба 5214

## КОНКУРС

## КОНКУРС

## КОНКУРС

**«Любіць прыроду — значыць любіць Радзіму» — такі дэвіз конкурсу, які аб'яўляюць на 1973 год Дзяржаўны камітэт СМ БССР па ахове прыроды, прэзідыумы рэспубліканскіх саветаў Беларускіх таварыстваў аховы прыроды, паляўнічых і рыбаловаў, рэспубліканскі савет па турызму і экскурсіях і рэдакцыя «Роднай прыроды».**

**На конкурс падаюцца артыкулы, нарысы, навелы, нататкі, фотаздымкі (каляровыя, слайды, чорна-белыя) аб ахове і рацыянальным выкарыстанні прыродных багаццяў Беларусі, аб людзях, якія берагуць і ахоўваюць прыроду.**

**Пераможцаў конкурсу чакаюць прэміі:**

**першая: за нарыс — 90 рублёў, артыкул — 60 рублёў, слайд або каляровы здымак — 90 рублёў, чорна-белы здымак — 60 рублёў;**

**другая: за нарыс — 60 рублёў, артыкул — 40 рублёў, слайд або каляровы здымак — 60 рублёў, чорна-белы здымак — 40 рублёў;**

**трэцяя: за нарыс — 30 рублёў, артыкул — 20 рублёў, слайд або каляровы здымак — 30 рублёў, чорна-белы здымак — 20 рублёў.**

**Вынікі конкурсу будуць падведзены да 20 снежня 1973 года. Матэрыялы і здымкі павінны быць дасланы да 1 снежня 1973 года.**

**Удзельнікамі конкурсу могуць быць рабочыя, калгаснікі, настаўнікі, інжынеры, вучоныя, журналісты і пісьменнікі — усе нашы чытачы.**

**Пісьмы ў рэдакцыю прысылаць з паметкай «На конкурс».**

**Наш адрас: г. Мінск, вул. Калектарная, 10. Рэдакцыя бюлетэня «Родная прырода».**

**«РОДНАЯ ПРИРОДА»**

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

СОДЕРЖАНИЕ


ЛЮБИТЕЛИ ПРИРОДЫ — СЛАВНОМУ ЮБИЛЕЮ. Заместитель председателя президиума Республиканского совета Белорусского общества охраны природы П. Вилиткевич рассказывает о делах и планах членов БООП, посвященных 50-летию образования СССР.

ОХРАНА ПРИРОДЫ. КАК ЕЕ ПОНИМАТЬ? «Чтобы ответить на поставленный вопрос,— пишет автор статьи, доктор биологических наук М. Долбик,— следует исходить не только с общечеловеческих позиций, но и с позиций мировоззрения, ибо глобальность проблемы еще не означает глобальных методов ее решения. Эти методы зависят от возможностей стран, их социально-экономического строя, развития науки, техники и культуры, а часто и от национальных традиций народов».

ВСЯ ЦВЕТЕНЬ МИРА. Со дня создания в республике Центрального ботанического сада АН БССР прошло сорок лет. За это время сад стал подлинным научным центром. О богатствах сада, его настоящем и будущем и повествуется в названной корреспонденции.

СУДЬБА КОЛХОЗНОГО ЛЕСА. На сегодняшний день в республике насчитывается свыше миллиона гектаров колхозного леса. К сожалению, эти массивы находятся далеко не в идеальном состоянии. Начальник отдела Министерства лесного хозяйства БССР А. Статкевич ставит вопрос об ускорении передачи колхозных лесов в руки более рачительного хозяина — государства.

ПОЯС ЗДОРОВЬЯ ВОКРУГ МИНСКА. Размеры пригородной зеленой зоны вокруг белорусской столицы были утверждены еще в 1945 году и с тех пор ни разу не пересматривались, хотя население города выросло в шесть раз. О необходимости быстрейшего исправления создавшегося положения говорят архитектор В. Шильниковская и инженер Г. Русецкая.

НЕСПОКОЙНЫЙ ЧЕЛОВЕК. Очерк журналиста М. Гиля о настоящем радетеле доброт земли родной Александре Ивановиче Самуйлике, заместителе председателя президиума Каменецкого районного совета охотников и рыболовов.

ЗЕЛЕНЫЕ ЖЕМЧУЖИНЫ УКРАИНЫ. ВОЛГЕ БЫТЬ ЧИСТОЙ! КУРШСКАЯ КОСА... Материалы, посвященные природе братских республик Советского Союза.

ЗДЕСЬ МЫ ЖИВЕМ. На Оршанском ордена Ленина льнокомбинате, предприятии с высокой культурой производства и славными трудовыми традициями, хорошо поставлена и природоохранная, оздоровительная работа. О том, как добились успехов оршанские природолюбы, и говорится в этой корреспонденции.

ТРИ МИЛЛИОНА ПУТЕШЕСТВЕННИКОВ. Так назвал свое выступление председатель Белорусского республиканского совета по туризму и экскурсиям П. Богданов.

ТАМ, ГДЕ ГЛУБЛЯ И ГЛУБЕЛЬКА... В Белоруссии не сосчитать озер, больших и маленьких. Решением правительства республики создан новый заказник — «Голубые озера». Что он собой представляет, каково его место в общем плане сохранения и умножения природных ресурсов республики? На эти и другие вопросы дается ответ в статье.

РЕЧНЫЕ БОБРЫ. Наблюдения биолога Э. Самусенко.

КОГДА МЕДВЕДЯМ СНЯТСЯ СНЫ. Зарисовка натуралиста.

В номере помещены репортажи, заметки, эссе под рубриками «Природа и искусство», «Школа и природа», «Наш календарь». Опубликована подборка материалов для охотников и рыболовов.

Специальная страничка «Роднай прыроды» посвящена 90-летию со дня рождения классика белорусской литературы, большого певца родной природы Якуба Коласа.

# ЗМЕСТ НУМАРА

# 6


АМАТАРЫ ПРЫРОДЫ — ДА СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ

АХОВА ПРЫРОДЫ. ЯК ЯЕ РАЗУМЕЦЬ?

УСЯ КВЕЦЕНЬ СВЕТУ . . 1
ЛЁС КАЛГАСНАГА ЛЕСУ . 2
ПОЯС ЗДАРОЎЯ ВАКОЛ МІНСКА . . . . . . 2
І СУПАКОІЦЦА МАР'ЯНКА . 3
ВОЛЗЕ БЫЦЬ ЧЫСТАЙ . . 4
ЗЯЛЁНЫЯ ЖАМЧУЖЫНЫ УКРАІНЫ . . . . . 4
ЗАКАЗНІК — «ГАЯНСКІ ЗАЛІЎ» . . . . . . 5
НА КУРШСКАЙ КАСЕ . . 5
НЕСПАКОЙНЫ ЧАЛАВЕК . 6
МОЙ РОДНЫ КУТ... . . . 8
ТАМ, ДЗЕ ГЛЫБЛЯ І ГЛЫБЕЛЬКА... . . . . . . 9
ЭНГУРСКІ ПТУШЫНЫ ЗАПАВЕДНІК . . . . . . 12
КІХНУ — ДАЛЁКІ І БЛІЗКІ . 12
КАМЕННІ, ГОРЫ, ВАДА . . 13
СЯБАР ЧАЛАВЕКА — ЭЎКАЛІПТ . . . . . . . 13
ТУТ МЫ ЖЫВЁМ . . . . 14
ТРЫ МІЛЬЁНЫ ПАДАРОЖНІКАЎ . . . . . . . 14
ПАД ПОЛАГАМ ЛЕСУ . . 18
ДЗІЧЫНЕ — НА ЗІМУ . . 19
КАЛІ МЯДЗВЕДЗЯМ СНЯЦЦА СНЫ... . . . . . 20
ПАМІР У КАРАЛЯХ ЛЕСУ . 22
ВАДА ІДЗЕ З ГОР . . . 22
У ЦЯСНІНЕ ЧАРЫНА . . 22
НАШ КАЛЯНДАР . . . . 24
ШКОЛА І ПРЫРОДА . . 25
РАЧНЫЯ БАБРЫ . . . . 26
ЭТЫКЕТ ПАЛЯЎНІЧАГА І РЫБАЛОВА . . . . . . 28
З ЛЕСАМ ЗАРУЧОНЫ . . 30
АБ УСІМ АДУСЮЛЬ . . . 31
РЫБАЛОЎСТВА Ў БССР . . 32


На першай старонцы вокладкі здымак Р. СУХАВА, на чацвёртай — М. ШАРАЯ.



Вавёрка — тыповы лясны звярок. Шырока распаўсюджаны ў Еўропе, Азіі, Паўночнай Амерыцы. Сустракаецца пяцьдзесят відаў вавёрак. У нашай краіне — два, а ў Беларусі — адзін. У 1951 годзе ў рэспубліцы (лясы Крычаўскага раёна) спрабавалі развесці вавёрку-тэлеутку, завезеную з Сібіры, але гэты эксперымент не даў «запланаваных» вынікаў. Пакаленні вавёрак-сібірачак асіміляваліся з вавёркай звычайнай і нічым цяпер ад яе не адрозніваюцца: ні футрам, ні афарбоўкай.

Вавёрка не вельмі пераборлівая да ежы. Улетку харчуецца ягадамі, грыбамі, арэхамі, раслінамі. Калі ж ляжа халодная зіма, удараць моцныя маразы, яна, акрамя назапашаных грыбоў, жалудоў, арэхаў, ужывае ў ежу насенне шышак, маладыя парасткі хвойных, пупышкі.

Гнёзды вавёркі робяць з тонкіх галінак, усярэдзіне высцілаюць імхом, травою, поўсцю. Гнёзды маюць шарападобную форму, размяшчаюцца на вышыні 8—10 метраў ад зямлі, часцей за ўсё на ялінах. Жывуць вавёркі таксама ў дуплах.

Прыводзяць вавёркі ад 3 да 8 дзіцянят, але часцей—4-6.

У Беларусі вавёрка з'яўляецца важным прамысловым звярком. Здабываецца кожны год некалькі дзесяткаў тысяч.

Сустрэча з вавёркаю ў лесе пакідае незабыўнае ўражанне: можна гадзінамі назіраць, як яна «ходзіць» па дрэвах, цокае, махае хвастом, каб напалохаць чалавека.

Там, дзе вавёрак не «крыўдзяць», яны так прывыкаюць да людзей, што бяруць ежу з рук.

# РОДНАЯ ПРЫРОДА

*


1972 г. № 6
выходзіць кожныя два месяцы

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР ПА АХОВЕ ПРЫРОДЫ, ПРЭЗІДЫУМАЎ РЭСПУБЛІКАНСКІХ САВЕТАЎ БЕЛАРУСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ АХОВЫ ПРЫРОДЫ, ПАЛЯЎНІЧЫХ І РЫБАЛОВАЎ, КАМІСІІ ПА АХОВЕ ПРЫРОДЫ АН БССР, БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА САВЕТА ПА ТУРЫЗМУ І ЭКСКУРСІЯХ

Выдавецтва «Полымя».



Рэдактар А. І. Варанцоў

Рэдакцыйная калегія:
П. Н. Багданаў, Л. І. Бердзічавец, У. А. Бразгоўка, Д. А. Бяспалы (адказны сакратар), П. А. Віліткевіч, І. Б. Кардаш, П. Р. Корзун, Г. І. Канцавая, П. А. Лугаўцоў, Л. І. Малевіч, М. Р. Мурашка, У. С. Раманаў, У. П. Самсонаў, Б. І. Сачанка, М. В. Смольскі, А. А. Сакалоўскі, В. Ф. Якушка

Мастацкі рэдактар Б. Е. Ярота
Карэктар Т. Ф. Бірыч.



Адрас рэдакцыі:
Мінск, вул. Калектарная, 10.
Тэл. 234967, 234961.



Здадзена ў набор 13/IX-72 г.
Падпісана да друку 23/X-72 г.
АТ 09326. Фармат $60 \times 90^1/_8$.
Друк. арк. 4. Улік.-выд. арк. 6,5.
Тыраж 44542 экз. Заказ 1175.
Цана 30 кап.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі

Адшумелі свой час неспакойныя восеньскія вятры. Нізкія, разарваныя ветрам мітуслівыя хмары выплакалі халодныя слёзы.

Кароткія, змрочныя дні наводзілі panicласць і смутак, прыгняталі добры настрой і адчуванне. Быў той час, калі людзі прасілі: «Прыходзіла б ужо зіма. Няхай бы падсушылі марозікі зямлю, каб яна не тапілася ў гразі і ў балоце».

І вось у адзін дзень бязладныя, неспакойныя хмары, нібы спалоханыя птушкі, падняліся вышэй, зрабіліся болей тугімі. Падзьмула з поўначы здаровым халадком. Зямля сушэла, пакрывалася цвёрдаю скарынкаю. А пад поўнач пасыпаў сняжок, заложны, спорны, густы і сухі. Снег ішоў усю ноч і ўвесь заўтрашні дзень. Пад вечар снег сунуўся. На захадзе бліснула журботная, ласкавая ўсмешка сонца і патухла. У небе засвяціліся першыя зоркі. Прыціснуў мароз... Кругом было так чыста, такая бель, што сляпіла і адбірала вочы. Лес пасвятлеў, пабялеў і пазбыўся свае хмурай панурасці пад белаю чысцюткаю посцілкаю.

Якуб КОЛАС, «НА РОСТАНЯХ».

Цана 30 кап.

Індэкс 74926.

